НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ



С. А. Кудраўцава

БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

8 клас

Дапаможнік для настаўнікаў

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ

с.82-91,96

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ. ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ

С. А. Кудраўцава

БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

8 клас

Дапаможнік для настаўнікаў
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай і рускай мовамі навучання

Рэкамендавана
Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Мінск
«АСАР»
2010

УДК 373.5.016:94(476)
ББК 74.266.3
К88

Серыя заснавана ў 2010 годзе

Кудраўцава, С. А.

К88 Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай : 8-ы кл. : дапам. для настаўнікаў агульнаадук. устаноў з белар. і рус. мовамі навучання / С. А. Кудраўцава. – Мінск : АСАР, 2010. – 100 с. – (Гісторыя Беларусі. Факультатыўныя заняткі).

ISBN 978-985-6711-78-0.

УДК 94(476)(075.3=161.3=161.1)
ББК 63.3(4Бел)я721

ISBN 978-985-6711-78-0

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2010
© Афармленне. ТАА «АСАР», 2010

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць правядзення факультатыву абумоўлена неабходнасцю вывучэння айчыннай гісторыі як аднаго з важнейшых фактараў грамадзянскага, патрыятычнага і гуманістычнага выхавання падрастаючага пакалення. Без глыбокіх і трывалых ведаў гісторыі сваёй краіны немагчыма паспяхова будаваць грамадскае жыццё ў сучаснасці і будучым.

Мэта факультатыўных заняткаў заключаецца ў авалоданні васьмікласнікамі ведамі аб мінулым Бацькаўшчыны ў перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай, далучэнні да нацыянальных і сусветных культурных традыцый і каштоўнасцей праз вывучэнне крыніц гістарычнай інфармацыі.

Задачамі факультатыву з'яўляюцца:

- сістэматызацыя і абагульненне ведаў аб гісторыі Беларусі другой паловы XVI–XVIII ст.;
- развіццё пазнавальных, творчых інтарэсаў і інтэлектуальных здольнасцей вучняў;
- фарміраванне ў вучняў навыкаў і ўменняў прэзентаваць даследаваны матэрыял са спасылкай на ўласны вопыт, навуковыя крыніцы і іншыя сродкі інфармацыі;
- выхаванне грамадзянскай пазіцыі і пачуцця патрыятызму.

Вызначаныя мэты і задачы рэалізуюцца ў розных метадах і прыёмах працы, накіраваных на развіццё творчай актыўнасці, пазнавальнага інтарэсу вучняў: рабоце з крыніцамі гістарычнай інфармацыі, пісьмовых і вусных творчых працах вучняў, гульні, абароне праектаў, прэзентацыі з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій, напісанні творчых работ (эсэ, рэфератаў) і інш.

Праграма факультатыўных заняткаў разлічана на 35 гадзін.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны (1 гадзіна). Характарыстыка крыніц гістарычнай адукацыі. Правілы работы з гістарычнымі дакументамі.

РАЗДЗЕЛ I. Беларусь у другой палове XVI – першай палове XVII ст. (12 гадзін)

Тэма 1. Унутраная і знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. (7 гадзін)

Утварэнне Рэчы Паспалітай. Прычыны і пачатак Лівонскай вайны. Перадумовы аб'яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай. Люблінскі сейм. Акт 1 ліпеня 1569 г. Умовы аб'яднання Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага. Далучэнне да Польшчы часткі зямель ВКЛ.

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады. Сейм Рэчы Паспалітай. Кароль Рэчы Паспалітай. «Залатыя вольнасці» шляхты. Судовая сістэма.

Палітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI – пачатку XVII ст. Рэакцыя ВКЛ на вынікі ўніі з Польшчай. III Статут ВКЛ 1588 г. і яго значэнне. Захаванне агульнадзяржаўных соймаў ВКЛ. Стварэнне Галоўнага Трыбунала ВКЛ.

Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у канцы XVI – першай палове XVII ст. (2 гадзіны). Завяршэнне Лівонскай вайны. Заключэнне і ўмовы Ям-Запольскага перамір'я (1582 г.).

Барацьба Рэчы Паспалітай са Швецыяй. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву. Дэўлінскае перамір'е (1618 г.). «Смаленская» вайна. Паляноўскі мір.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. (2 гадзіны). Уплыў гаспадарчых працэсаў у краінах Заходняй Еўропы на эканоміку ВКЛ. Аграрная рэформа 1557 г. Феадальныя павіннасці і дзяржаўныя падаткі сялян.

Рост і ўзбуйненне гарадоў. Гарадское рамяство. Цэхавая арганізацыя. Купецкія карпарацыі. Унутраны і знешні гандаль. Мястэчкі. Сацыяльныя супярэчнасці і канфлікты ў вёсцы і гарадах.

Тэма 2. Царква і рэлігія. Культура ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. (4 гадзіны)

Рэфармацыя ў Беларусі. Перадумовы рэфармацыйнага руху. Пашырэнне Рэфармацыі ў Беларусі. Асаблівасці і асноўныя этапы рэфармацыйнага руху на Беларусі. Кальвінізм. Арыянства. Дзеячы Рэфармацыі (М. Радзівіл Чорны, С. Будны, В. Цяпінскі). Вынікі і значэнне рэфармацыйнага руху.

Контррэфармацыя ў Беларусі. Асноўныя кірункі Контррэфармацыі. Пачатак і пашырэнне дзейнасці ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі (П. Скарга). Вынікі Контррэфармацыі ў Беларусі.

Берасцейская царкоўная ўнія. Перадумовы заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі. Падрыхтоўка Берасцейскай царкоўнай уніі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. і яго значэнне. Гвалтоўнае насаджэнне ўніяцкай царквы ў канцы XVI – пачатку XVII ст. Уніяцкія дзеячы (І. Кунцэвіч). Пашырэнне ўніяцтва сярод сельскага насельніцтва і гарадскіх нізоў.

Пашырэнне ўплыву Адраджэння на беларускія землі. Кнігадрукаванне. Літаратура рэлігійная і свецкая. Грамадска-палітычная і філасофская думка. Выяўленчае мастацтва. Дойлідства.

Практычная работа.

РАЗДЗЕЛ II. Беларусь у другой палове XVII – першай палове XVIII ст. (11 гадзін)

Тэма 3. Беларусь у час войнаў сярэдзіны XVII – першай палове XVIII ст. (3 гадзіны)

Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. Прычыны казацка-сялянскай вайны. Казацкія «загоны» ў Беларусі. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў супраць шляхецкага войска на поўдні Беларусі. Бітва пад Лоевам. Вынікі і наступствы казацка-сялянскай вайны.

Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай у 1654–1667 гг. Прычыны вайны і суадносіны сіл. Пачатак баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. Палітыка цара Аляксея Міхайлавіча. Адносіны насельніцтва да варагуючых бакоў. Кейданская ўнія 1655 г. Баявыя дзеянні ў першай палове 1660-ых гг. Віленскае перамір'е. Вызваленне тэрыторыі Беларусі. Андросаўскае перамір'е.

Беларусь у Паўночнай вайне. Перадумовы Паўночнай вайны і яе пачатак. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнага супрацьстаяння ў ВКЛ. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Бедствы насельніцтва Беларусі. Вынікі і наступствы вайны.

Тэма 4. Унутрыпалітычнае становішча Беларусі ў першай палове XVIII ст. (4 гадзіны)

Барацьба магнацкіх груповак. Аслабленне цэнтральнай улады і пашырэнне шляхецкай анархіі. Канфлікты паміж магнацкімі родамі. «Хатняя» вайна 1696–1700 гг. Сойм 1717 г. і яго значэнне. Нарастанне расійскага ўплыву ў Рэчы Паспалітай. Вайна за «Польскую спадчыну» (1733–1739).

Сацыяльна-эканамічнае становішча беларускай вёскі. Заняпад вёскі падчас войнаў другой паловы XVII – пачатку XVIII ст. Аднаўленне сялянскай гаспадаркі. Рост прыгонніцкай эксплуатацыі сялян. Сялянскія павіннасці і землеўладанне. Юрыдычнае становішча сялянства.

Сялянскія выступленні. Сялянскія хваляванні на беларускіх землях. Формы антыфеадальнай барацьбы. Паўстанне сялян у Крычаўскім старостве. Паўстанне на Каменшчыне.

Горад. Заняпад гарадоў у часы ваеннага ліхалецця. Аднаўленне гарадскога жыцця. Гарады ў першай палове XVIII ст. Гандаль у першай палове XVIII ст. Першыя кірмашы. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці.

Тэма 5. Культура беларускіх зямель у другой палове XVII – першай палове XVIII ст. (3 гадзіны)

Адукацыя і навука. Гістарычныя ўмовы развіцця культуры. Забарона на ўжыванне беларускай мовы ў справаводстве. Праваслаўныя брацтвы і іх дзейнасць. Сістэма адукацыі (каталіцкія, пратэстанцкія, праваслаўныя, уніяцкія школы). Навука.

Літаратура і грамадска-палітычная думка. Мясцовае летапісанне. Мемуарыстыка. Палітычная сатыра. Творчасць Сімяона Полацкага. Грамадска-палітычная думка.

Архітэктура і мастацтва. Барока ў архітэктуры Беларусі. Віленскае барока. Партрэтны жанр. Батлейка. Школьны тэатр. Царкоўная музыка. Арганная музыка. Капэлы.

Практычная работа.

РАЗДЗЕЛ III. Беларусь у другой палове XVIII ст. (11 гадзін)

Тэма 6. Знешняя і ўнутраная палітыка Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. (4 гадзіны)

Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Умяшальніцтва суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Дысідэнцкае пытанне. Барская канфедэрацыя. Першы падзел Рэчы Паспалітай.

Дзяржаўныя рэформы Рэчы Паспалітай. «Чатырохгадовы сейм» (1788–1792) і значэнне яго рашэнняў для Беларусі. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Таргавіцкая канфедэрацыя. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

Паўстанне 1794 г. і яго падзеі ў Беларусі. Канец Рэчы Паспалітай (2 гадзіны). Падрыхтоўка, пачатак і мэты паўстання. Ход паўстання. Асаблівасці паўстання ў Беларусі і Літве. Паражэнне паўстання. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.

Эканамічная стабілізацыя ў другой палове XVIII ст. Феадальная гаспадарка. Эканамічныя рэформы ў другой палове 60-ых гг. XVIII ст. Аграрная рэформа А. Тызенгаўза. Стан гарадоў. Магнацкае прадпрымальніцтва.

Тэма 7. Культура эпохі Асветніцтва (5 гадзін)

Адукацыя і навука ў эпоху Асветніцтва. Літаратура і друк (2 гадзіны). Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі. Школьная рэформа 1740—1760 гг. Стварэнне і дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Пачатковая адукацыя. Рэформа сярэдняй адукацыі на беларускіх землях. Арганізацыя першых прафесійных навучальных устаноў. Вышэйшая адукацыя і навука.

Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў другой палове XVIII ст. Друк.

Архітэктура і мастацтва. Палацава-замкавае будаўніцтва. Выяўленчае мастацтва. Віленская мастацкая школа. Музычнае мастацтва.

Магнаты і Асветніцтва. Магнацкія сядзібы як асяродкі культуры. Прыгонны тэатр. Прыгонныя капэлы і аркестры.

Народная культура. Асаблівасці развіцця народнай культуры. Побыт сялян і мяшчан. Светапогляд і абраднасць жыхароў вёскі і горада. Адносіны народа да рэлігіі і яе месца ў развіцці культуры. Фальклор. Музыка.

Практычная работа.

Заключэнне.

ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Пасля заканчэння курса факультатыўных заняткаў вучні:

- валодаюць ведамі аб асноўных падзеях, з'явах, працэсах грамадска-палітычнага развіцця ў другой палове XVI – XVIII ст.;
- маюць уяўленне аб дзеячах гісторыі і культуры, асобных здабытках духоўнай культуры беларускага народа.

Факультатыўныя заняткі спрыяюць фарміраванню ўменняў:

- параўноўваць гістарычныя з'явы, падзеі, вызначаць месцазнаходжанне гістарычных аб'ектаў на гістарычнай карце;
- аналізаваць грамадскія з'явы і працэсы, вызначаць прычынна-следчыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі;
- развіваць даследчыцкія здольнасці.

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

Уводзіны

Асноўнай задачай сучаснай школы з'яўляецца выхаванне думаючай, унутрана вольнай асобы, здольнай фарміраваць і аргументавана адстойваць уласную пазіцыю, ставіць перад сабой мэты і знаходзіць эфектыўныя шляхі іх дасягнення.

Падчас навучання ў школе вучні павінны навучыцца самастойна інтэрпрэтаваць факты. Неабходна, каб знаёмства з пэўнымі гістарычнымі з'явамі папярэднічала іх тлумачэнню. У гэтым сэнсе як нельга лепш падыходзіць работа са сведчаннямі даследуемай эпохі – з гістарычнымі крыніцамі. Дзейнасць вучняў у дадзеным выпадку становіцца падобнай да дзейнасці прафесійных гісторыкаў – скрупулёзны падбор фактаў і фарміраванне ўласнага пункта гледжання на іх аснове.

Ролю гістарычнага дакумента ў вывучэнні гісторыі можна вызначыць наступным чынам:

1) з яго дапамогай рэалізуецца прынцып нагляднасці. Знешні выгляд дакумента і яго мастацкае афармленне садзейнічаюць канкрэтызацыі гістарычнага матэрыялу, узнікненню яркіх вобразаў, дапамагаюць адчуць атмасферу эпохі, нарэшце, выклікаюць жывыя эмоцыі ў вучня ад судакранання з рэшткамі мінулага;

2) пры рабоце з дакументамі актывізуюцца працэсы мыслення і ўяўлення, што спрыяе лепшаму засваенню гістарычных ведаў. Вучні асвойваюць элементарныя прыёмы самастойнай крыніцазнаўчай працы: чытаць дакумент, аналізаваць яго, здабываць неабходную інфармацыю, разважаць, ацэньваць і, нарэшце, выяўляць уласнае меркаванне.

Шырокае выкарыстанне на факультатыўных занятках дакументальнай базы дазваляе рэалізаваць наступныя мэты:

1) выпрацаваць у вучняў уменне знаходзіць і апрацоўваць інфармацыю з розных крыніц;

2) сфарміраваць навыкі пісьмовага аналізу гістарычных дакументаў;

3) навучыць рабіць высновы на аснове прыведзенай у дакументах інфармацыі, вызначаць суб'ектывізм асобных відаў крыніц;

4) падвесці да фарміравання ўласнага меркавання.

Крыніцамі пры вывучэнні курса гісторыі, акрамя падручніка, могуць выступаць:

- урыўкі з твораў гісторыкаў, філосафаў, навукоўцаў мінулага;

• мемуары, дзённікі сучаснікаў, відавочнікаў гістарычных падзей;

• фрагменты з сучаснай навуковай, навукова-папулярнай, мастацкай літаратуры;

• фрагменты дакументаў (нарматыўных, праграмных, міжнародных, прававых і інш.);

• газетная інфармацыя і публіцыстычныя матэрыялы;

• даведачныя, статыстычныя матэрыялы.

Часцей за ўсё школьнікі працуюць з пісьмовымі гістарычнымі крыніцамі-дакументамі. Вельмі важна арганізаваць пазнавальную дзейнасць так, каб гістарычны дакумент выступаў у ролі сведкі эпохі, крыніцы новай інфармацыі, а не ў якасці простай ілюстрацыі да тэксту падручніка.

Мэтазгодна прапаноўваць школьнікам для аналізу розныя віды пісьмовых крыніц (афіцыйныя дакументы, успаміны, урыўкі з мастацкіх твораў і г. д.). Вучні выпрацоўваюць уменні вызначаць характар вывучаемага тэксту, вылучаць моцныя і слабыя бакі кожнай крыніцы. У гэтым узросце школьнікі вучацца выяўляць мэты і задачы, ідэалагічную накіраванасць дакумента, аперыраваць яго паняційным апаратам.

Адным з найважнейшых аспектаў падрыхтоўкі работы з тэкстам гістарычнага дакумента з'яўляецца выбар схемы аналізу. Можна прапанаваць наступную схему вывучэння дакумента:

1) Вызначыць аўтара, назву дакумента, дату стварэння, месца і час выдання.

2) Вызначыць від дакумента, адзначыць яго асаблівасці.

3) Ахарактарызаваць гістарычныя ўмовы яго стварэння.

4) Вызначыць мэты і задачы дакумента.

5) Вызначыць, каму адрасаваны дакумент.

6) Ахарактарызаваць факты, якія змяшчаюцца ў дакуменце.

7) Вылучыць паняцці, якія змяшчаюцца ў дакуменце.

8) Ахарактарызаваць праблемы, закранутыя ў дакуменце.

9) Ахарактарызаваць пазіцыю аўтара дакумента.

10) Правесці параўнанне з іншымі дакументамі.

11) Вызначыць гістарычную значнасць дакумента.

Разгледжаная вышэй схема аналізу не з'яўляецца нязменнай. У залежнасці ад вывучаемай тэмы, пастаўленай мэты пытанні могуць вар'іравацца настаўнікам, іх колькасць можа павялічвацца або, наадварот, скарачацца.

Выкарыстанне такіх схем дазваляе сфарміраваць у вучняў навыкі пісьмовага аналізу гістарычных дакументаў. Аднак пры вывучэнні дакумента вучні павінны не толькі правесці аналіз крыніцы, але і зрабіць на яго аснове высновы. Вельмі важна, каб апошнія змяшчалі не проста кароткі пералік

фактычнага матэрыялу тэксту, а ўласны пункт гледжання вучняў па праблеме. Досыць эфектыўным з'яўляецца ў гэтым выпадку выкарыстанне на ўроку прыёму «Падвойны дзённік». Ліст сшытка дзеліцца на дзве калонкі. У першую навучэнцы запісваюць аналіз прапанаванага тэксту, у другую – уласныя думкі, меркаванні адносна зместу гістарычнага дакумента. Мэтазгодна прапанаваць школьнікам пасля вывучэння крыніцы напісаць міні-эсэ, у якім выказаць сваё стаўленне да вывучаемай праблемы, вызначыць магчымыя шляхі развіцця падзей, адлюстраваных у тэксце дакумента.

Можна прапанаваць наступныя пытанні да дакумента ў залежнасці ад яго тыпу.

Дакументы дзяржаўнага характару: граматы, указы, загады, законы, прамовы дзяржаўных дзеячаў, пратаколы дзяржаўных мерапрыемстваў і г.д.

1. Калі, дзе, чаму з'явіўся гэты дакумент? (Апішыце гістарычныя ўмовы яго стварэння.)
2. Хто з'яўляецца аўтарам дакумента? Што вам вядома аб гэтым чалавеку, яго жыцці і дзейнасці?
3. Растлумачце асноўныя (ці новыя) паняцці, якія ўжываюцца ў тэксце дакумента.
4. Інтарэсы якіх слаёў, класаў, груп грамадства адлюстроўваюць артыкулы гэтага дакумента або ўвесь ён у цэлым?
5. Чым адрозніваецца гэты дакумент або яго асобныя артыкулы ад падобнага, які існаваў раней або аналагічнага ў іншых краінах?
6. Да якіх вынікаў, змен у дзяржаве і грамадстве прывяло або магло прывесці ўвядзенне гэтага дакумента?
7. Прыдумайце гісторыю, якая ілюструе дзеянне гэтага дакумента (судовая справа, выступ апазіцыі і г.д.).

Дакументы, звязаныя з палітычнай барацьбой: праграмы, заклікі, прамовы палітыкаў, пракламацыі, дэкларацыі і інш.

1. Хто аўтар дакумента? Якія яго палітычныя погляды?
2. Якія гістарычныя ўмовы стварэння дакумента? Дзе і калі ён з'явіўся?
3. Да чаго заклікае і што асуджае аўтар дакумента?
4. Інтарэсы якога пласта насельніцтва ён выказвае?
5. Як палітычныя заклікі аўтара суадносяцца з яго сацыяльным становішчам і сапраўднымі інтарэсамі?
6. Дайце гістарычную ацэнку дакументу.

Дакументы гістарычнага характару: хронікі, летапісы, гістарычныя сачыненні.

1. Якія гістарычныя факты апісваюцца ў дакуменце?

2. Пакажыце на карце месца, дзе адбываліся апісаныя ў дакуменце падзеі.

3. Вызначыце час, у які адбываліся згаданыя падзеі, калі ён не паказаны ў дакуменце або дадзены ў іншай (нехрысціянскай) сістэме летазлічэння.

4. Як аўтар тлумачыць прычыны, выкладае ход і ацэньвае значэнне гістарычных падзей?

5. Вызначыце стаўленне аўтара да выказваемых фактаў. Як яго пазіцыя звязана з характарам дакумента, акалічнасцямі яго стварэння?

6. У чым пазіцыя аўтара супадае (не супадае) з сучасным пунктам гледжання на мінулае? Чым гэтае супадзенне (несупадзенне) можна растлумачыць?

7. Ацаніце значнасць гэтага дакумента ў параўнанні з аналагічнымі гістарычнымі складаннямі гэтага перыяду або прысвечанымі гэтым жа гістарычным падзеям.

Дакументы прыватнага характару: мемуары, дзённікі, лісты, сведчанні відавочнікаў.

1. Назавіце аўтара дакумента. Якім было яго сацыяльнае становішча? Пасада? Заняткі? Якое дачыненне ён меў да апісаных падзей?

2. Аб чым апавядае аўтар дакумента? Як ён ставіцца да гэтых падзей? Пацвердзіце свае развагі вытрымкамі з тэксту.

3. Чым вы растлумачыце менавіта такое стаўленне аўтара?

4. У чым супадаюць або чым адрозніваюцца сведчанні дадзенага аўтара ад звестак іншых крыніц адносна згаданага гістарычнага факта?

5. Ці падзяляеце вы меркаванні, ацэнкі, высновы аўтара дакумента?

Дакументы літаратурнага жанру як гістарычныя помнікі сваёй эпохі: проза, паэзія, драма, эпас, міфы, песні, сатыра, крылатыя выразы і інш.

1. Пакажыце на карце месца, дзе разгортваюцца падзеі, апісаныя ў літаратурнай крыніцы.

2. Па характэрных дэталях побыту, адзежы, паводзін людзей і г.д. вызначыце прыкладны час дзеяння або напісання твора. Знайдзіце прыкметы, якія пацвярджаюць, што дадзены твор быў створаны ў пэўную эпоху.

3. Як аўтар тлумачыць учынкі сваіх герояў? Ці згодны вы з такімі ацэнкамі і аргументамі?

4. У якіх іншых літаратурных творах вы сустракалі падобны сюжэт? Чым можна растлумачыць яго распаўсюджанасць?

Значную ролю пры выкананні самастойнай працы адыгрываюць памяткі. Напрыклад:

1. Падрыхтуйцеся да выканання задання: падзяліце разгорнуты ліст сшытка на дзве няроўныя часткі для запісу плана (злева) і канспекта (справа).

2. Прачытайце ўвесь тэкст цалкам.

3. Вылучыце ў ім лагічна скончаныя часткі і ў кожнай з іх – галоўную думку, дайце ім загаловак. На аснове гэтага складзіце план.

4. Канспектыўна акрэсліце змест кожнай скончанай часткі: прывядзіце ўдакладняючыя палажэнні, якія раскрываюць галоўную думку, лічбы і высновы. Калі не можаце сцісла пераказаць тэкст крыніцы, то працытуйце яго, беручы ў двукоссі. Асноўныя палажэнні канспекта выпісвайце згодна з пунктамі плана.

5. Праверце выкананую працу. Калі трэба, выправіце альбо ўдакладніце загаловак плана і канспект.

Сярод мноства прыёмаў працы з гістарычнымі тэкстамі можна вылучыць наступныя:

- чытанне і аналіз;
- выпісванне азначэнняў паняццяў, асноўных праблем, вылучэнне галоўнай ідэі;
- каменціраванае чытанне;
- калектыўны разбор тэксту;
- фармуляванне пытанняў да тэксту;
- абагульненне фактычнага і тэарэтычнага матэрыялу ў мэтах канкрэтызацыі грамадскіх з'яў, якія вывучаюцца;
- выяўленне розных падыходаў да грамадска-гістарычнага развіцця;
- аналіз аргументацыі аўтараў;
- знаходжанне розных спосабаў рашэння праблем на аснове супастаўлення некалькіх крыніц;
- фармуляванне абагульненых высноў;
- выяўленне прычынна-следчых сувязей і пабудова лагічнага ланцужка меркаванняў;
- складанне тэкставых, параўнальна-абагульняючых і канкрэтызуючых табліц, лагічных і тэкставых схем, планаў (разгорнутага, структурна-лагічнага, тэматычнага), тэз, канспекта;
- падрыхтоўка паведамленняў, рэфератаў і г.д.

Выкарыстанне дакументаў робіць заняткі цікавымі, насычанымі, пазнавальнымі. Практыка паказвае, што самастойная праца навучэнцаў з крыніцамі будзе больш паспяховай, калі ў яе аснове ляжыць пэўная праграма дзеянняў вучня, пабудаваная ў адпаведнасці з вызначанай дыдактычнай

задачай і зместам гістарычнага матэрыялу, улікам падрыхтаванасці вучня да працы з тэкстамі.

Работа з дакументамі павінна спрыяць фарміраванню ў вучняў пэўных навыкаў. Так, вучні 8 класа пры рабоце з гістарычнымі дакументамі павінны ўмець:

- вызначыць тып дакумента;
- вызначыць час яго напісання або гістарычную эпоху;
- вызначыць аўтара (калі магчыма) або прыналежнасць меркаванага аўтара да сацыяльнай групы;
- размясціць некалькі дакументаў у храналагічным парадку;
- працаваць з дакументамі па асобных пытаннях настаўніка;
- ставіць пытанні да дакумента;
- пераказаць змест дакумента;
- скласці просты аповед аб падзеях (асобе) з выкарыстаннем гістарычнага дакумента;
- аналізаваць дакумент па прапанаваным плане;
- скласці разгорнуты аповед з выкарыстаннем некалькіх дакументаў;
- ставіць пытанні да дакументаў глыбейшага аналітычнага характару;
- аналізаваць дакумент па прапанаваным плане (больш складаным);
- аналізаваць дакумент у кантэксце гістарычнай сітуацыі;
- скарыстаць дакумент для доказу ўласнага меркавання;
- праводзіць пошук неабходнай інфармацыі ў адным або некалькіх гістарычных дакументах;
- будаваць уласныя меркаванні, абапіраючыся на матэрыял аднаго або некалькіх дакументаў.

Пры рабоце з дакументамі мэтазгодна выкарыстоўваць сістэму заданняў, арыентаваных на тры ўзроўні пазнавальнай дзейнасці. Выбар узроўняў вызначаецца пазнавальнымі магчымасцямі вучня і мэтамі навучання.

I узровень – рэпрадуктыўны. Заснаваны на выпісванні асноўных паняццяў, азначэнняў, высноў, адказах на пытанні, неабходных удакладненнях і пераказе тэксту; прадугледжвае запаўненне табліцы, схемы па ўзоры падчас калектыўнага разбору дакумента, арыентаванага на разуменне тэксту, складанне простага плана і г.д.

II узровень – пераўтваральны. Пытанні і заданні могуць уключаць: аповед вучня паводле дакумента, які суправаджаецца аналізам тэксту, вылучэннем у ім галоўнай ідэі, высновы, сінтэзам палажэнняў крыніцы з іншым тэарэтычным матэрыялам (самастойным адборам, групоўкай фактаў, ідэй і выкарыстаннем іх вучнем для раскрыцця вывучаемай тэмы);

складанне разгорнутага плана, тэз, канспекта, тэкставых табліц, схем; самастойную пастаноўку пытанняў да дакумента; падрыхтоўку рэфератаў, дакладаў і інш.

III узровень – творча-пошукавы. На дадзеным узроўні навучэнцам прапаноўваюцца пазнавальныя заданні, якія патрабуюць: асэнсавання і супастаўлення пунктаў гледжання мысліцеляў, палажэнняў некалькіх дакументаў; выяўлення ліній параўнання вывучаемых з'яў і складання параўнальных табліц, лагічных ланцужкоў; ужывання тэарэтычных палажэнняў дакумента для доказу, аргументавання свайго пункта гледжання, абмеркавання дыскусійных праблем; пасільнай пошукавай дзейнасці па зборы матэрыялу па вызначанай тэме, яго аналізу і сістэматызацыі, падрыхтоўкі творчых сачыненняў, эсэ і інш.

Вялікія магчымасці выкарыстання крыніц, дакументаў ёсць пры правядзенні ўрокаў – лекцый, семінараў, лабараторных і практычных заняткаў, арганізацыі вучэбна-пошукавай дзейнасці, пасільных навуковых даследаванняў.

Так, на **лабараторных і практычных занятках** настаўнік можа прапанаваць вучням наступныя варыянты работы з дакументамі:

1. Розным групам навучэнцаў прааналізаваць адзін і той жа дакумент з пункта гледжання прадстаўнікоў розных эпох, сацыяльных пластоў, народаў і г.д., што будзе спрыяць шырэйшай інтэрпрэтацыі дакумента.

2. Метад мазаікі: дакумент дзеліцца на дзве або больш часткі, а затым складаецца агульнае ўражанне.

3. Група атрымлівае пакет дакументаў розных відаў (мемуары, лісты і г.д). Неабходна зрабіць здагадку аб гістарычным становішчы, праблемах, сфармуляваць пытанні (мадэліраванне па прынцыпе рэканструкцыі).

4. Пры аналізе дакумента адна група навучэнцаў можа выступаць у ролі аналітыкаў, другая – у якасці апанентаў аўтараў, трэцяя – апалагетаў і г.д.

5. Самастойнае складанне навучэнцамі пытанняў да дакумента.

Мадэль «Абмен ведамі»

Дадзеная мадэль прадугледжвае самастойную даследчую дзейнасць вучняў з выкарыстаннем групавой формы вучэбнай працы. Вучні асвойваюць такія ўменні, як сістэматызацыя гістарычнай інфармацыі на аснове работы з крыніцамі, самастойная рэканструкцыя гістарычных падзей і аналіз гістарычных працэсаў і з'яў, публічная прэзентацыя вынікаў даследчага пошуку. Этапы працы:

1. *Інструктаж.* Выкладчык вылучае некалькі раўназначных праблем у рамках тэмы ўроку. Кожная група вучняў атрымлівае сваю праблему, свой «пакет» крыніц інфармацыі і заданне (алгарытм працы групы).

2. *Даследаванне.* Вучні кожнай групы вывучаюць сваё пытанне па крыніцах і рыхтуюцца да асвятлення праблемы для ўсёй аўдыторыі.

3. *Абмен ведамі.* Групы выступаюць па чарзе і знаёмяць усіх з вынікамі сваёй працы.

Асноўнай метадычнай цяжкасцю для настаўніка можа стаць арганізацыя ўзаемадзеяння груп на этапе абмену ведамі: як прыцягнуць увагу ўсіх да адказу кожнай групы? Для гэтага прапаноўваюцца розныя варыянты папярэдніх заданняў: запаўненне абагульняючай або параўнальнай табліцы; вядзенне запісаў; выкарыстанне «працоўнага ліста»; «распакаванне кластара»: праблемнае пытанне, адказаць на якое можна, толькі ўважліва выслухаўшы ўсе групы.

Мадэлі «Эксперты» і «Зігзаг»

Мадэлі «Эксперты» і «Зігзаг» заснаваныя на адзіным базавым прынцыпе: удзельнікі малой вучэбнай групы становяцца экспертамі ў пэўных пытаннях вызначанай тэмы. Унутры груп кожны ўдзельнік атрымлівае сваю гістарычную крыніцу, вывучае прапанаваны матэрыял, і пасля гэтай асабістай экспертызы ўдзельнікі па чарзе знаёмяць групу з вынікамі сваёй працы. У групе ўсе дадзеныя параўноўваюцца, абагульняюцца, фармулююцца высновы (або выконваецца іншае заданне выкладчыка). Мэта працоўнай групы ў тым, каб усе яе члены авалодалі тэмай у поўным аб'ёме.

Аднак не кожны вучань здольны самастойна разабрацца ў сваім пытанні або дакументе. У такім выпадку прадугледжваецца «зігзаг»: на першым этапе ўдзельнікі, якім «даручаны» аднолькавыя пытанні (або дакументы), выходзяць са сваіх груп і ўтвараюць новыя «экспертныя» групы. Такім чынам у экспертныя групы аб'ядноўваюцца «эксперты» з аднолькавым заданнем і матэрыялам. У гэтых «экспертных» групах адбываецца аналіз крыніцы. На гэтым этапе мэтазгодна прадугледзець пісьмовае заданне:

- каляровая разметка крыніцы (падкрэсліванне сэнсавых адзінак, напрыклад фактаў, меркаванняў, прычын, вынікаў і г.д.);
- фармуляванне высноў, якія можна зрабіць на аснове крыніцы;
- пераўтварэнне тэксту ў схему, табліцу, лагічны ланцужок;
- выпісванне на аснове запаўнення розных бланкаў, напрыклад:

Факты, якія змяшчае крыніца	Думка, якая ўтрымліваецца ў дакуменце
Карыснасць, каштоўнасць крыніцы	Абмежаванасць крыніцы

Удзельнікам экспертных груп важна сцісла запісаць тую інфармацыю, якую яны павінны будуць паведаміць сваім вучэбным групам. Затым «эксперты» вяртаюцца ў свае першапачатковыя вучэбныя групы, і пачынаецца ўзаемны абмен інфармацыяй, на аснове якога выконваецца агульнае заданне.

Выкарыстанне гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі дазваляе настаўніку развіваць самастойнасць вучняў – тыя самі вучацца атрымліваць неабходную інфармацыю і аналізаваць яе. Настаўнік з дапамогай паказаных методык дапамагае вучню разабрацца ў светапоглядных праблемах гістарычных падзей, не навязвае яму агульнапрынятыя гістарычныя стандарты, а дапамагае асэнсаваць вывучаемы матэрыял і прыйсці да высноў самастойна. Высновы, атрыманыя ў выніку працы з гістарычнай крыніцай, з'яўляюцца больш пераканаўчымі, садзейнічаюць канкрэтызацыі гістарычнага матэрыялу, стварэнню яркіх вобразаў і карцін мінулага, адчуванню духу эпохі, значнаму пашырэнню круга сацыяльнай інфармацыі, якую засвойвае вучань, і, што не менш важна, служаць асновай для развіцця пазнавальнай актыўнасці школьнікаў.

Навучанне рабоце з дакументамі ўключае ў сябе наступныя этапы:

1) настаўнік дае ўзор разбору дакумента;

2) вучні аналізуюць дакумент пад кіраўніцтвам настаўніка;

3) вучні працуюць пад кіраўніцтвам настаўніка і самастойна;

4) школьнікі вывучаюць дакумент самастойна.

Настаўнік знаёміць вучняў з дакументамі, тлумачыць сутнасць задання. Вучні рыхтуюць невялікія паведамленні, апісанні на аснове дакумента, тэксту, ілюстрацыі, творчыя сачыненні. Для самастойнай работы дакумент патрэбен кожнаму вучню.

Перш чым звярнуцца да дакумента, настаўнік павінен даць яго сцісłую характарыстыку, звярнуць увагу на тое, калі і кім ён быў складзены, з якой мэтай, а таксама пра што вучні з яго даведаюцца.

Умоўнае тэматычнае планаванне факультатыўных заняткаў «Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай»

№ занятку	Тэма, план	Міжпрадметныя і ўнутрыпрадметныя сувязі	Колькасць гадзін
	РАЗДЗЕЛ І. Беларусь у другой палове XVI – першай палове XVII ст.		12
Тэма 1. Унутраная і знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.			7
1	**Утварэнне Рэчы Паспалітай** Прычыны і пачатак Лівонскай вайны. Перадумовы аб'яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Люблінскі сейм. Акт 1 ліпеня 1569 г. Умовы аб'яднання Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага. Далучэнне да Польшчы часткі зямель ВКЛ	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэмы – «Лівонская вайна», «Утварэнне Рэчы Паспалітай»	1
2	**Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай** Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады. Сейм Рэчы Паспалітай. Кароль Рэчы Паспалітай. «Залатыя вольнасці» шляхты. Судовая сістэма	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай»	1

3	**Палітычнае становішча ВКЛ у апошняй трэці XVI – пачатку XVII ст.** Рэакцыя ВКЛ на вынікі ўніі з Польшчай. ІІІ Статут ВКЛ 1588 г. і яго значэнне. Захаванне агульнадзяржаўных соймаў ВКЛ. Стварэнне Галоўнага Трыбунала ВКЛ	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэмы – «Палітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI – XVII ст.», «Рэч Паспалітая: сацыяльныя адносіны»	1
4–5	**Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у канцы XVI – першай палове XVII ст.** Завяршэнне Лівонскай вайны. Заключэнне і ўмовы Ям-Запольскага перамір'я (1582 г.). Барацьба Рэчы Паспалітай са Швецыяй. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву. Дэўлінскае перамір'е (1618 г.). «Смаленская» вайна. Паляноўскі мір	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.»	2
6–7	**Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.** Уплыў гаспадарчых працэсаў у краінах Заходняй Еўропы на эканоміку ВКЛ. Аграрная рэформа 1557 г. Феадальныя павіннасці і дзяржаўныя падаткі сялян. Рост і ўзбуйненне	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэмы – «Сялянская гаспадарка», «Гарадское жыццё ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.»	2

	гарадоў. Гарадское рамяство. Цэхавыя арганізацыі. Купецкія карпарацыі. Унутраны і знешні гандаль. Мястэчкі. Сацыяльныя супярэчнасці і канфлікты ў вёсцы і гарадах		
Тэма 2. Царква і рэлігія. Культура ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.			4
8	**Рэфармацыя ў Беларусі** Перадумовы рэфармацыйнага руху. Пашырэнне Рэфармацыі ў Беларусі. Асаблівасці і асноўныя этапы рэфармацыйнага руху на Беларусі. Кальвінізм. Арыянства. Дзеячы Рэфармацыі (М. Радзівіл Чорны, С. Будны, В. Цяпінскі). Вынікі і значэнне рэфармацыйнага руху	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Рэфармацыя ў Беларусі». Сусветная гісторыя, 8 клас, тэма – «Рэфармацыя і рэлігійныя войны ў Еўропе»	1
9	**Контррэфармацыя ў Беларусі** Асноўныя кірункі Контррэфармацыі. Пачатак і пашырэнне дзейнасці ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі (П. Скарга). Вынікі Контррэфармацыі ў Беларусі	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Контррэфармацыя ў Беларусі». Сусветная гісторыя, 8 клас, тэма – «Рэфармацыя і рэлігійныя войны ў Еўропе»	1
10	**Берасцейская царкоўная ўнія** Перадумовы заключэння Берасцейскай	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Берасцейская царкоўная ўнія»	1

	царкоўнай уніі. Падрыхтоўка Берасцейскай царкоўнай уніі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. і яго значэнне. Гвалтоўнае насаджэнне ўніяцкай царквы ў канцы XVI – пачатку XVII ст. Уніяцкія дзеячы (І. Кунцэвіч). Пашырэнне ўніяцтва сярод сельскага насельніцтва і гарадскіх нізоў		
11	**Пашырэнне ўплыву Адраджэння на беларускія землі** Кнігадрукаванне. Літаратура рэлігійная і свецкая. Грамадска-палітычная і філасофская думка. Выяўленчае мастацтва. Дойлідства	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Пашырэнне ўплыву Адраджэння на беларускія землі». Сусветная гісторыя, 8 клас, тэма – «Культура эпохі Адраджэння». Руская літаратура, 8 клас, тэма – «Русскоязычная литература Беларуси (Симеон Полоцкий)». Беларуская літаратура, 9 клас, тэма – «Літаратура эпохі Адраджэння (Ф. Скарына, С. Будны, М. Гусоўскі)»	1

12	**Практычная работа**		1
	РАЗДЗЕЛ II. Беларусь у другой палове XVII – першай палове XVIII ст.		11
Тэма 3. Беларусь у час войнаў сярэдзіны XVII – першай палове XVIII ст.			3
13	**Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг.** Прычыны і характар вайны. Казацкія «загоны» ў Беларусі. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў супраць шляхецкага войска на поўдні Беларусі. Бітва пад Лоевам. Вынікі і наступствы казацка-сялянскай вайны	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. на беларускіх землях»	1
14	**Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай у 1654–1667 гг.** Прычыны вайны і суадносіны сіл. Пачатак баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. Палітыка цара Аляксея Міхайлавіча. Адносіны насельніцтва да варагуючых бакоў. Кейданская ўнія 1655 г. Баявыя дзеянні ў першай палове 1660-ых гг. Віленскае перамір'е. Вызваленне тэрыторыі Беларусі. Андросаўскае перамір'е	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай у 1654–1667 гг.». Сусветная гісторыя, 8 клас, тэмы – «Расія ў пачатку XVII ст.», «Пачатак праўлення Раманавых»	1

15	**Беларусь у Паўночнай вайне** Перадумовы вайны і яе пачатак. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнага супрацьстаяння ў ВКЛ. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Бедствы насельніцтва Беларусі. Вынікі і наступствы вайны	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Беларусь у Паўночнай вайне». Сусветная гісторыя, 8 клас, тэма – «Эпоха Пятра Вялікага»	1
Тэма 4. Унутрыпалітычнае становішча Беларусі ў першай палове XVIII ст.			4
16	**Барацьба магнацкіх груповак** Аслабленне цэнтральнай улады і пашырэнне шляхецкай анархіі. Канфлікты паміж магнацкімі родамі. «Хатняя» вайна 1696–1700 гг. Сойм 1717 г. і яго значэнне. Нарастанне расійскага ўплыву ў Рэчы Паспалітай. Вайна за «Польскую спадчыну» (1733–1739 гг.)	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Барацьба магнацкіх груповак»	1
17	**Сацыяльна-эканамічнае становішча беларускай вёскі** Заняпад вёскі падчас войнаў другой паловы XVII – пачатку XVIII ст. Аднаўленне сялянскай гаспадаркі. Рост прыгонніцкай эксплуатацыі сялян. Сялянскія павіннасці і землеўладанне.	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Беларуская вёска ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.»	1

	Юрыдычнае становішча сялянства		
18	**Сялянскія выступленні** Сялянскія хваляванні на беларускіх землях. Формы антыфеадальнай барацьбы. Паўстанне сялян у Крычаўскім старостве. Паўстанне на Каменшчыне	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Сялянскі рух»	1
19	**Горад** Заняпад гарадоў у часы ваеннага ліхалецця. Аднаўленне гарадскога жыцця. Гарады ў першай палове XVIII ст. Гандаль у першай палове XVIII ст. Першыя кірмашы. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Гарады Беларусі другой паловы XVII – першай паловы XVIII ст.»	1
Тэма 5. Культура беларускіх зямель у другой палове XVII – першай палове XVIII ст.			3
20	**Адукацыя і навука** Гістарычныя ўмовы развіцця культуры. Забарона на ўжыванне беларускай мовы ў справаводстве. Праваслаўныя брацтвы і іх дзейнасць. Сістэма адукацыі (каталіцкія, пратэстанцкія, праваслаўныя, уніяцкія школы). Навука	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Адукацыя і навука»	1

21	**Літаратура і грамадска-палітычная думка** Мясцовае летапісанне. Мемуарыстыка. Палітычная сатыра. Творчасць С. Полацкага. Грамадска-палітычная думка	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Літаратура і грамадска-палітычная думка»	1
22	**Архітэктура і мастацтва** Барока ў архітэктуры Беларусі. Віленскае барока. Партрэтны жанр. Батлейка. Школьны тэатр. Царкоўная музыка. Арганная музыка. Капэлы	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Архітэктура і мастацтва»	1
23	**Практычная работа**		1
	РАЗДЗЕЛ ІІІ. Беларусь у другой палове XVIII ст.		11
Тэма 6. Знешняя і ўнутраная палітыка Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.			4
24	**Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай** Умяшальніцтва суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Дысідэнцкае пытанне. Барская канфедэрацыя. Першы падзел Рэчы Паспалітай	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай». Сусветная гісторыя, 8 клас, тэма – «Кіраванне Кацярыны Вялікай»	1
25	**Дзяржаўныя рэформы Рэчы Паспалітай** «Чатырохгадовы сейм» (1788–1792) і значэнне яго рашэнняў для Беларусі.	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Спробы рэфармавання Рэчы Паспалітай». Сусветная	1

	Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Таргавіцкая канфедэрацыя. Другі падзел Рэчы Паспалітай	гісторыя, 8 клас, тэма – «Кіраванне Кацярыны Вялікай»	
26–27	**Паўстанне 1794 г. і яго падзеі ў Беларусі. Канец Рэчы Паспалітай** Падрыхтоўка, пачатак і мэты паўстання. Ход паўстання. Асаблівасці паўстання ў Беларусі і Літве. Паражэнне паўстання. Трэці падзел Рэчы Паспалітай	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Паўстанне 1794 г. і яго падзеі ў Беларусі. Канец Рэчы Паспалітай». Сусветная гісторыя, 8 клас, тэма – «Кіраванне Кацярыны Вялікай»	2
28	**Эканамічная стабілізацыя ў другой палове XVIII ст.** Феадальная гаспадарка. Эканамічныя рэформы ў другой палове 60-ых гг. XVIII ст. Аграрная рэформа А. Тызенгаўза. Стан гарадоў. Магнацкае прадпрымальніцтва	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Эканамічная стабілізацыя ў другой палове XVIII ст.»	1
Тэма 7. Культура эпохі Асветніцтва			5
29–30	**Адукацыя і навука ў эпоху Асветніцтва. Літаратура і друк** Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі. Школьная рэформа 1740–1760 гг. Стварэнне і дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Пачатковая адукацыя.	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Адукацыя і навука». Сусветная гісторыя, 8 клас, тэма – «Развіццё расійскай культуры ў XVI–XVIII стст.».	2

	Рэформа сярэдняй адукацыі на беларускіх землях. Арганізацыя першых прафесійных навучальных устаноў. Вышэйшая адукацыя і навука. Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў другой палове XVIII ст. Друк	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Літаратура і мастацтва». Беларуская літаратура, 9 клас, тэмы – «Асветніцтва (палемічная літаратура)», «Рамантызм (Адам Міцкевіч)»	
31	**Архітэктура і мастацтва** Палацава-замкавае будаўніцтва. Выяўленчае мастацтва. Віленская мастацкая школа. Музычнае мастацтва	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Літаратура і мастацтва»	1
32	**Магнаты і Асветніцтва** Магнацкія сядзібы як асяродкі культуры. Прыгонны тэатр. Прыгонныя капэлы і аркестры		1
33	**Народная культура** Асаблівасці развіцця народнай культуры. Побыт сялян і мяшчан. Светапогляд і абраднасць жыхароў вёскі і горада. Адносіны народа да рэлігіі і яе месца ў развіцці культуры. Фальклор. Музыка	Гісторыя Беларусі, 8 клас, тэма – «Народная культура»	1
34	**Практычная работа**		1
35	**Заключэнне**		1

Метадычныя парады да правядзення факультатыўных заняткаў «Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай»

РАЗДЗЕЛ І. Беларусь у другой палове XVI – першай палове XVII ст.

Тэма 1. Унутраная і знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.

Тэма: Утварэнне Рэчы Паспалітай

План вывучэння тэмы:

1. Перадумовы аб'яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага.
2. Прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай.
3. Люблінскі сейм. Акт 1 ліпеня 1569 г.
4. Умовы аб'яднання Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага.

Мэты:

- вызначыць унутраныя і знешнія прычыны і значэнне аб'яднання ВКЛ і Каралеўства Польскага. Рэч Паспалітая як дзяржаўна-палітычнае ўтварэнне. Асноўныя вынікі і значэнне Лівонскай вайны;
- назваць умовы Люблінскай уніі.

Асноўная праблема занятку: якія асноўныя прычыны выклікалі заключэнне Люблінскай уніі, і ці была гэтая падзея непазбежнай?

Асноўныя паняцці: Люблінскі сойм, Люблінская ўнія, Рэч Паспалітая, федэратыўная дзяржава.

Пры вывучэнні тэмы неабходна звярнуць увагу вучняў на тое, што з канца XV ст. ВКЛ было вымушана весці цяжкія войны супраць Маскоўскай дзяржавы, якая прэтэндавала на

ўсходнія землі ВКЛ. У выніку войнаў 1492–1494, 1500–1503, 1507–1508, 1512–1522, 1534–1537 гг. ВКЛ страціла частку сваіх тэрыторый. 8 верасня 1514 г. каля Оршы войскі ВКЛ на чале з гетманам К. Астрожскім ушчэнт разбілі большыя па колькасці войскі Маскоўскай дзяржавы, але поўнасцю скарыстаць вынікі перамогі вялікі князь не здолеў.

У 1558 г. маскоўскі цар Іван IV распачаў вайну супраць Лівонскага ордэна, які звярнуўся за дапамогай да Вялікага Княства Літоўскага. У выніку ў канфлікт была ўцягнута і Беларуска-Літоўская дзяржава. Маскоўскае войска захапіла Полацк і большую частку Полацкага ваяводства, што стала цяжкай стратай для ВКЛ. Вайна знясіліла абодва бакі. Каб дамагчыся перамогі, шляхта ВКЛ пайшла на заключэнне дзяржаўнай уніі з Польшчай. Праз 10 гадоў намаганнямі абедзвюх дзяржаў Полацк удалося вызваліць, а вайну давесці да пераможнага канца. Аднак прынесеныя вайной разбурэнні і страты насельніцтва ў паўночнай Беларусі былі адчувальныя яшчэ вельмі доўга.

Герберштэйн Жыгімонт фон (Жыгімонт фон Герберштэйн) (1486–1566) – барон, аўстрыйскі дыпламат, нарадзіўся ў сучаснай Славеніі (валодаў мясцовымі дыялектамі, што дапамагло яму ў Маскве), пісьменнік і гісторык. У 1499 г. паступіў у Венскі ўніверсітэт, у 1506 г. пачаў афіцэрскую кар'еру, удзельнічаў у некалькіх ваенных кампаніях. У 1508 г. быў прыняты ў рыцары, з 1515 г. пачаў дыпламатычную дзейнасць, у 1532 г. атрымаў званне барона. У 1515–1553 гг. Герберштэйн удзельнічаў у 69 пасольствах у розных краінах Еўропы, а таксама ў Турцыі. Знакаміты ў Расіі і за яе межамі сваімі працамі па геаграфіі, гісторыі і ўнутраным ладзе Вялікага Княства Маскоўскага.

1. Вызначыце, пра якія войны ідзе размова.
2. Назавіце гістарычных асоб, якія ўпамінаюцца ў дакументе. Што вы пра іх ведаеце?
3. Як знешнепалітычнае становішча ВКЛ паўплывала на ўтварэнне Рэчы Паспалітай?

«Хроніка Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага»: летапісны звод з ліку беларуска-літоўскіх летапісаў. Звод быў складзены ў 1520-ыя гг., магчыма, у Вільні, а яго аўтар быў набліжаным да магнатаў Гаштольдаў. У дакументе апісваюцца

гістарычныя падзеі ў Вялікім Княстве Літоўскім з часоў легендарнага князя Палемона да часоў князя Гедыміна. У аснове летапісу ляжыць легенда пра паходжанне літоўскіх князёў ад рымскіх арыстакратаў.

Флетчар Джыльс – аўтар апісання Маскоўскай дзяржавы ў XVI ст.

Апісанне Флетчара аб Расіі складаецца з 28 раздзелаў. У 1–4 раздзелах змешчаны геаграфічны нарыс Расіі, у 5–13 – звесткі пра суд, у 15–20 – пра арганізацыю войска і побыт чужынцаў, у 21–25 – пра царкоўны лад, у 26–28 раздзелах – пра прыватны побыт рускіх.

Нягледзячы на змрочнасць фарбаў, якімі Флетчар апісвае кіраванне, грамадскі побыт і народныя норавы Расіі, дакумент утрымлівае ў сабе, пры некаторай аднабаковасці агульнага погляду, нямала важных звестак, якія характарызавалі саслоўны і адміністрацыйны лад Маскоўскай дзяржавы, з-за чаго ён і лічыцца адной з галоўных крыніц па гісторыі Расіі XVI ст. Асобныя памылкі і недакладнасці, непазбежныя пад пяром іншаземца, мімаходам наведаўшага Расію, не змяншаюць агульнай каштоўнасці крыніцы.

Тэма: Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай

План вывучэння тэмы:

1. Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады.
2. Сейм Рэчы Паспалітай.
3. Кароль Рэчы Паспалітай.
4. «Залатыя вольнасці» шляхты.
5. Судовая сістэма.

Мэта:

- ахарактарызаваць дзяржаўны і палітычны лад, сістэму кіравання і судовую сістэму ВКЛ.

Асноўныя паняцці: Вялікі князь (гаспадар), Рада, сойм (сейм), гетман, падскарбі, маршалак, ваявода, кашталян.

ВКЛ нараўне з каралеўствам Польскім у паслялюблінскі перыяд з'яўлялася раўнапраўным членам федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай. Беларуска-літоўская шляхта па-

ранейшаму займала вядучыя пазіцыі ў княстве. Гэта было заканадаўча гарантавана Статутам 1588 г. Усялякія спробы польскага боку падпарадкаваць сабе ВКЛ, звесці яго на другарадныя ролі ў федэрацыі выклікалі рэзкі адпор ліцвінскіх палітыкаў, аж да спроб разрыву ўніі і аднаўлення поўнай самастойнасці сваёй дзяржавы. Уступкамі ліцвінам было рашэнне пра скліканне кожнага трэцяга сойма Рэчы Паспалітай у Гародні, атрыманне імі ў 1696 г. права кантролю над дзейнасцю вышэйшых службовых асоб, якім валодала польская шляхта.

Далучэнне да «залатых шляхецкіх вольнасцей», падзел улады з заходнімі суседзямі абарочваўся для беларускай шляхты акаталічваннем і паланізацыяй. Аднак самасвядомасць большасці апалячанага мясцовага панства ў XVII–XVIII стст. заставалася ліцвінскай. У гістарычных крыніцах Рэч Паспалітая паўстае дзяржавай палякаў ды ліцвінаў. Апошніх, паводле сучасных этнічных уяўленняў, мы вызначаем як літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў. Названыя з'явы адлюстроўваюць Баркулабаўскі летапіс, дыпламатычныя і прававыя акты, юрыдычныя помнікі, соймавыя матэрыялы, пратэсты і патрабаванні ліцвінскіх дзяржаўных мужоў і іх мемуары.

Паводле дамовы 1569 г. стваралася федэратыўная дзяржава «абодвух народаў» – **Рэч Паспалітая**. На чале яе стаяў кароль (ён жа Вялікі князь). Кароль выбіраўся пажыццёва шляхтай. Ён мог быць толькі католікам. Ствараўся **агульны вальны сойм**, які складаўся з сената (у склад якога ўваходзілі буйныя магнаты, каталіцкія іерархі і прадстаўнікі караля) і дзвюх пасольскіх ізбаў, куды павятовыя соймікі накіроўвалі па 2 сваіх прадстаўніка. Мяшчане, сяляне, праваслаўныя і пратэстанцкія святары прадстаўніцтва ў сойме не мелі. У астатнім абедзве дзяржавы захоўвалі суверэнітэт: **асобныя ўрады, войскі, мытні, скарбы, манетныя сістэмы, дзяржаўныя мовы** і г. д.

Для палягчэння адказу можна неабходную інфармацыю прадставіць у выглядзе схемы:



Сістэма кіравання ў Рэчы Паспалітай

? Дакажыце, што Рэч Паспалітая была федэратыўнай дзяржавай.

Тэма: Палітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI – пачатку XVII ст.

План вывучэння тэмы:

1. Рэакцыя ВКЛ на вынікі ўніі з Польшчай.
2. Захаванне агульнадзяржаўных соймаў ВКЛ.
3. Стварэнне Галоўнага Трыбунала ВКЛ.
4. III Статут ВКЛ 1588 г. і яго значэнне.

Мэты:

- ахарактарызаваць унутрыпалітычнае становішча ВКЛ, адносіны паміж магнатамі і шляхтай;
- даць ацэнку дзейнасці палітычных дзеячаў ВКЛ.

Асноўныя паняцці: Галоўны Трыбунал, Статут Вялікага Княства Літоўскага.

Традыцыі незалежнага існавання Вялікага Княства Літоўскага, з аднаго боку, і мэтанакіраваная палітыка ўрада Рэчы

Паспалітай па замацаванні лідэрства Кароны Польскай – з другога, выклікалі ў апошняй трэці XVI – пачатку XVII ст. абвастрэнне барацьбы за захаванне тэрытарыяльнай, палітычнай, культурнай самастойнасці княства. Барацьба гэта знайшла адлюстраванне ў лістах дзяржаўных і рэлігійных дзеячаў, паэтычных творах, публіцыстыцы (творах, прысвечаных тагачасным грамадска-палітычным праблемам), соймавых дакументах, дзяржаўных законах.

У 1588 г. быў выдадзены Статут Вялікага Княства Літоўскага – выдатны помнік прававой культуры і юрыдычнай думкі перыяду Адраджэння. Як звод законаў феадальнага права і як своеасаблівая канстытуцыя феадальна-грамадскага права Статут плённа дзейнічаў на тэрыторыі ВКЛ з 1589 г. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ён захоўваў сваю правамоцнасць у Віцебскай і Магілёўскай губернях да 1831 г., а ў Віленскай, Мінскай і Гродзенскай – да 1840 г.

Статут 1588 г. увянчаў вынікі даволі працяглай і грунтоўнай сістэматызацыі нормаў тагачаснага звычаёвага права, здабыткаў антычнай і сярэднявечнай юрыдычнай думкі. Палажэнні Статута ў многіх момантах апярэджвалі і пераўзыходзілі дасягненні юрыспрудэнцыі шэрагу еўрапейскіх дзяржаў. Ён ствараўся пад уплывам рэнесансна-гуманістычнай філасофіі эпохі Адраджэння, у ім даволі выразна прасочваюцца тэндэнцыі новай, раннебуржуазнай прававой свядомасці. Нормы Статута прасякнуты ідэяй усталявання прававой дзяржавы. Разам з тым Статут юрыдычна замацоўваў феадальны грамадскі лад.

? Дакажыце, што Статут 1588 г. заканадаўча замацоўваў самастойнасць ВКЛ.

Тэма: Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.

План вывучэння тэмы:

1. Барацьба Рэчы Паспалітай са Швецыяй.
2. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву.
3. Дэўлінскае перамір'е.
4. «Смаленская» вайна. Паляноўскі мір.

Мэты:

- ахарактарызаваць адносіны Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай у канцы XVI – першай палове XVII ст.;
- вызначыць прычыны, вынікі і значэнне ваеннай інтэрвенцыі Рэчы Паспалітай у Расію.

Асноўныя паняцці: інтэрвенцыя, альянс, Паляноўскі мір.

З моманту падпісання Люблінскай уніі і да пачатку XVII ст. Вялікае Княства Літоўскае старалася зменшыць адмоўныя наступствы міждзяржаўнага саюзу з Польскім каралеўствам, адстаяць свой суверэнітэт. Гэта праяўлялася, у першую чаргу, у спробах магнатэрыі ВКЛ, насуперак рашэнням той жа Люблінскай уніі, праводзіць самастойную знешнюю палітыку ў дачыненні да Маскоўскай дзяржавы. Вялікі канцлер Леў Сапега, Радзівілы, каб не дапусціць празмернага вяршэнства Польшчы ў Рэчы Паспалітай, імкнуліся далучыць да ўніі і трэцяга ўдзельніка – Маскоўскую дзяржаву. Калі на гэтым шляху дыпламатычныя захады не далі выніку, беларуска-літоўскія феадалы вымушаны былі падтрымаць рэалізацыю гэтай жа ідэі, але шляхам ваеннай інтэрвенцыі супраць Масквы ў 1604–1612 гг. Адным з самых напружаных момантаў у супрацьстаянні ВКЛ з усходнім суседам стала змаганне за Смаленск.

Адначасова з ваеннымі дзеяннямі супраць Расіі Рэч Паспалітая вяла барацьбу са Швецыяй за панаванне на Балтыйскім моры. У 1605 г. адзін з нашых найвыдатнейшых военачальнікаў вялікі гетман Ян Кароль Хадкевіч атрымаў у гэтай вайне бліскучую перамогу над Юрхгольмам (непадалёку ад Рыгі). На чале 4-тысячнага атрада Хадкевіч разграміў 14-тысячную шведскую армію, якая страціла 9 тысяч жаўнераў.



Баркулабаўскі летапіс, Баркулабаўская хроніка: летапіс з ліку беларуска-літоўскіх летапісаў, адзін з мясцовых летапісаў ВКЛ. Твор быў складзены ў м. Баркулабава (сучасны Быхаўскі раён) у пачатку XVII ст. Аўтарам, магчыма, з'яўляецца мясцовы праваслаўны святар Фёдар Піліпавіч Магілёвец. Апісанне падзей пачынаецца з сойма ў Берасці (1545) і пабудовы Магілёўскага замка (1526). Больш сістэматызавана, пасля 11-гадовага перапынку, выкладаюцца падзеі з 1563 г. (аблога Полацка) да 1608 г. У канцы летапісу ёсць пазнейшы дадатак невядомага аўтара аб

паходзе караля Уладзіслава IV на Смаленск у час вайны 1632–1634 гг.

У твор уключаны ліст Івана IV да Стэфана Баторыя (1580), грамата Жыгімонта III (1592), тэкст «Універсала» рокашу (узброенага паўстання шляхты супраць караля) 1606 г. Разгорнута апісваецца Берасцейская царкоўная ўнія; магчыма, што аўтар удзельнічаў у Берасцейскім царкоўным саборы (1596) і абараняў інтарэсы праваслаўнага насельніцтва. Асноўнымі крыніцамі летапісу з'яўляюцца асабістыя назіранні і ўспаміны аўтара. Падзеі асвятляюцца з патрыятычных пазіцый. Так, асуджаюцца дзеянні ўкраінскіх казакаў, якія «вялікую шкоду чынілі... горш, чым злыя непрыяцелі».

Тэма: Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.

План вывучэння тэмы:

1. Уплыў гаспадарчых працэсаў у краінах Заходняй Еўропы на эканоміку ВКЛ.
2. Аграрная рэформа 1557 г.
3. Феадальныя павіннасці і дзяржаўныя падаткі сялян.

Мэты:

- ахарактарызаваць сацыяльныя адносіны ў вёсцы, феадальныя павіннасці сялян, асноўныя катэгорыі залежнага сялянства;
- апісаць працэс запрыгоньвання сялянства;
- вызначыць асноўныя формы барацьбы сялян за паляпшэнне свайго становішча.

Асноўныя паняцці: фальварак, Устава на валокі («валочная памера»), валока, вольныя («пахожыя») сяляне, «непахожыя» сяляне, чэлядзь нявольная, паншчына, даніна, чынш.

У XVI–XVII стст. сялянства складала прыкладна 70 % насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага. Асноўнымі заняткамі сялян былі земляробства, жывёлагадоўля, якія дапаўняліся промысламі (пчалярствам, рыбалоўствам, паляваннем) і рознымі рамёствамі (кавальскім, ганчарным, бандарскім, цяслярскім, шавецкім і інш.). Уладальнікамі зямлі з'яўляліся магнаты і шляхта, дзяржава і царква. У XVI – пачатку XVII ст. зацвердзілася фальваркава-паншчынная гаспадарка. У сярэдзіне

XVI ст. асноўная маса вясковага насельніцтва была запрыгонена. Асабістая залежнасць ад землеўласніка і павелічэнне павіннаснага прыгнёту, які назіраўся ў XVI – першай палове XVII ст., выклікалі ў сялян пратэст, які ўвасабляўся ў скаргах уладальнікам, уцёках, адмовах выканання павіннасцей, узброеных выступленнях.

Асноўнымі крыніцамі, абапіраючыся на даныя якіх, можна ўявіць становішча і штодзённае жыццё сялянства, яго ўзаемаадносіны з уладай і іншымі саслоўямі, з'яўляюцца інвентары, у якіх апісваліся феадальныя ўладанні разам з насельніцтвам, зямлёй, гаспадаркай, павіннасцямі, а таксама сялянскія скаргі, разнастайная гаспадарчая дакументацыя (інструкцыі, распараджэнні землеўласнікаў сваёй адміністрацыі ў маёнтках).

У XVI – першай палове XVII ст. у Беларусі інтэнсіўна адбываўся працэс росту колькасці гарадоў і іх насельніцтва. Яно папаўнялася, галоўным чынам, з ліку вясковых перасяленцаў, уцекачоў ад прыгону. Феадалы імкнуліся захаваць сваю ўладу над гарадамі шляхам стварэння юрыдык. Але ў гэты перыяд практычна ўсе больш-менш значныя гарадскія паселішчы атрымалі Магдэбургскае права. У іх квітнее рамяство, развіваецца ўнутраны і знешні гандаль з Польшчай, Прусіяй, Ліфляндыяй, Расіяй. Рамеснікі і купцы аб'ядноўваюцца па прафесійнай адзнацы ў свае арганізацыі – цэхі і брацтвы, якія абараняюць іх інтарэсы. Цэхавая арганізацыя мела сваю структуру: вучні – падмайстры – майстры – цэхмістры. Пераход на прыступку вышэй быў абумоўлены пэўнымі правіламі і патрабаваннямі. У гэты перыяд не спадала напружанасць паміж гарадской беднатой і багатай вярхушкай, якая сканцэнтравала ў сваіх руках усю ўладу. Часам яна вылівалася ў сацыяльныя канфлікты. Уяўленне пра сацыяльна-эканамічнае жыццё беларускіх гарадоў таго часу даюць велікакняжацкія і каралеўскія прывілеі, цэхавыя статуты, мытныя кнігі, скаргі, судова-следчыя матэрыялы, інвентары.

? Якія сацыяльныя вынікі мела станаўленне фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадаркі ў ВКЛ?

Карта «Эканоміка Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.»

1. Вызначце, якія формы вытворчасці былі больш развіты ў паўночным рэгіёне Беларусі, і параўнайце з заходнім і ўсходнім рэгіёнамі. Вызначце, якія воласці адносіліся да гэтых рэгіёнаў.

2. Вызначце, праз якія гарады праходзілі асноўныя гандлёвыя шляхі. Што па іх вывозілі?

Карта «Гарады і мястэчкі Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.»

1. Падлічыце колькасць гарадоў, абазначаных на карце. Вызначце, колькі з іх атрымалі Магдэбургскае права да XVI ст.

2. Вызначце, колькі гарадоў, якія мелі права на самакіраванне, займаліся пераважна вытворчасцю кафлі, шкляных вырабаў, паперы, тканін і адзення.

3. Пакажыце на карце найбольш буйныя беларускія гарады (Брэст, Магілёў, Пінск, Віцебск).

4. Пакажыце на карце месцы будаўніцтва мануфактур.

5. Пакажыце на карце важнейшыя гандлёвыя шляхі.

Рэарганізацыя сістэмы землеўладання шляхам падзелу зямлі на валокі (30 моргаў, або 21,36 га), вызначэння якасці глебы і ўвядзення валокі ў якасці асноўнай адзінкі падаткаабкладання ў крыніцах абазначаецца тэрмінам «памера валочная», а ў гістарычнай літаратуры – «аграрная рэформа». Упершыню аграрную рэформу ў сваіх уладаннях (Давід-Гарадок, Пінск, Клецк і некаторыя іншыя) у 40 – пачатку 50-ых гг. XVI ст. правяла Бона – жонка караля польскага і Вялікага князя Літоўскага Жыгімонта. Рэформа праводзілася на аснове спецыяльных інструкцый (устаў). Амаль адначасова з Бонай на аснове асобнай уставы пачаў праводзіць аграрную рэформу ў гаспадарскіх уладаннях і яе сын Жыгімонт Аўгуст. Да 1557 г. валочная памера была завершана ў многіх гаспадарскіх уладаннях заходняй часткі ВКЛ. Але яе прынцыпы і іх рэалізацыя былі прызнаны нездавальняючымі. Таму ў 1557 г. была распрацавана новая інструкцыя – Устава на валокі, на аснове якой пачалася суцэльная рэвізія, г. зн. перагляд папярэдняй памеры. Яна, па сутнасці, стала новай памерай.

Тэма 2. Царква і рэлігія. Культура ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.

Тэма: Рэфармацыя ў Беларусі

План вывучэння тэмы:

1. Перадумовы рэфармацыйнага руху.
2. Пашырэнне Рэфармацыі ў Беларусі.
3. Асаблівасці і асноўныя этапы рэфармацыйнага руху на Беларусі.
4. Кальвінізм. Арыянства.
5. Дзеячы Рэфармацыі (М. Радзівіл Чорны, С. Будны, В. Цяпінскі).
6. Вынікі і значэнне рэфармацыйнага руху.

Мэты:

- ахарактарызаваць становішча асноўных канфесій на беларускіх землях у XVI – першай палове XVII ст.;
- апісаць рэфармацыйны і антырэфармацыйны рух;
- вызначыць вынікі і значэнне Рэфармацыі.

Асноўныя паняцці: верацярпімасць, Рэфармацыя, талерантнасць.

Рэфармацыя (ад лацінскага *reformatio* – пераўтварэнне, выпраўленне) – шырокі грамадскі і рэлігійны рух, які пачаўся з дзейнасці Яна Гуса (1371–1415) у Чэхіі і Марціна Лютэра (1483–1546) у Германіі. Ён узнік як пратэст (адсюль яго другая назва – пратэстанцтва) супраць каталіцкага касцёла, масавага продажу індульгенцый (набыццё якіх нібыта пазбаўляла чалавека ад грахоў), маральнай разбэшчанасці іерархаў, неапраўдана жорсткай царкоўнай дысцыпліны, строгай падпарадкаванасці Папу Рымскаму.

? Зрабіце план-канспект прыведзенага тэксту «Рэфармацыя ў Беларусі». Пры рабоце карыстайцеся памяткай «Як складаць план-канспект».

Карта «Рэлігійнае становішча ў ВКЛ у другой палове XVI ст. Традыцыйнае хрысціянства і Рэфармацыя»

1. Вызначце, якія гарады з'яўляліся цэнтрамі а) пратэстантызму; б) праваслаўя; в) каталіцтва.

2. Вызначце арэалы распаўсюджвання пратэстанцкага руху на беларускіх землях.

Тэма: Контррэфармацыя ў Беларусі

План вывучэння тэмы:

1. Асноўныя накірункі Контррэфармацыі.
2. Пачатак і пашырэнне дзейнасці ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі (П. Скарга).
3. Вынікі Контррэфармацыі ў Беларусі.

Мэта:

- вызначыць вынікі і значэнне Контррэфармацыі.

Асноўныя паняцці: Контррэфармацыя, евангелікі, езуіты.

На змену Рэфармацыі ў Еўропе і ў Вялікім княстве прыйшоў перыяд Контррэфармацыі. Але ў нашай дзяржаве яна не набыла такіх жорсткіх формаў, як, напрыклад, у Францыі, дзе ў Варфаламееўскую ноч каталікі забілі 20 тысяч пратэстантаў-гугенотаў.

Неабходна засяродзіць увагу вучняў на ролі каталіцкіх манаскіх ордэнаў у Контррэфармацыі на Беларусі, асабліва ордэна езуітаў. У сваёй барацьбе з рэфармацыйнымі плынямі яго дзеячы галоўную ролю адводзілі ўсталяванню кантролю над навукай, літаратурай і мастацтвам, фарміраванню высокага ўзроўню адукацыі і выхаванню моладзі. У канцы 1569 г. па запрашэнні віленскага біскупа В. Пратасевіча езуіты з'явіліся ў Вільні. Манархі Рэчы Паспалітай, асабліва Стэфан Баторый, горача падтрымалі іх дзейнасць. У 1570 г. імі ў Вільні быў заснаваны калегіум, ператвораны ў 1579 г. у акадэмію – першую вышэйшую навучальную ўстанову на тэрыторыі ВКЛ. Яе першым рэктарам стаў выдатны прамоўца і пісьменнік Пётр Скарга. Езуіцкая адукацыя адрознівалася высокім узроўнем, да таго ж яна была бясплатнай. Езуіцкі калегіум (а яны з цягам часу былі адкрыты ў Брэсце, Пінску, Навагрудку, Гародні, Мінску, Віцебску, Слуцку, Магілёве і іншых гарадах; пры

калегіумах працавалі друкарні і бібліятэкі) маглі наведваць дзеці, якія належалі да розных канфесій, але ў яго сценах яны рабіліся шчырымі прыхільнікамі каталіцызму. Езуіты кіравалі будаўніцтвам новых кляштараў і касцёлаў, займаліся дабрачыннасцю і аказвалі медыцынскую дапамогу насельніцтву (заснавалі першую на Беларусі аптэку ў Гародні). Свае красамоўныя пропаведзі яны часта прамаўлялі на беларускай мове, на ёй жа вялося выкладанне ў Полацкім калегіуме, перакладаліся свяшчэнныя кнігі. За пяць гадоў дзейнасці езуітаў толькі ў Вільні да каталіцызму вярнуліся 6 тысяч чалавек.

Звярніце ўвагу вучняў на малюнак **«Разбурэнне святыняў падчас барацьбы каталікоў і пратэстантаў у Францыі»**. Можна прапанаваць вучням гульню «Вандраванне ў глыб карціны».

Прыгледзеўшыся да карціны, навучэнцы могуць уявіць сябе на месцы любой асобы на ёй, апісаць, намаляваць уяўную сітуацыю ў прапанаваных карцінай акалічнасцях, дапоўніўшы яе сваімі аповедамі і ведамі аб адлюстраванай эпосе і людзях, якія жылі ў гэты час.

Тэма: Берасцейская царкоўная ўнія

План вывучэння тэмы:

1. Перадумовы заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі.
2. Падрыхтоўка Берасцейскай царкоўнай уніі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. і яго значэнне.
3. Гвалтоўнае насаджэнне ўніяцкай царквы ў канцы XVI – пачатку XVII ст.
4. Уніяцкія дзеячы (І. Кунцэвіч).
5. Пашырэнне ўніяцтва сярод сельскага насельніцтва і гарадскіх нізоў.

Мэты:

- вызначыць прычыны ўтварэння ўніяцкай царквы;
- ахарактарызаваць значэнне ўніяцкай царквы ў гістарычным развіцці беларускіх зямель, адносіны розных сацыяльных слаёў да Берасцейскай уніі.

Асноўныя паняцці: Берасцейскі царкоўны сабор, Берасцейская ўнія, уніяцтва, грэкакаталіцкая царква.

Пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай пытанні веравызнання ў Вялікім Княстве Літоўскім набылі вострыя палітычны характар і аказаліся ў цэнтры ўвагі грамадскай думкі. Сярод кіруючых колаў пачала выспяваць думка пра неабходнасць падмацавання дзяржаўнага аб'яднання, што адбылося, адзінствам царкоўным. У сувязі з гэтым па ініцыятыве езуіта Пятра Скаргі быў распрацаваны план царкоўнай уніі. Яго падтрымалі праваслаўныя іерархі, дзякуючы чаму ў кастрычніку 1596 г. у Бярэсці адбыўся царкоўны сабор і з'явілася новая, уніяцкая, царква. У царкоўнай уніі былі як прыхільнікі, так і праціўнікі. З боку першых назіралася імкненне як мага хутчэй яе ўвесці, у сувязі з чым у канцы XVI – пачатку XVII ст. разгарнулася зацятая канфесійная барацьба, якая часам перарастала ва ўзброеныя сутычкі. У рэшце рэшт лёс уніі быў вырашаны народам, які ўспрыняў яе, дзякуючы перш за ўсё таму, што ў царкве загучала роднае для вернікаў слова. У XVIII ст. большасць былога праваслаўнага насельніцтва стала ўніятамі. У прадстаўленых урыўках з летапісаў, дакументаў, твораў адлюстравана, як адбывалася падрыхтоўка ўніі, яе ўвядзенне, успрыняцце вернікамі і грамадствам.

Адзначым, што ўнію падтрымалі палітыкі, праваслаўная царква, каталіцкая царква.



Пры рабоце з картай **«Берасцейская ўнія 1596 г. Уніяцтва ў Беларусі ў канцы XVI – першай палове XVII ст.»** звяртаемся да наступных пытанняў:

1. Вызначце, колькі праваслаўных і ўніяцкіх манастыроў было заснавана на беларускіх землях. Якіх больш? Чаму?
2. Назавіце асноўныя асяродкі супраціўлення ўніяцтву.
3. Назавіце цэнтры ўніяцкіх епархій.

Заданні да тэксту «Уніяцтва на Беларусі»

1. Уважліва прачытайце тэкст.
2. Абапіраючыся на назву (загаловак) тэксту, вызначце праблему ці ідэю, выкладзеную ў ім.
3. Раздзяліце тэкст на лагічна завершаныя часткі, вызначце сэнсавы змест кожнай з іх.
4. Суаднясіце змест частак паміж сабой і з праблемай (асноўнай ідэяй) тэксту, вызначце сувязі паміж імі.
5. Зрабіце вывад, абагульняючы змест частак тэксту.
6. Складзіце кругавую дыяграму «Канфесійны склад беларусаў у канцы XVIII ст.».
7. Ахарактарызуйце дзейнасць брацтваў у Беларусі.

Тэма: Пашырэнне ўплыву Адраджэння на беларускія землі

План вывучэння тэмы:

1. Кнігадрукаванне.
2. Літаратура рэлігійная і свецкая.
3. Грамадска-палітычная і філасофская думка.
4. Выяўленчае мастацтва.
5. Дойлідства.

Мэты:

- вызначыць асаблівасці грамадска-палітычнай думкі на беларускіх землях у перыяд Адраджэння;
- ахарактарызаваць культурнае жыццё XVI – пачатку XVII ст.

Асноўныя паняцці: гуманізм, асветнік, мецэнат, Адраджэнне, езуіцкая акадэмія, брацкія друкарні, публіцыстычная літаратура, калегіум, брацтва.

У XVI – пачатку XVII ст. на беларускіх землях хутка развіваліся кнігадрукаванне, адукацыя, літаратура, шырока распаўсюджваліся ідэі гуманізму. У аснове апошняга было ўяўленне пра самакаштоўнасць і зямное прызначэнне чалавечага жыцця, вучэнне пра неабмежаваныя магчымасці асобы, імкненне адрадзіць антычныя традыцыі ў культуры. Спецыфічнымі рысамі Адраджэння ў Беларусі былі адносная верацярпімасць, узаемадзеянне і ўзаемаўплыў розных культур.

Пытанні для магчымай работы ў групах (7 груп):

1. Эпоха Адраджэння ў Беларусі (характарыстыка тэрміна, прычыны і сутнасць з'явы, асноўныя аспекты развіцця).
2. Грамадска-палітычная думка эпохі Адраджэння ў Беларусі (характарыстыка тэрміна, асноўныя ідэі, прадстаўнікі, творы).
3. Кнігадрукаванне ў Беларусі (агульная характарыстыка, пералік друкарняў (лакалізацыя на картасхеме), твораў, прозвішчаў друкароў).
4. Развіццё літаратуры ў Беларусі (асноўныя жанры, назвы твораў, прозвішчы аўтараў).
5. Развіццё адукацыі ў Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст. (тыпы навучальных устаноў (лакалізацыя на

картасхеме), іх характарыстыка, найбольш значныя навучальныя ўстановы ў ВКЛ, першыя ВНУ).

6. Мастацтва (асноўныя жанры, іх кароткая характарыстыка, пералік твораў і іх аўтараў).

7. Дойлідства (асноўныя тыпы збудаванняў, характарыстыка).

Звярніце ўвагу вучняў на малюнкі, прыведзеныя ў гэтай тэме. Аб малюнку **«Сафійскі сабор і базыльянскі манастыр» Напалеона Орды** неабходна заўважыць, што дадзены храм належаў у XVII ст. уніяцкай царкве. Вучням можна прапанаваць вызначыць, што гэта за будынак, і расказаць аб утварэнні ўніяцкай царквы.

Карта «Культура Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.»

1. Вызначце, у якіх гарадах Беларусі былі заснаваны: а) кальвінісцкія, б) езуіцкія навучальныя ўстановы, в) навучальныя ўстановы праваслаўных брацтваў.

2. Вылучыце, дзе знаходзіліся асноўныя школы жывапісу. Паспрабуйце ахарактарызаваць асноўныя рысы гэтых школ.

Пры рабоце з ілюстрацыямі з выявай Гродзенскага замка неабходна звярнуць увагу на змены, якія адбыліся ў архітэктурным абліччы замка.

Гульня «Экскурсія». Клас дзеліцца на некалькі груп, кожная з якіх за 10 хвілін рыхтуе аповед-«экскурсію» пра пэўны экспанат, але для розных груп экскурсантаў: 1) дзяцей старшай групы дзіцячага сада; 2) вучняў 5 класа; 3) студэнтаў ВНУ; 4) замежных турыстаў.

Пасля заканчэння адведзенага часу ад кожнай групы выходзіць прадстаўнік, які «праводзіць» экскурсію. А 3–4 чалавекі з групы выконваюць ролю экскурсантаў.

У гэтай гульні неабавязкова выкарыстоўваць групавую работу. Заданне можна выконваць і індывідуальна ў пісьмовым выглядзе.

РАЗДЗЕЛ II. Беларусь у другой палове XVII – першай палове XVIII ст.

Тэма 3. Беларусь у час войнаў сярэдзіны XVII – першай палове XVIII ст.

Тэма: Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. на беларускіх землях

План вывучэння тэмы:

1. Прычыны казацка-сялянскай вайны.
2. Казацкія «загоны» ў Беларусі. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў супраць шляхецкага войска на поўдні Беларусі.
3. Бітва пад Лоевам. Вынікі і наступствы казацка-сялянскай вайны.

Мэты:

- вызначыць прычыны, сацыяльны склад удзельнікаў, асноўныя вынікі і значэнне казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг.;
- апісаць падзеі казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг.

Асноўныя паняцці: казацка-сялянская вайна, загоны, бітва пад Лоевам.

Паўстанне, узнятае гетманам Багданам Хмяльніцкім на Украіне, вельмі хутка ахапіла беларускія землі. Казацкі гетман засылаў сюды загоны (атрады) сваіх палкоўнікаў і ўніверсалы (адозвы да мірнага насельніцтва), у якіх заклікаў сялян да дзеянняў. Да восені 1648 г. казацка-сялянскія атрады замацаваліся ў многіх гарадах Паўднёва-Усходняй Беларусі. Аднак зімой 1648–1649 гг. гетман Вялікага Княства Літоўскага Януш Радзівіл задушыў паўстанне, жорстка расправіўся з паўстаўшымі гарадамі, а потым разбіў вялікія казацкія сілы пад Лоевам. Вытрымкі з запісак і мемуараў, напісаных непасрэднымі ўдзельнікамі казацка-сялянскай вайны, даюць яскравае ўяўленне пра тыя падзеі.

Работа ў групах. Ахарактарызаваць казацка-сялянскую вайну, яе ход, асноўныя падзеі на аснове дакументаў і малюнка **«Лоеўская бітва 1651 г.» А. ван Вестэрфельда.**

1-ая група. У выглядзе штодзённіка.
2-ая група. Як успаміны ўдзельніка.

Карта «Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. на Беларусі»

1. Вызначце, якія беларускія гарады былі захоплены казакамі, а якія не здаліся.
2. Як вы лічыце, чаму менавіта паўднёвая частка Беларусі апынулася ў стане ваенных дзеянняў і чаму менавіта тут было больш за ўсё сялянскіх хваляванняў?

Тэма: Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг.

План вывучэння тэмы:

1. Прычыны вайны і суадносіны сіл.
2. Пачатак баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі.
3. Палітыка цара Аляксея Міхайлавіча.
4. Кейданская ўнія 1655 г.
5. Баявыя дзеянні ў першай палове 1660-ых гг.
6. Віленскае перамір'е. Вызваленне тэрыторыі Беларусі. Андросаўскае перамір'е.

Мэты:

- вызначыць прычыны, асноўныя вынікі і значэнне вайны Расіі і Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг.;
- апісаць падзеі вайны Расіі і Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг.

Асноўныя паняцці: «шышы», Андросаўскае перамір'е.

У маі 1654 г. маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч распачаў вайну супраць Рэчы Паспалітай, накіраваўшы прыкладна 100-тысячную армію на Вялікае Княства Літоўскае. Падабраныя вытрымкі з гістарычных дакументаў сведчаць пра суадносіны ваенных сіл і вялікія цяжкасці ў арганізацыі абароны, з якімі сутыкнуліся ўлады ВКЛ. Гарады Беларусі або здаваліся, не маючы дапамогі, або браліся штурмам. На першым этапе вайны царская армія заняла амаль усю Беларусь. Вядзенне вайны апраўдвалася ідэяй «вызвалення ад ляхаў» (палякаў).

Карта «Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай у 1654–1667 гг.»

1. Вызначце, якія землі згубіла Рэч Паспалітая падчас вайны 1654–1667 гг.
2. Як вы лічыце, ці можна па карце вызначыць, якія гарады сталі найбольшымі ахвярамі гэтай вайны. Прывядзіце прыклады.
3. Назавіце асноўныя бітвы.

Тэма: Беларусь у Паўночнай вайне

План вывучэння тэмы:

1. Перадумовы Паўночнай вайны і яе пачатак.
2. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнага супрацьстаяння ў ВКЛ.
3. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.
4. Бедствы насельніцтва Беларусі.
5. Вынікі і наступствы вайны.

Мэты:

- вызначыць прычыны, асноўныя вынікі і значэнне Паўночнай вайны;
- апісаць падзеі Паўночнай вайны.

Асноўныя паняцці: Паўночная вайна, бітва пад Лясной.

У 1700–1721 гг. Рэч Паспалітая ўступіла ў Паўночную вайну на баку Расіі і Даніі супраць Швецыі. Але ваенныя дзеянні праходзілі для яе няўдала. На тэрыторыі Беларусі актыўна дзейнічалі расійская і шведская арміі. У 1708 г. у бітве пад Лясной цар Пётр I знішчыў буйны шведскі корпус генерала А. Левенгаўпта. Працягваліся сутыкненні паміж магнацкімі групоўкамі. У вайне Беларусь зноў панесла цяжкія чалавечыя і эканамічныя страты. Пасля заканчэння вайны Рэч Паспалітая апынулася ў стане поўнай залежнасці ад магутных суседзяў – Аўстрыі, Прусіі і Расіі. Соймы пастаянна зрываліся, што выклікала крызіс дзяржаўнага кіравання. У 1735 і 1764 гг. часткі расійскай арміі гвалтоўна ўрываліся на паўднёвы ўсход Беларусі. Расія і Прусія заключылі таемнае пагадненне аб нязменнасці палітычнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай.

Карта «Беларусь у гады Паўночнай вайны 1700–1721 гг.»



1. Вызначце асноўныя раёны канцэнтрацыі расійскіх і шведскіх войскаў. На якіх (чыіх) землях гэта адбывалася?
2. Пералічыце месцы бітваў, у адных з якіх перамаглі шведы, а ў іншых – рускія. Назавіце даты гэтых бітваў.

Тэма 4. Унутрыпалітычнае становішча Беларусі ў першай палове XVIII ст.

Тэма: Барацьба магнацкіх груповак

План вывучэння тэмы:

1. Пашырэнне шляхецкай анархіі. Канфлікты паміж магнацкімі родамі.
2. «Хатняя» вайна 1696–1700 гг.

3. Сойм 1717 г. і яго значэнне.
4. Нарастанне расійскага ўплыву ў Рэчы Паспалітай.
5. Вайна за «Польскую спадчыну» (1733–1739 гг.).

Мэты:

• ахарактарызаваць унутрыпалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у другой палове XVII ст.;

• вызначыць прычыны, якія прывялі да палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай.

Асноўныя паняцці: шляхецкая рэспубліка, кліентэла, канфедэрацыя.

Беларуска-літоўскія магнаты Радзівілы, Чартарыйскія, Сапегі, Пацы, Агінскія і інш. традыцыйна сапернічалі паміж сабой за ўладу і ўплыў у ВКЛ. Дробная і нават сярэдняя шляхта выкарыстоўвалася магнатамі ў сваіх інтарэсах і фактычна не адыгрывала самастойнай ролі ў палітыцы. Сіла магнацтва абапіралася на велізарныя зямельныя багацці, прыгон дзясяткаў тысяч сялян. Фактычна толькі магнатам быў адкрыты доступ да вышэйшых дзяржаўных пасад – гетмана, канцлера, падскарбія. Гэта дазваляла кантраляваць войска, фінансы, а значыць, дыктаваць сваю волю і сілай прыводзіць да пакоры сваіх праціўнікаў. Той ці іншы магнацкі род, дабіўшыся вяршэнства ў ВКЛ, сустракаўся з неабходнасцю абароны дзяржаўных інтарэсаў княства. Пры гэтым справа часта даходзіла да спробы разрыву ўніі з Польскім каралеўствам. Першымі буйнымі канфліктамі на гэтай глебе сталі супярэчнасці паміж прыхільнікамі Сапегаў і групоўкай на чале з Агінскімі і Вішнявецкімі (другая палова 80-ых гг. XVII ст.).

Карта «Барацьба магнацкіх груповак у канцы XVII – пачатку XVIII ст.»



1. Якім магнатам належала больш за усё зямель? Назавіце цэнтры зямельных уладанняў буйных магнатаў.
2. Як вы лічыце, якія прычыны прывялі да палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай?

Тэма: Сацыяльна-эканамічнае становішча беларускай вёскі

План вывучэння тэмы:

1. Заняпад вёскі падчас войнаў другой паловы XVII – пачатку XVIII ст.
2. Шляхі нармалізацыі гаспадарчага жыцця.
3. Аднаўленне сялянскай гаспадаркі.
4. Рост прыгонніцкай эксплуатацыі сялян.

5. Сялянскія павіннасці і землеўладанне.
6. Юрыдычнае становішча сялянства.

Мэты:

- ахарактарызаваць сацыяльныя адносіны ў вёсцы, феадальныя павіннасці сялян у другой палове XVII–XVIII ст.;
- апісаць становішча сялян.

Асноўныя паняцці: пазанадзельная (прыёмная) зямля, адработачныя павіннасці, падымнае, дзякла.

Адмоўны ўплыў на становішча сялянскай гаспадаркі, як і эканомікі Рэчы Паспалітай у цэлым, аказалі войны, якія ў сярэдзіне XVII – першай чвэрці XVIII ст. пранесліся па абшарах гэтай вялізнай дзяржавы. Землі Беларусі зведалі ўсе цяжкасці ваеннага ліхалецця. Колькасць насельніцтва пасля войнаў значна зменшылася. Пуставала больш за палову ворных зямель. Але паступова штодзённай руплівай працай беларускага селяніна за кошт стварэння спрыяльных умоў землекарыстання, ільгот у павіннасцях з боку землеўладальнікаў становішча сялянскай і феадальнай гаспадарак выпраўлялася, а ў асобных маёнтках даваенны ўзровень развіцця быў нават перавышаны.

Пра сялянскае жыццё таго часу сведчаць розныя крыніцы: інвентары, скаргі, матэрыялы дзяржаўнага і феадальна-гаспадарчага справаводства.



Карыстаючыся фотаздымкам інвентара, зрабіце інвентар маёнтка «Смалявічы».

Інвентар маёнтка «Смалявічы» на 1669 г.

Млыны в маентасци Смолевицкой

В Богуслав Полю	2
В Плисе	1
В Смолевичах	1
В Драчкове	1
В Волме	1
В Дубровце	1
В Городище	1
В Петровичах	1
В Слепни не забудованы	1
Сумма	**10**

Карчмы забудованы	**Незабудованые карчмы**
1 в Смолевичах	1 в Богуслав Полю
1 в Городище	1 в Слепни
	1 в Плисе
	1 в Драчковен
	1 в Волме

Аренды

Аренду в Богуслав Поля трымае еврей Рубин Изоаелевич од 15 (месяц?) року 1669
Пше лят тры плациць повинен цо рок злотых 200.

Годовой доход з Мяста Богуслав Поля 550:24 $^{1}/_{2}$ злотых.

Крыжаванка «Прылады працы сялян»



Адказы: 1. Бойка. 2. Калаўрот. 3. Цэп. 4. Пранік. 5. Калёсы. 6. Качалкі. 7. Саха. 8. Серп. 9. Плуг. 10. Кросны.

Тэма: Сялянскія выступленні

План вывучэння тэмы:

1. Супраціўленне сялян узмацненню феадальнага прыгнёту.
2. Формы антыфеадальнай барацьбы.
3. Паўстанне сялян у Крычаўскім старостве.
4. Паўстанне на Каменшчыне.

Мэты:

• вызначыць прычыны, сацыяльны склад удзельнікаў, асноўныя вынікі і значэнне сялянскіх паўстанняў на беларускіх землях XVIII ст.;

• апісаць падзеі Крычаўскага паўстання і паўстання на Каменшчыне.

Асноўныя паняцці: арандатар, скарга, Крычаўскае паўстанне, паўстанне на Каменшчыне.

Пагаршэнне эканамічнага становішча ў выніку шматлікіх войнаў выклікала сялянскія хваляванні. Самае моцнае з іх адбылося ў 1740–1744 гг. у Крычаўскім старостве. Мясцовыя сяляне выступілі супраць адміністрацыі і арандатараў, якія, імкнучыся хутка ўзбагаціцца, няшчадна эксплуатавалі сялян. Адзін з кіраўнікоў паўстання, Васіль Вашчыла, называў сябе нашчадкам гетмана Багдана Хмяльніцкага. Паўстанцы спрабавалі дамовіцца з уладальнікам зямлі Г. Радзівілам. У 1743 г. яны рашыліся на адкрытае ўзброенае выступленне. Сяляне нападалі на шляхецкія маёнткі, дамы купцоў і ліхвяроў, палілі судовыя і даўгавыя кнігі. Іх падтрымлівалі бяднейшыя гараджане. Але ў 1744 г. войскі Г. Радзівіла разбілі паўстанцаў. Захопленыя ў палон сяляне былі жорстка пакараны. Пасля задушэння паўстання Г. Радзівіл пайшоў на некаторыя ўступкі. Але поўнасцю задаволіць патрабаванні сялян ён не жадаў.

Крычаўскае паўстанне 1740–1744 гг. было буйнейшым сялянскім выступленнем у Беларусі часоў Рэчы Паспалітай. Жорсткі феадальны ўціск, вымаганні арандатараў, адміністратараў, вайсковыя пагромы і інш. прымусілі сялян і гараджан Крычаўшчыны ўзняцца на барацьбу супраць прыгнятальнікаў. Першы ўзброены атрад узначаліў у 1740 г. Васіль Вашчыла. Паўстанцы выгналі са староства прыгнятальнікаў-арандатараў і ўзялі ўладу ў свае рукі. Асаблівасць Крычаўскага паўстання заключаецца ў тым, што на працягу ажно 4 гадоў просты люд трымаў уладу на даволі значнай тэрыторыі. У студзені 1744 г. паўстанне было жорстка задушана ў выніку двух узброеных сутыкненняў радзівілаўскага прафесійнага войска і сялянскай грамады. Выступленне крычаўскіх сялян і гараджан не прайшло бясследна. Яно пэўным чынам атрымала працяг у Мазырскім павеце, на Каменшчыне. Вынік гэтага выступлення быў аналагічны крычаўскаму. Сведчанні аб перадумовах і падзеях, звязаных з сялянскімі паўстаннямі XVIII ст., знайшлі адлюстраванне ў гаспадарча-адміністрацыйных дакументах (інвентары, скаргі, справаздачы адміністрацыі), карэспандэнцыі службовых асоб Радзівілаў, судовых справах.

Тэма: Горад

План вывучэння тэмы:

1. Заняпад гарадоў у часы ваеннага ліхалецця.
2. Аднаўленне гарадскога жыцця.
3. Гарады ў першай палове XVIII ст. Гандаль у першай палове XVIII ст.
4. Першыя кірмашы.
5. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці.

Мэты:

- ахарактарызаваць становішча гарадоў Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.;
- апісаць гаспадарчае жыццё гарадоў, сістэму кіравання, сацыяльную структуру гарадскога насельніцтва, іх падаткі і павіннасці;
- вызначыць прычыны ўзнікнення мануфактур, іх асаблівасці.

Асноўныя паняцці: кагал, мануфактура, шпалеры.

Спусташальныя войны сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. прывялі да разбурэння і заняпаду калісьці квітнеючых беларускіх гарадоў. Сітуацыя ўскладнялася яшчэ звязанымі з ваеннымі дзеяннямі голадам, эпідэміямі, самаўпраўствам службовых асоб і феадалаў, наступленнем на правы гарадскіх абшчын, умацаваннем у гарадах сваіх юрыдык. Напружанасць назіралася і ў мяшчанскім асяроддзі – паміж заможнымі гараджанамі і беднатой. Вярхоўная ўлада прымала меры па ўпарадкаванні гарадскога жыцця праз палягчэнне падатковага ціску, а таксама ўмацаванне гарадскіх абшчын і абмежаванне свавольства духоўных і свецкіх феадалаў. Становішча гарадскога насельніцтва знайшло адлюстраванне ў пастановах соймаў, універсалах і лістах караля і Вялікага князя і інш. дакументах.



1. Узгадайце, калі горад Менск атрымаў Магдэбургскае права.
2. Растлумачце тэрміны: войт, магістрат, неаселыя людзі.

Карта «Эканоміка Беларусі ў XVIII ст.»

1. Параўнайце жыццё і заняткі жыхароў горада і вёскі.
2. Назавіце найбольш буйныя гандлёвыя гарады Беларусі ў XVIII ст.
3. Пералічыце гарады, дзе былі створаны мануфактуры.

4. Ахарактарызуйце ролю гарадоў як цэнтраў развіцця рамеснай, мануфактурнай вытворчасці і гандлю.

5. Вызначыце асноўныя накірункі спецыялізацыі прамысловасці на беларускіх землях у канцы XVIII ст.

6. Вызначце, якія тавары вывозілі з беларускіх зямель.

Тэма 5. Культура беларускіх зямель у другой палове XVII – першай палове XVIII ст.

Культура Беларусі сярэдзіны XVII – XVIII ст., нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, звязаныя са спусташальнымі войнамі, захавала сваю самабытнасць і мела значныя здабыткі. Вялікім дасягненнем у галіне асветы стала стварэнне і дзейнасць у Рэчы Паспалітай у 1773 г. Адукацыйнай камісіі – першага ў Еўропе Міністэрства адукацыі. Такія ўраджэнцы Беларусі, як Сімяон Полацкі, Казімір Семяновіч, Ілля Капіевіч, узбагацілі сусветную навуку і літаратуру сваімі думкамі і творамі. Агульны стан школьнай сістэмы і выхавання, культурныя каштоўнасці гэтага часу прадстаўлены ў соймавых наказах, лістах грамадскіх дзеячаў, творах дзеячаў культуры.

Тэма: Адукацыя і навука

План вывучэння тэмы:

1. Гістарычныя ўмовы развіцця культуры.
2. Забарона на ўжыванне беларускай мовы ў справаводстве.
3. Праваслаўныя брацтвы і іх дзейнасць.
4. Сістэма адукацыі (каталіцкія, пратэстанцкія, праваслаўныя, уніяцкія школы). Навука.

Мэты:

- ахарактарызаваць развіццё адукацыі і навукі;
- прааналізаваць творчасць дзеячаў навукі і асветы.

Асноўныя паняцці: Адукацыйная камісія, Галоўная школа ВКЛ, Віленскі ўніверсітэт.

У другой палове XVII – першай палове XVIII ст. усталяваліся трывалыя кантакты мясцовага грамадства з культурным і навуковым асяроддзем тагачаснай Заходняй Еўропы. У Рэч Паспалітую запрашаліся вядомыя еўрапейскія архітэктары, мастакі і скульптары. Вельмі частымі былі замежныя вандраванні айчыннай знаці, падчас якіх маладое пакаленне наведвала разнастайныя еўрапейскія навучальныя ўстановы.

У гэты перыяд адукацыя кантралявалася каталіцкай царквой. Яе школы падзяляліся на езуіцкія і піярскія калегіумы. Дзейнічалі таксама кальвінісцкія і брацкія (праваслаўныя) школы. У школах вучыліся толькі хлопчыкі, пераважна шляхецкія дзеці. Дзяўчынкі атрымлівалі хатнюю адукацыю.

Вядучае месца ў навучанні належала ордэну езуітаў. Прымалі ў езуіцкія калегіумы не толькі каталікоў, але і іншых вернікаў (пратэстантаў, праваслаўных), што адпавядала задачы ордэна езуітаў – пашыраць уплыў каталіцтва.

Вучэбны працэс складаўся з пяці класаў. Адукацыя ў калегіумах адпавядала заходнееўрапейскаму ўзору. Увага надавалася вывучэнню лацінскай мовы, старажытнагрэчаскай мовы і літаратуры, рыторыкі, паэтыкі, геаметрыі, астраноміі, філасофіі, музыцы. Вялікае значэнне надавалася ўменню весці дыспуты. Арганізоўваліся тэатральныя пастаноўкі.

Прывілеем караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя езуіцкі калегіум у Вільні быў пераўтвораны ў вышэйшую навучальную ўстанову – акадэмію (універсітэт). Гэтае рашэнне ў 1579 г. зацвердзіў Папа Рымскі. Віленская акадэмія стала першай у ВКЛ вышэйшай навучальнай установай. Спачатку навучанне вялося на філасофскім і багаслоўскім факультэтах, пазней – на прававым і медыцынскім (з 1641 г.).

У школах пры праваслаўных брацтвах (пачалі ствараццa з другой паловы XVI ст.) вывучалі «трывіум»: граматыку, рыторыку, дыялектыку, затым «квадрывіум»: арыфметыку, геаметрыю, астраномію, музыку. Асаблівая ўвага надавалася вывучэнню царкоўна-славянскай мовы. Вучняў набіралі ў асноўным з непрывілеяваных саслоўяў: мяшчан і сялян. У навучальным працэсе выкарыстоўваліся элементы класна-ўрочнай сістэмы.

У першай палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі пашыраюцца піярскія школы (калегіумы). У адрозненне ад езуітаў піяры сваю галоўную задачу бачылі ў навучанні і выхаванні моладзі, а не ў місіянерскай і палітычнай дзейнасці.

У піярскіх калегіумах вывучалі тыя ж прадметы, што і ў езуіцкіх. Але дысцыпліна была менш строгай. Таму гэтыя школы карысталіся большай папулярнасцю ў юнакоў. Вучні збяднелых бацькоў утрымліваліся за кошт ордэна, за што яны павінны былі працаваць на школьнай гаспадарцы.

Пасля заключэння ў 1596 г. Берасцейскай царкоўнай уніі пачалі адкрывацца ўніяцкія школы.

У сярэдзіне XVII – пачатку XVIII ст. па прычыне войнаў і разгрому рэфармацыйнага руху склаліся неспрыяльныя ўмовы для навуковай дзейнасці. Матэматыка і медыцына не атрымалі

значнага развіцця. Тым не менш многія навуковыя адкрыцці паступова прабівалі сабе дарогу, у прыватнасці ў школах.

Выдатнымі дзеячамі навукі і культуры таго часу называюць уніяцкага пісьменніка Яна Дубовіча, картографаў Тамаша Макоўскага і Юзафа Наронскага, навукоўцаў Казіміра Семяновіча і Іллю Капіевіча.



1. Пабудуйце структуру адукацыі ў ВКЛ.
2. Параўнайце працэс навучання ў езуіцкіх, піярскіх, кальвінісцкіх і брацкіх школах.
3. Які характар мелі езуіцкія калегіі?

Карта «Культура Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.»

Вызначце гарады, у якіх былі адкрыты езуіцкія, брацкія, піярскія, кальвінісцкія школы, медыцынскія навучальныя ўстановы, вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Тэма: Літаратура і грамадска-палітычная думка

План вывучэння тэмы:

1. Мясцовае летапісанне.
2. Мемуарыстыка.
3. Палітычная сатыра.
4. Творчасць Сімяона Полацкага.
5. Грамадска-палітычная думка.

Мэты:

- ахарактарызаваць развіццё беларускай літаратуры і грамадска-палітычнай думкі;
- вызначыць асаблівасці развіцця беларускага мастацтва;
- прааналізаваць творчасць дзеячаў культуры Беларусі.

Для літаратуры XVI – пачатку XVII ст. былі ўласцівы сцвярджэнне фізічнай і духоўнай магутнасці чалавека, імкненне да хараства і справядлівасці, цесная сувязь з прыродай, вера ў канчатковую перамогу дабра над злом. Прадстаўленыя ўрыўкі з літаратурных твораў даюць уяўленне пра развіццё літаратуры ў эпоху Адраджэння.

У беларускай літаратуры таго перыяду летапісны жанр саступае месца новым напрамкам: публіцыстыцы, палітычнай сатыры, паэзіі, гісторыка-мемуарнай літаратуры. Пад уплывам

рэфармацыі і контррэфармацыі з'яўляюцца публіцыстычныя творы С. Буднага, В. Цяпінскага, П. Скаргі, І. Пацея, М. Сматрыцкага, Л. Карповіча, братоў Зізаніяў. Адметнымі ўзорамі мемуарнай літаратуры становяцца дыярыушы – свецкія дзённікі. Прыкладам можа служыць «Дзённік» навагрудскага падсудка Ф. Еўлашоўскага (1546–1616), «Дыярыуш» А. Філіповіча (1597(?)–1648), якія ярка апісваюць скандальныя і трагічныя падзеі гісторыі Бацькаўшчыны.

Значны ўплыў на культурныя тэндэнцыі на Беларусі 1569–1795 гг. аказалі рэлігійныя працэсы (рэфармацыя і контррэфармацыя, царкоўная ўнія), пазнейшы эканамічны заняпад і палітычны крызіс.

У другой палове XVII – XVIII ст. мемуарыстыка становіцца шматмоўнай. Вялікую цікавасць выклікаюць уласныя ўспаміны аб шматлікіх падарожжах навагрудскай лекаркі Саламеі Пільштыновай (Русецкай). Да ранняй эпісталярнай спадчыны адносяцца «Допісы» аршанскага старасты Філона Кміты-Чарнабыльскага (1530–1587), у якіх аўтар піша аб пагранічным жыцці, планах Івана IV у адносінах да ВКЛ.

Нельга не адзначыць дзейнасць таленавітага вучонага і публіцыста, грамадска-палітычнага дзеяча Мялеція Сматрыцкага (1577–1633), больш вядомага сваім сучаснікам як пісьменніка-палеміста, аўтара шматлікіх твораў, сярод якіх вылучаецца «Фрынас» (1610), дзе пісьменнік выступае супраць акаталічвання і прыняцця царкоўнай уніі (за выданне гэтага твора ён быў прыгавораны да турэмнага зняволення), а таксама другога пісьменніка-публіцыста, педагога, царкоўнага дзеяча, адметнага прадстаўніка аратарскай прозы Лявонція Карповіча (1580–1620).

З канца XVI ст. у еўрапейскай літаратуры і мастацтве вылучаецца стыль барока, які бярэ сабе на ўзбраенне каталіцкая царква ў барацьбе з рэфармацыйнымі плынямі. Ён характарызуецца кантраснасцю, параднасцю, рухавасцю формы, апеляцыяй да пачуццяў, супярэчлівасцю, метафарычнасцю. У літаратуры гэта адлюстроўваецца ў з'яўленні «высокай» паэзіі, адметным прадстаўніком якой становіцца паэт і драматург, кнігавыдавец, асветнік і грамадскі дзеяч С. Полацкі (1629–1680). Найбольш значнымі яго літаратурнымі дасягненнямі сталі зборнікі паэтычных твораў «Ветроград многоцветный» і «Рифмологион». Новай для беларускай паэзіі стала палітычная сатыра («Прамова Мялешкі», «Ліст да Абуховіча»), якая высвятляла заганы тагачаснасга грамадства.

Работа ў групах.

Прааналізаваць творчасць дзеячаў культуры Беларусі па ўрыўках з іх твораў.

Тэма: Архітэктура і мастацтва

План вывучэння тэмы:

1. Барока ў архітэктуры Беларусі.
2. Віленскае барока. Партрэтны жанр.
3. Батлейка. Школьны тэатр.
4. Царкоўная музыка. Арганная музыка. Капэлы.

Мэты:

- ахарактарызаваць развіццё беларускай архітэктуры і мастацтва;
- вызначыць асаблівасці развіцця беларускага мастацтва;
- прааналізаваць творчасць дзеячаў культуры Беларусі.

Асноўныя паняцці: батлейка, інтэрмедыя, габелен.

Значную ролю ў культурным жыцці беларускага грамадства ў гэты час пачаў адыгрываць тэатр, у прыватнасці батлейка – народны лялечны тэатр, вядомы яшчэ з XVI ст. Яе рэпертуар складаўся з 2 частак – кананічнай і свецкай. Прадстаўленне гэтага своеасаблівага «тэатра аднаго акцёра» складалася з песень, танцаў, дыялогаў і маналогаў. У XVII ст. з развіццём школьнай адукацыі і драматургіі асобую ролю набывае школьны тэатр. У ім ставіліся п'есы як рэлігійнага і гістарычнага зместу, так і інтэрмедыі – кароценькія п'ескі на беларускай ці польскай мове, пантамімы, танцы, што выконваліся паміж дзеямі спектакля. Вядомы 24 дэкламацыі С. Полацкага, напісаныя ім для тэатраў брацкіх школ. Галоўным героем інтэрмедый быў разумны і дасціпны беларускі селянін. У 1787 г. на змену традыцыйнай школьнай інтэрмедыі прыходзяць першыя драмы, напісаныя на беларускай народнай мове – «Камедыя» К. Марашэўскага і «Доктар па прымусу» М. Цяцерскага.

У XVIII ст. адметнай з'явай культуры становіцца прыгонны тэатр, трупа якога складалася пераважна з залежных сялян. Рэпертуар першага з іх – Нясвіжскага – складаўся першапачаткова з 16 п'ес і оперных лібрэта Уршулі Францішкі Радзівіл. У другой палове XVIII ст. з'яўляюцца прыватныя тэатры ў Слоніме, Гародні, Шклове, Ружанах і інш. Пры іх утрымліваліся музычныя капэлы, аркестры. Для падрыхтоўкі

артыстаў оперы і балета ствараліся балетныя школы (у Слоніме, Слуцку). На сто гадоў раней, чым на Захадзе, на Беларусі пачалі скарыстоўваць у афармленні спектакляў павільёны. У 70-ыя гг. XVIII ст. працаваў «плавучы тэатр» на Агінскім канале. Беларускія акцёры складалі аснову труп сталічных тэатраў, у тым ліку Варшаўскага.

У другой палове XVI ст. барочны стыль пачынае ўсталёўвацца ў беларускай архітэктуры. Першы ўзор гэтага стылю – нясвіжскі касцёл езуітаў (архітэктар – італьянец Я.М. Бернардоні (1554–1593)), прататыпам якога стаў рымскі храм Іль Джэзу. Увогуле стыль барока ў беларускай архітэктуры меў некалькі этапаў свайго развіцця.

Карта «Культура Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.»



1. Пералічыце палацава-замкавыя комплексы. Назавіце месцы, дзе яны былі пабудаваны.
2. Пакажыце гарады, дзе існавалі прыгонныя тэатры. Вызначце, якім магнатам яны належалі.
3. Апішыце дзейнасць прыгонных тэатраў.

РАЗДЗЕЛ III. Беларусь у другой палове XVIII ст.

Тэма 6. Знешняя і ўнутраная палітыка Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

Тэма: Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай

План вывучэння тэмы:

1. Умяшальніцтва суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай.
2. Дысідэнцкае пытанне.
3. Барская канфедэрацыя.
4. Першы падзел Рэчы Паспалітай.

Мэты:

- ахарактарызаваць унутрыпалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у другой палове XVII – XVIII ст.;
- вызначыць рысы палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай.

Асноўныя паняцці: палітычны крызіс, «ліберум вета», дысідэнт.

У XVIII ст. Рэч Паспалітая апынулася ў стане глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу. Яе гаспадарчае развіццё засталося недзе на ўзроўні канца XVI ст. Адсутнічала моцная цэнтральная ўлада. Сойм быў недзеяздольны, паралізаваны шляхецкім правам «ліберум вета», што ўрэшце перарасло ва ўсёдазволенасць і ўсеўладдзе шляхецтва. Рэформы 60-ых – пачатку 90-ых гг. XVIII ст., якія маглі вывесці Рэч Паспалітую з тупіку і паставіць на шлях буржуазнага развіцця, ігнараваліся кансерватыўнай магнатэрыяй. Бязладдзе ў краіне «ахоўвалася» Расіяй і Прусіяй пад прыкрыццём клопату пра абарону правоў праваслаўных і пратэстантаў. Прадстаўленыя дакументы – соймавыя і дыпламатычныя матэрыялы, перапіска, гістарычны анекдот – паказваюць тагачаснае становішча федэрацыі і спробы прагрэсіўных палітычных сіл аднавіць моц Рэчы Паспалітай. Вяршыняй іх дзейнасці стала Канстытуцыя 3 мая 1791 г.

1. Вызначце прычыны палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай.
2. Назавіце краіны, якія ініцыіравалі Першы падзел Рэчы Паспалітай.
3. Пры дапамозе карты вызначце, якія тэрыторыі Рэчы Паспалітай атрымалі замежныя краіны ў выніку Першага падзелу Рэчы Паспалітай.

Тэма: Дзяржаўныя рэформы Рэчы Паспалітай

План вывучэння тэмы:

1. «Чатырохгадовы сейм» (1788–1792) і значэнне яго рашэнняў для Беларусі.
2. Канстытуцыя 3 мая 1791 г.
3. Таргавіцкая канфедэрацыя.
4. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

Мэта:

- прааналізаваць Канстытуцыю 3 мая 1791 г.

Асноўныя паняцці: Канстытуцыя 3 мая 1791 г., «Чатырохгадовы сейм».

Надзвычайны сейм павінен быў пачаць работу 19 красавіка 1773 г. у Варшаве. Паслы на яго ад беларуска-літоўскіх зямель абіраліся на павятовых сеймiках 22 сакавіка. У большасці пасольскіх інструкцый утрымлівалася пажаданне не пагаджацца на адлучэнне ад Рэчы Паспалітай яе тэрыторый. Але многія паслы на гэты сейм былі абраны ў сітуацыі непрыкрытага ціску з боку акупацыйнага расійскага войска, подкупу і шантажу з боку пасланнікаў Расіі, Прусіі і Аўстрыі.

Па запланаваным у Пецярбурзе сцэнарыі перад пачаткам работы сейма павінна была ўтварыцца канфедэрацыя з ліку лаяльных да падзелу паслоў і сенатараў на чале з кухмістрам каронным А. Панінскім. Гэта давала магчымасць прымаць рашэнні на сейме ў выпадку далучэння яго да канфедэрацыі большасцю галасоў. Так, магчыма, першы раз у гісторыі свайго існавання права «ліберум вета» магло адыграць станоўчую ролю ў жыцці дзяржавы. Але праз сеймавую канфедэрацыю, якая і ўтварылася 16 красавіка, яго дзеянне было заблакіравана.

Расійскі пасол Штакельберг, прускі пасол Бенуа і аўстрыйскі пасол Рэвітцкі былі ўпэўнены ў поспеху. Але ў дзень

адкрыцця з рашучым пратэстам супраць абрання маршалкам сейма А. Панінскага як непрыкрытага расійскага агента выступіла невялікая група паслоў. На чале яе былі паслы ад Наваградскага ваяводства Тадэвуш Рэйтан і Самуэль Корсак, ад Менска – Станіслаў Багушэвіч. Знешне пратэст насіў фармальны характар. Яны пратэставалі супраць спробы пераўтварыць сейм у канфедэрацыю, хаця пра гэта нічога не гаварылася ў перадсеймавых каралеўскіх універсалах, накіраваных на павятовыя пасольскія сеймікі. Па законе, гэты сейм павінен быў праводзіцца ў Беларусі, у Гародні (з 1673 г. кожны трэці сейм Рэчы Паспалітай павінен быў праводзіцца там), а не ў Варшаве. На самай жа справе кожны з прысутных, а асабліва паслы трох дзяржаў, разумелі: справа ідзе аб зрыве сейма і недапушчэнні зацвярджэння падзелу.

29 верасня 1773 г. «дэлегацыя» падпісала трактаты, тым самым адмовіўшыся ад насільна адабраных зямель, пасля чаго на наступны дзень, 30 верасня, іх зацвердзіў кароль і прыняў сейм.

Такім чынам была выканана галоўная задача, дзеля якой і склікаўся сейм у 1773 г. Але другая задача – выпрацоўка мерапрыемстваў, якія б маглі «супакоіць» Рэч Паспалітую, засталася нявыкананай. У сувязі з неабходнасцю падрыхтоўкі і прыняцця некаторых праектаў рэформаў дзяржаўнага ладу і іншых рашэнняў сейм некалькі разоў працягваў сваю работу.

«Дэлегацыя» зацвердзіла і дапоўніла «кардынальныя правы» 1768 г. Аднак тыя іх артыкулы, якія тычыліся дысідэнтаў, былі зменены ў бок абмежавання. У прыватнасці, дысідэнты зноў былі пазбаўлены права атрымліваць сенатарскія і міністэрскія пасады. На сеймах у якасці паслоў дазвалялася быць толькі тром дысідэнтам: двум ад Польшчы і аднаму з ВКЛ.

Расійскай імперыі і польска-ліцвінскаму магнацтву было выгадным устанаўленне ў Рэчы Паспалітай такога ладу, які б да пэўнай ступені звязваў караля і рабіў залежным яго як ад Кацярыны II, так і ад феадальнай алігархіі. Антыкаралеўская апазіцыя і расійскі пасол патрабавалі ўтварэння пры каралю Пастаяннай Рады, якая б выконвала функцыі цэнтральнай выканаўчай улады. У сакавіку 1775 г. у выніку працяглага абмеркавання было прынята рашэнне аб утварэнні Пастаяннай Рады. Яна павінна была складацца з 18 сенатараў і 18 паслоў, якіх выбіралі на два гады, з падзелам на 5 дэпартаментаў: замежных спраў, паліцыі, вайсковага, справядлівасці і скарбу. На чале дэпартаментаў павінны былі стаяць адпаведныя міністры. Старшынёй Рады прызнаваўся кароль. Пры гэтым яго паўнамоцтвы, напрыклад у прызначэнні на вызначаныя пасады,

абмяжоўваліся: кароль мог выбіраць аднаго з трох прапанаваных кандыдатаў.

Рада была адказнаю перад сеймам і трымала справаздачу перад ім праз кожныя два гады. Нягледзячы на першапачатковыя планы яе праекціроўшчыкаў і дзякуючы старанням Станіслава Аўгуста, Пастаянная Рада паступова станавілася дзейсным органам выканаўчай улады. Тым не менш яе востра крытыкавалі праціўнікі караля за праявы «манаршага абсалютызму», а для патрыётаў Рада была сімвалам расійскага ўціску – «пастаяннай здрадай».

Пачатак дзейнасці сейма. Сейм распачаў сваю работу 7 кастрычніка 1788 г. Паколькі большасць паслоў і ад Польшчы, і ад Вялікага Княства Літоўскага жадалі, каб сейм прыняў рашэнне аб павелічэнні колькасці войска, то перад яго адкрыццём была ўтворана канфедэрацыя, што дазваляла прымаць рашэнні большасцю галасоў. Было абвешчана, як звычайна, пра неабходнасць утрымаць панаванне каталіцкай веры, а таксама цэласнасць дзяржавы, шляхецкага «рэспубліканскага» ладу пры захаванні існуючых улад, павелічэнні войска, падаткаў і ўвядзенні змен, якія б палепшылі ўнутранае становішча дзяржавы. У «пасольскай ізбе» сейма ўтварылася шматлікая групоўка так званых патрыётаў, якія перш за ўсё хацелі разарваць путы залежнасці ад Расіі і разам з тым ажыццявіць рэформы. Сярод яе кіраўнікоў былі Г. Калантай, І. Патоцкі, С. Малахоўскі і іншыя. У першую чаргу планавалася ліквідаваць «ліберум вета», увесці спадчынны трон, адмяніць элекцыю (выбары) манарха. Важным патрабаваннем было ўстанаўленне так званага гатовага сейма. Ён павінен быў выбірацца не на адну сесію, а на пэўны тэрмін (2 гады) і мог бы склікацца пры неабходнасці без адкладу і новых выбараў.

Перавага на сейме «патрыятычнай», ці «прагрэсіўнай», партыі ўзмацнілася пасля з'яўлення «пускай ноты». У ёй пускі пасланнік ад імя берлінскага двара заявіў пратэст супраць праекта саюзу Рэчы Паспалітай з Расіяй і прапанаваў узамен заключэнне саюзу з Прусіяй. Уражанне ад гэтай «ноты» было велізарным. Першы раз афіцыйна адна з суседак Рэчы Паспалітай, удзельніца Першага падзелу, так рашуча выказалася супраць Расійскай імперыі. Аднак сапраўдныя намеры Прусіі былі накіраваны на забеспячэнне ўласных інтарэсаў коштам тэрытарыяльных саступак на сваю карысць з боку Рэчы Паспалітай.

У першай пастанове сейма было прызнана неабходным павялічыць колькасць рэгулярнага войска да 100 тыс. чалавек. У сувязі з гэтым па прапанове «патрыётаў» было прынята рашэнне і

аб скасаванні «вайсковага дэпартамента» Пастаяннай Рады. «Патрыёты» запэўнівалі, што нельга перадаваць уладу над такім вялікім войскам дэпартаменту ўстановы, якая калісьці была навязана сілай звонку і дагэтуль заставалася пад знешнім уплывам. Замест «вайсковага дэпартамента» ўтваралася «вайсковая камісія», агульная для ВКЛ і Польшчы. За гэту прапанову прагаласавалі 180 з 263 прысутных на сейме, якія бралі ўдзел у галасаванні. Гэта быў прамы выклік Расіі яе гарантыйнаму апякунству. Каб замацаваць антырасійскую накіраванасць у рабоце сейма, прускі кароль Фрыдрых Вільгельм накіраваў на імя сеймавых маршалкаў К. Н. Сапегі (ад ВКЛ) і К. Малахоўскага (ад Польшчы) спецыяльную дэкларацыю. У ёй было заяўлена, што Прусія лічыць сябе абавязанай гарантаваць незалежнасць Рэчы Паспалітай і не прызнае за сабою права ўмяшальніцтва ў яе ўнутраныя справы. Наадварот, Прусія лічыць сябе абавязанай абараняць поўную свабоду Рэчы Паспалітай у самастойным рашэнні сваіх унутраных праблем. Такім чынам, Прусія замацоўвала ініцыятыву краіны – гаранткі будучых рэформаў у суседняй дзяржаве. Пераарыентацыя на супрацоўніцтва з Прусіяй завяршылася тым, што 29 сакавіка 1790 г. сейм ухваліў падпісанне абарончага саюзу з ёю. Прычым у адрозненне ад Расіі сама Прусія нібыта была зацікаўлена не ў захаванні старога, аджылага, а ў развіцці новага і перадавога ў жыцці Рэчы Паспалітай.

Пасля прыняцця рашэння аб значным павелічэнні колькасці войска перад сеймам паўстала пытанне: дзе ўзяць сродкі на яго ўтрыманне? Было прынята рашэнне аб павышэнні некаторых існуючых падаткаў і ўвядзенні новых. Так, павялічылася ў два разы арэндная плата («кварта») з трымальнікаў старостваў, а з былых езуіцкіх уладанняў («эмфітэз») – у 3,5 раза. Уводзіўся падатак у памеры 10 % (так званая вечная ахвяра) з прыватных шляхецкіх уладанняў, а з духоўных – у памеры 20 % ад гадавога прыбытку. З запланаванай сумы ў 40 млн злотых, неабходных на ўтрыманне войска, у рэальнасці ўдалося сабраць толькі каля паловы. У сувязі з гэтым было вырашана знізіць колькасць войска на 65 тыс. чалавек.

Адной з самых галоўных задач сейма стала рэформа дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. З гэтаю мэтаю на фоне пагаднення караля Станіслава Аўгуста з «патрыётамі» ў верасні 1789 г. на сейме вылучылі з ліку паслоў і сенатараў спецыяльную «дэпутацыю для рэформаў кіравання» пад старшынствам біскупа Красінскага. Адначасова ішоў распад кансерватыўнай магнац-

кай групоўкі на сейме. Некаторыя пакідалі Варшаву, а С. Жэвускі і Ш. Патоцкі ўвогуле выехалі за мяжу.

У хуткім часе была створана і «дэпутацыя» па абмеркаванні мяшчанскага пытання. Штуршком для абмеркавання становішча мяшчан у дзяржаве з'явіўся з'езд упаўнаважаных ад мяшчанскага стану, арганізаваны прэзідэнтам Варшавы Дэкертам. Працэсія прадстаўнікоў 141 горада ВКЛ і Польшчы, апранутых у чорнае адзенне, накіравалася ў каралеўскі замак і ўручыла сейму спецыяльную петыцыю. У ёй прадстаўнікі заможнага мяшчанства дамагаліся права набыцця зямельных уладанняў, доступу да свецкіх і духоўных пасад, права дэлегавання сваіх прадстаўнікоў на сейм. «Чорная працэсія» выклікала вялікае ўражанне паслоў. Яна сведчыла аб пранікненні ў Рэч Паспалітую ідэй французскай рэвалюцыі і пачатку кансалідацыі «трэцяга саслоўя».

Карта «Першы падзел Рэчы Паспалітай»



1. Вызначыце, якія землі згубіла Рэч Паспалітая ў выніку Першага падзелу.
2. Якія землі адышлі да а) Расіі; б) Аўстрыі; в) Прусіі?

Карта «Другі падзел Рэчы Паспалітай»

1. Вызначыце, якія землі згубіла Рэч Паспалітая ў выніку Другога падзелу.
2. У чым заключаецца гістарычнае значэнне Канстытуцыі 3 мая 1974 г.? Пералічыце асноўныя палажэнні Канстытуцыі.

Тэма: Паўстанне 1794 г. і яго падзеі ў Беларусі. Канец Рэчы Паспалітай

План вывучэння тэмы:

1. Падрыхтоўка, пачатак і мэты паўстання.
2. Ход паўстання. Асаблівасці паўстання ў Беларусі і Літве.
3. Паражэнне паўстання.
4. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.

Мэты:

- вызначыць прычыны, сацыяльны склад удзельнікаў, асноўныя вынікі і значэнне паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі;
- апісаць падзеі паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі.

Асноўныя паняцці: паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, Найвышэйшая літоўская рада, Паланецкі ўніверсал, касінер.

Глыбокі сацыяльна-палітычны крызіс Рэчы Паспалітай, які ахапіў краіну, пачынаючы з 60-ых гг. XVII ст., спалучаўся з умяшальніцтвам у яе ўнутраныя справы замежных дзяржаў – Прусіі, Аўстрыі, Расіі. Спробы знайсці выхад з крызісу, якія былі зроблены ў другой палове 60-ых гг. XVIII ст. і ў час працы 4-гадовага сейма 1788–1792 гг., былі спынены сілай і прывялі да Першага і Другога падзелаў дзяржавы. Для патрыётаў Рэчы Паспалітай заставаўся адзіны выхад, каб спыніць распад краіны, – узняць паўстанне, вярнуць страчаныя тэрыторыі, прадоўжыць рэформы. На ідэалогію паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі вялікі ўплыў аказалі ідэі французскай буржуазнай рэвалюцыі 1789 г. Так, напрыклад, на тэрыторыі ВКЛ галоўным лозунгам паўстання быў – «Воля, роўнасць, незалежнасць». Станоўчым было таксама імкненне кіраўнікоў паўстання далучыць да яго гараджан і сялянства. Аднак неспрыяльная міжнародная сітуацыя, пралікі кіраўніцтва паўстанцкім рухам, недахоп сіл прывялі да яго паражэння. Трагічным вынікам падзей 1794 г. стаў апошні, Трэці, падзел Рэчы Паспалітай, які прывёў да яе ліквідацыі.

? Вызначце асаблівасці паўстання на тэрыторыі Польшчы і на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Карта «Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай (1795)»

1. Карыстаючыся картай, раскрыйце ход паўстання.
2. Вызначце, якія землі Рэчы Паспалітай атрымалі Расія, Прусія і Аўстрыя.

Тэма: Эканамічная стабілізацыя ў другой палове XVIII ст.

План вывучэння тэмы:

1. Феадальная гаспадарка.
2. Эканамічныя рэформы ў другой палове 60-ых гг. XVIII ст.
3. Аграрная рэформа А. Тызенгаўза.
4. Стан гарадоў. Магнацкае прадпрымальніцтва.

Мэта:

- вызначыць прычыны эканамічнай стабілізацыі ў ВКЛ, асаблівасці рэформаў на беларускіх землях.

У другой палове XVIII ст. назіралася ажыўленне ў развіцці сельскай гаспадаркі. Паказчыкамі яе росту сталі пашырэнне земляробчых заняткаў сялян за кошт павелічэння ворнай зямлі, павелічэнне статка цяглай жывёлы, пашырэнне сялянскага гандлю. Але па меры ўмацавання сялянскай гаспадаркі раслі павіннасці, якія спаганяліся з сялян за карыстанне зямельным надзелам. Захоўвалася і сацыяльная безабароннасць селяніна, якая заключалася ў поўнай яго залежнасці ад уладальніка зямлі.

Пра сялянскае жыццё таго часу сведчаць розныя крыніцы: інвентары, скаргі, матэрыялы дзяржаўнага і феадальна-гаспадарчага справаводства.

? Прааналізуйце становішча сялян у другой палове XVIII ст.: павіннасці, ільготы і г.д.

Тэма 7. Культура эпохі Асветніцтва

Тэма: Адукацыя і навука ў эпоху Асветніцтва

План вывучэння тэмы:

1. Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі.
2. Школьная рэформа.
3. Стварэнне і дзейнасць Адукацыйнай камісіі.

4. Арганізацыя першых прафесійных навучальных устаноў. Развіццё навукі.

Мэты:

- ахарактарызаваць развіццё адукацыі і навукі;
- прааналізаваць творчасць дзеячаў навукі і асветы.

Асноўныя паняцці: Адукацыйная камісія, Галоўная школа ВКЛ, Віленскі ўніверсітэт.

Асветніцтва – ідэйна-палітычны кірунак грамадскай думкі эпохі пераходу ад феадалізму да капіталізму, прадстаўнікі якога імкнуліся пераадолець недахопы існуючага грамадства, рэфармаваць яго сацыяльны і дзяржаўны лад, палітыку, быт, норавы шляхам распаўсюджвання навуковых ведаў, ідэй дабра, справядлівасці, гуманізму і г.д. Усталяванню Асветніцтва спрыялі навуковыя адкрыцці ў прыродазнаўстве і дасягненні гуманітарных ведаў. У руках буржуазіі Асветніцтва стала ідэйнай зброяй у барацьбе супраць феадалізму, абсалютызму, царкоўнага светапогляду, схаластыкі, цемрашальства.

У кожнай краіне, у кожнага народа Асветніцтва мела свае асаблівасці і храналогію, адпаведныя ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства і грамадскіх адносін. Перш за ўсё Асветніцтва праявілася ў Галандыі, дзе ў XVI ст. перамагла першая ў свеце буржуазная рэвалюцыя. У. Акоста, Г. Гроцый, Б. Спіноза (XVII ст.) патрабавалі вызваліць навуку ад кантролю царквы. У Англіі пасля перамогі буржуазнай рэвалюцыі XVII ст. прадстаўнікі Асветніцтва Дж. Локі, А. Сміт, даказваючы неабходнасць панавання прыватнай уласнасці, канкурэнцыі, аховы правоў і свабод чалавека, талерантнасці, паклалі пачатак буржуазнаму лібералізму.

Распаўсюджванне ідэй Асветніцтва ў ВКЛ пачалося ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст. Асветніцкая ідэалогія фарміравалася тут на мясцовай сацыяльна-эканамічнай і тэарэтычнай аснове, разам з тым была цесна звязана з асветніцкай думкай краін Заходняй Еўропы: Польшчы і Расіі. Ідэйныя вытокі Асветніцтва ў ВКЛ бяруць пачатак ад філасофскай і грамадска-палітычнай думкі эпохі Адраджэння і Рэфармацыі, а таксама прац і дзейнасці прагрэсіўных беларускіх мысліцеляў канца XVII – пачатку XVIII ст. (К. Лышчынскага, С. Полацкага, І. Капіевіча). Значны ўплыў на распаўсюджванне ідэй Асветніцтва ў ВКЛ зрабілі творы французскіх і нямецкіх мысліцеляў XVIII ст.

Тут была шырока вядома «Энцыклапедыя, або Тлумачальны слоўнік навук, мастацтваў і рамёстваў», якая выдавалася пад рэдакцыяй Д'Апамбера і Дзідро ў 1751–1780 гг. у Парыжы, а таксама працы Ш.Л. Мантэск'ё, Вальтэра і іншых як на мове арыгінала, так і ў перакладзе на польскую мову, а таксама творы Лесінга, І.Г. Гердэра.

Для пашырэння ідэй Асветніцтва шмат зрабіла Адукацыйная камісія. Яна ажыццявіла радыкальную рэформу школ ВКЛ, а таксама Віленскага ўніверсітэта ў духу перадавых ідэй асветнікаў XVIII ст. Адукацыя набыла свецкі характар, выкладанне вызвалілася ад уплыву схаластыкі і тэалогіі, значная ўвага аддавалася вывучэнню прыродазнаўчых і фізіка-матэматычных навук. Імкнучыся зрабіць свае ідэі здабыткам шырокіх дэмакратычных слаёў грамадства, асветнікі звярталіся да сучаснікаў праз газеты і часопісы, якія пачалі з'яўляцца ў той час у ВКЛ, праз друкаваныя кнігі, якіх станавілася ўсё больш. Дзякуючы гэтаму ідэі Асветніцтва набылі шырокае распаўсюджанне ў грамадстве і знайшлі глыбокае адлюстраванне ў філасофіі, грамадска-палітычнай і педагагічнай думцы, мастацкай літаратуры.

У адрозненне ад іншых камісій, напрыклад вайсковай ці скарбовай, Адукацыйная камісія дзейнічала аўтаномна і не падпарадкоўвалася Пастаяннай Радзе, а толькі каралю. Яна складалася з васьмі асоб, абіраемых на шэсць гадоў. Адукацыйная камісія стала, па сутнасці, першым Міністэрствам асветы ў Еўропе.

Спецыфічнай рысай Асветніцтва ў ВКЛ была яго арыентацыя на тэрміновае рашэнне сялянскай праблемы. Асветнікі выступалі з рэзкай крытыкай феадальна-прыгонніцкіх адносін, патрабавалі паляпшэння становішча прыгонных сялян. Сярод асветнікаў асаблівай папулярнасцю карыстаўся фізіякратызм, прыхільнікі якога (І. Храптовіч, А. Тызенгаўз) выказвалі розныя праекты скасавання прыгонніцтва, даказвалі неабходнасць капіталістычнага (фермерскага) спосабу вядзення сельскай гаспадаркі, заснаванага на прыватнай уласнасці на зямлю і наёмнай працы.

Заканамерны працяг ідэалогія Асветніцтва атрымала ў Канстытуцыі 3 мая 1791 г. і паўстанні 1794 г. (Паланецкі ўніверсал). Асветнікі (Міхал Клеафас Агінскі) прапанавалі таксама ідэю адраджэння беларускай дзяржаўнасці, страчанай у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай.

Прысутнасць на тэрыторыі Беларусі распушчанага ў 1773 г. ва ўсім свеце ордэна езуітаў, іх навучальных устаноў з цэнтрам у Полацку, прыдалі беларускаму Асветніцтву вельмі моцны антыклерыкальны характар. Цэнтрам асветніцкіх ідэй у Беларусі

быў Віленскі ўніверсітэт, а цэнтрам клерыкальнай думкі – Полацкая езуіцкая акадэмія. Існаванне на тэрыторыі Беларусі дзвюх процілеглых тэарэтычных навучальных устаноў прывяло да таго, што паміж імі пастаянна вялася ідэйна-тэарэтычная палеміка на старонках перыядычных выданняў, у якой удзельнічалі найбольш вядомыя прадстаўнікі Асветніцтва. Асветніцкая ідэалогія зрабіла вялікі ўплыў на фарміраванне перадавой нацыянальнай грамадскай думкі.



1. Ахарактарызуйце асноўныя асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі.
2. Вызначце асноўныя накірункі школьнай рэформы. Параўнайце развіццё школьнай адукацыі гэтага перыяду і напачатку стагоддзя.
3. Ахарактарызуйце асноўныя накірункі дзейнасці Адукацыйнай камісіі.
4. Ахарактарызуйце развіццё навукі ў другой палове XVIII ст.

Тэма: Літаратура і мастацтва

План вывучэння тэмы:

1. Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў другой палове XVIII ст.
2. Друк.
3. Палацава-замкавае будаўніцтва.
4. Выяўленчае мастацтва.
5. Віленская мастацкая школа.
6. Музычнае мастацтва.

Мэты:

- ахарактарызаваць развіццё беларускай літаратуры і мастацтва;
- вызначыць асаблівасці развіцця беларускага мастацтва;
- прааналізаваць творчасць дзеячаў культуры Беларусі.

Асноўныя паняцці: батлейка, інтэрмедыя, габелен.

У другой палове XVIII ст. у Беларусі актыўна распаўсюджваліся рацыяналістычныя ідэі Асветніцтва, якія ахоплівалі розныя сферы – грамадска-палітычную і філасоф-

скую думкі, мастацтва, літаратуру. Вялікую цікавасць выклікала тут творчасць заходнееўрапейскіх, польскіх, рускіх асветнікаў. Так, творы французскіх аўтараў, надрукаваныя ў польскіх часопісах, чыталі ў Менску і Навагрудку. У Клімавіцкім павятовым вучылішчы меліся поўны камплект энцыклапедыі Д. Дзідро, розныя выданні Ф. М. Вальтэра, Ж. Ж. Русо. Яны знаёмілі чытачоў з вальнадумствам, атэізмам і матэрыялізмам, насуперак сярэднявечнай схаластыцы неслі рацыяналізм і прыродазнаўчыя веды.

Сугучнымі з гістарычнымі рэаліямі (эканамічнае ажыўленне, настойлівыя пошукі выйсця з зацяжнога крызісу, рэформы ў грамадскай думцы) былі ідэі польскіх мысліцеляў С. Канарскага, Г. Калантая і іншых.

У апошняй чвэрці XVIII ст. усё больш пашыраліся прынцыпы, на якіх будавалася руская асвета. Творамі А. Радзішчава, М. Ламаносава, Я. Казельскага ўкамплектоўваліся мясцовыя бібліятэкі народных вучылішчаў. Дадзеныя аўтары знаходзілі сваіх прыхільнікаў і паслядоўнікаў на беларусіх землях: К. Нарбут, М. Пачобут-Адляніцкі, М. Карповіч, С. Маймон і іншыя ў сваіх творах, многія з якіх межавалі з публіцыстыкай, мастацкай прозай, сцвярджалі «прыродную» роўнасць усіх людзей, выступалі за рэформы, асуджалі бесчалавечнасць. Нягледзячы на пэўную абмежаванасць поглядаў, кожны з іх па-свойму садзейнічаў пашырэнню асветніцкіх ідэй, увасабленню новага чалавека – грамадзяніна і патрыёта.

У XVIII ст. складаны і ў той жа час поўны надзеі на будучыню перыяд перажывала беларуская літаратура. Каталіцкая экспансія і паланізацыя мясцовых культурных слаёў насельніцтва сталі прычынай таго, што беларуская мова з другой паловы XVII ст. пачала выцясняцца з літаратурнага ўжытку. Выведзеная з афіцыйнага ўжывання, пазбаўленая сваёй нацыянальнай моўнай асновы, яна ў XVIII ст. пачала фальклярызавацца. Тым не менш новыя мастацкія формы і ідэі неслі творы тагачасных пісьменнікаў, ураджэнцаў Беларусі, якія пісалі і друкаваліся на іншых мовах, пераважна польскай: Ю. Нямцэвіча і А. Нарушэвіча (пачынальніка польскага класіцызму), Ф. Князьніна, які стаяў каля вытокаў польскага сентыменталізму, драматурга і публіцыста Ф. Багамольца, пісьменніка і вучонага-славіста С. Богуша-Сестранцэвіча, вядучага прадстаўніка польскага сентыменталізму Ф. Карпінскага і іншых.

Польская, лацінская, стараславянская, французская, а з 70-ых гг. руская і іншыя мовы адлюстроўвалі літаратурнае

шматгалоссе беларускага краю. І толькі ўласна беларуская літаратура знаходзілася на ўзроўні «плебейскай» – рукапіснай і ананімнай. Беларускія творы займалі ў XVIII ст. яшчэ меншае месца, чым у папярэднія часы.

Асноўнай літаратурнай мовай тагачаснай Беларусі была польская – дзяржаўная мова Рэчы Паспалітай. Часта ў адпаведнасці з «моўным раздваеннем» у польскамоўныя творы ўкраплялася беларуская гаворка. На ёй, як правіла, размаўлялі персанажы, якія прадстаўлялі «просты люд». Творы, народжаныя на беларускіх землях, былі насычаны адценнямі мясцовай рэчаіснасці і зразумелымі, і распаўсюджваліся не толькі сярод шляхты, але і сялянства. Менавіта яно заставалася прадаўжальнікам лепшых народных традыцый, несучы іх у творах вуснай паэтычнай творчасці, іншых формах, якія сталі жыватворнай глебай для нараджэння новай беларускай літаратуры.

Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў другой палове XVIII ст. Глыбінныя працэсы, звязаныя з абміршчэннем і дэмакратызацыяй беларускай літаратуры, выклікалі яе жанрава-відавое абнаўленне. У прозе, як і ў папярэдні час, пераважалі парадыйна-сатырычныя творы, дзе разам з рэлігійным вальнадумствам і антыклерыкалізмам спалучылася крытыка тых ці іншых рыс тагачаснага грамадства («Прамова русіна», «Другая прамова русіна» і інш.). У 50–60-ыя гг. XVIII ст. у Жыровіцкай калегіі ўзніклі польска-беларускія арацыі, вытрыманыя ў духу новых асветніцкіх прынцыпаў.

Дамінуючымі жанрамі ў другой палове XVIII ст. сталі паэзія і драматургія. Народна-паэтычная творчасць, дзе здаўна бытавалі жартоўныя творы, сатырычныя песні, казкі, анекдоты і інш., уздзейнічала на развіццё ў гэты час бурлескнай і парадыйнай вершаванай паэзіі. Строга вытрыманыя ў рэлігійным тоне калядныя і велікодныя песні дапаўняліся жартоўнымі вершамі. Праз увядзенне свецкіх элементаў у творы рэлігійнага зместу аўтары ажыўлялі тэматыку, прызвычайвалі яе да рэчаіснасці, звязвалі з народным жыццём і побытам. Прыкладам таму з'яўляецца калядны верш «У Віфлееме, доме ўбогім». У выніку пераасэнсавання вядомых сюжэтаў з'яўляліся творы, у якіх захаваліся толькі традыцыйныя біблейскія імёны, але якія былі цалкам пазбаўлены рэлігійнага зместу. У такія творы ўводзілася шмат элементаў гутарковай мовы. Так, у травесційным «Уваскрэсенні Хрыстовым» біблейскія персанажы нагадвалі простых людзей з чалавечымі недахопамі, слабасцямі. Элементы камізму дасягаюцца шляхам спалучэння высокіх слоў малітвы з будзённым зместам у калядцы «Таго дня вельмі слаўнога». Бурлескная паэзія адыграла станоўчую ролю ў

станаўленні беларускай нацыянальнай літаратуры, бо менавіта яна ўвяла ў яе вобразы і сцэны з жыцця народа і тым самым злучыла барочныя і класіцысцкія традыцыі з фальклорнымі.

Пра даволі высокі ўзровень тагачаснай грамадскай і эстэтычнай думкі сведчаць творы сатырычна-палітычнай накіраванасці. Аб'ектамі сатыры станавіліся падзеі вялікай еўрапейскай палітыкі («Указ гарачы», «Праект», «Як расплакаўся что пруською король», «Разгавор імператрыцы з Інгельштромам»). Аўтарства іх невядома, але па моўных асаблівасцях можна меркаваць, што аўтар твора – ураджэнец беларускіх зямель.

Найбольшым дасягненнем палітычнай паэзіі другой паловы XVIII ст. можна назваць «Песню беларускіх жаўнераў 1794 г.», якая па сваёй эстэтычнай сістэме і мове належыць да новай літаратуры. Твор з'явіўся першым у беларускай паэзіі непасрэдным зваротам да народных мас «узяць у рукі косы ды янчаркі», выступіць супраць прыгнятальнікаў.

Рысы старой і новай беларускай літаратуры своеасабліва спалучыліся ў «Камедыі» (1787) прафесара рыторыкі і паэтыкі Забельскай калегіі К. Марашэўскага. Рэалістычнае адлюстраванне ўмоў жыцця, сацыяльнага становішча сялянства і ў рэшце рэшт каларытная, па-народнаму вобразная мова яе галоўнага персанажа Дзёмкі ставяць твор К. Марашэўскага ў шэраг найлепшых здабыткаў беларускай драматургіі.

Пачэснае месца ў літаратурным жыцці Беларусі другой паловы XVIII ст. заняла польска-беларуская пераробка камедыі Ж. Б. Мальера, камедыя выкладчыка той жа Забельскай калегіі М. Цяцерскага «Доктар па прымусу». Нягледзячы на тое што камедыя напісана ў асноўным па-польску, беларуская яе частка з'явілася таленавіта напісаным у цэлым самастойным і арыгінальным творам. Мальераўскі сюжэт быў напоўнены беларускім каларытам, а герой-француз ва ўсім нагадваў мясцовых збяднелых шляхціцаў.

Лепшыя паэтычныя і драматычныя творы другой паловы XVIII ст. сведчаць, што, нягледзячы на неспрыяльныя гістарычныя ўмовы, зацяжны крызіс беларускай літаратуры ва ўмовах знаходжання Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай паступова, пад плённым уплывам ідэй Асветніцтва, пераадольваўся. Новыя эстэтычныя вартасці, творчае выкарыстанне беларускага фальклору, станаўленне новых свецкіх дэмакратычных пачаткаў, звяртанне да жывой народнай мовы закладалі асновы для яе ажыўлення ў наступным, XIX, ст.

Кнігадрукаванне. Пад уздзеяннем асветніцкіх ідэй развівалася друкарска-выдавецкая справа. У другой палове XVIII ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі існавалі 12 друкарняў –

па тры ў Гародні і Магілёве, адной – у Менску, Нясвіжы, Пінску, Полацку, Слоніме і Шклове.

Беларуская мова над націскам каталіцкага ўплыву і палітыкі паланізацыі ў канцы XVII – XVIII ст. пачала страчваць свае пазіцыі ў дзяржаўнай сферы, што вяло да заняпаду беларускай пісьмовай літаратуры і кнігадрукавання. Кнігі ў другой палове XVIII ст. выдаваліся на стараславянскай, польскай, лацінскай, французскай, нямецкай, яўрэйскай і ў канцы стагоддзя – на рускай мовах.

У прадукцыі друкарняў усё большую ўдзельную вагу ў параўнанні з часамі Контррэфармацыі займала свецкая літаратура (у той час яна складала 50 % усіх выданняў). Найбольш высокімі тыражамі – 7000 экзэмпляраў – выдавалася вучэбная літаратура (буквары, граматыкі, слоўнікі).

Лідэрам па колькасці выданняў з'яўлялася Гародзенская каралеўская друкарня, якая працавала ў 1775–1796 гг. Асновай яе паслужыла друкарня Віленскай езуіцкай акадэміі, перавезеная ў Гародню падскарбіем Літоўскім А. Тызенгаўзам пасля скасавання ордэна езуітаў. У друкарні працавалі каля 30 чалавек, мелася ўласная майстэрня для адліўкі літар, выданні вызначаліся высокай якасцю друку, паперы (яна завозілася ў асноўным з Прусіі), мастацкага афармлення.

Навуковыя адкрыцці ў прыродазнаўстве, дасягненні ў галіне гуманітарных ведаў непасрэдным чынам паўплывалі і на тэматыку выданняў. У Гародзенскай друкарні былі выдадзены «Флора Літвы» французскага натураліста, вучонага з еўрапейскім імем Ж. Э. Жылібера (1781), «Кароткі збор карфагенскай і егіпецкай гісторыі» Г. Барэцкага (1776), творы вядучых пісьменнікаў XVIII ст.: «Апісанне падарожжа з Варшавы да Білгарая» І. Красіцкага (1783), «Вяртанне з Варшавы ў вёску» Ф. Карпінскага (1784), «Авантура кавалера па імені Фартунат, асобы нешчаслівай» І. Міцкевіча (1782) і іншых. Сярод перакладаў на польскую мову выйшлі вальтэраўскі «Задзіг» (1776), мальераўскі «Доктар па прымусу» (1783). Акрамя мноства афіцыйных дакументаў, у Гародзенскай друкарні пабачылі свет каля 100 кніг.

Цікавай з'явай у тагачасным культурным жыцці Беларусі былі польска-русінскія «Гродзенскія гаспадарчыя календары», якія друкарня выдавала штогод. Гэты від выданняў падрыхтаваў не толькі глебу для перыядычнага друку, але і чытачоў будучых газет. Гродзенскія календары выходзілі да канца XVIII ст. часам тыражом да 8 тыс. экзэмпляраў. Яны ўтрымлівалі палітычныя звесткі, карысныя гаспадарчыя, медыцынскія, кулінарныя і касметычныя парады, факты з мясцовага жыцця,

артыкулы аб адкрыццях у механіцы, астраноміі, геаграфіі, фізіцы, высмейвалі шарлатанства. Іх складальнікі выступалі супраць сярэднявечнага цемрашальства і розных забабонаў. Акрамя Гародні, «кніжныя календары» ў 80–90-ыя гг. XVIII ст. выдаваліся на польскай мове ў Магілёве і Полацку.

На Гародзеншчыне ў маі 1776 г. пабачыла свет першае перыядычнае выданне на тэрыторыі сучаснай Беларусі – «Газета Гродзенска». На дзвюх яе старонках фарматам 20 х 15 см на польскай мове змяшчаліся артыкулы пра найбольш значныя падзеі ў Рэчы Паспалітай, Расіі, Заходняй Еўропе, асвятлялася мясцовае жыццё, друкаваліся аб'явы і паведамленні. Газета спраўна выконвала сваю асноўную функцыю – прадстаўленне аператыўнай інфармацыі і, галоўнае, ішла разам з часам. Упершыню на яе старонках чытач мог пазнаёміцца з крытычнымі матэрыяламі па надзённых грамадска-палітычных праблемах (напрыклад, даведацца аб прыгнёце на захопленых Прусіяй польскіх землях).

Пра дэмакратычны настрой выдання сведчыў той факт, што неаднойчы ў адрас газеты гучалі папрокі з боку караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Хутка па яго загадзе была ўведзена пасада цэнзара, які пэўныя «ненадзейныя» артыкулы замяняў паведамленнямі з іншых выданняў. Апошні нумар газеты выйшаў 28 снежня 1780 г.

У канцы XVIII ст. у Гародні выходзілі яшчэ дзве газеты: у 1792 г. – «Ведамасці Гродзенскія» – орган Таргавіцкай канфедэрацыі і «Кур'ер Літоўскі» (1796–1797). На старонках гэтых выданняў змяшчалася інфармацыя аб падзеях у дзяржаве і горадзе, утрымліваліся матэрыялы аб знешніх зносінах краіны, палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай.

Перыядычныя выданні другой паловы XVIII ст. адыгралі выключна важную ролю ў павышэнні культурнага ўзроўню грамадства. Дзякуючы ім чытач атрымліваў аператыўную і даступную інфармацыю, пашыраўся яго кругагляд, больш актуальнымі станавіліся зносіны з іншымі прадстаўнікамі беларускай культуры.

Асобае месца ў беларускім кнігадрукаванні належыць прыватным друкарням. Дзейнасць некаторых з іх была кароткачасовай з-за слабага развіцця выдавецкай справы, адсутнасці дзяржаўнага кніжнага гандлю, нарэшце, перашкод з боку ўлад. Так, у 1796 г. выйшаў указ Кацярыны II аб закрыцці вольных, г.зн. прыватных, друкарняў. Тым не менш дзякуючы прыватнаму кнігавыданню ў Беларусі з'явіліся кнігі па айчыннай гісторыі, медыцыне. Часта ў ролі выдаўцоў выступалі аўтары ўласных твораў, якія мелі на мэце хутчэй асветніцкія,

чым камерцыйныя, інтарэсы. Так, прыватнай Гародзенскай друкарняй М. Тамашэўскага была выдадзена ў 1798 г. на польскай мове «міфалагічна-гістарычная» трагедыя «Ахвяра Мінервы», напісаная самім уладальнікам друкарні.

З 1774 г. да канца XVIII ст. дзейнічала Магілёўская прыдворная друкарня, якая належала каталіцкаму арцыбіскупу, пісьменніку і вучонаму-славісту Станіславу Сестранцэвічу. У 1786 г. тут выдадзены трактат вядомага палітычнага і грамадскага дзеяча Ф. Пракаповіча «Аб паэтычным мастацтве». Кніга ўключала лекцыі, прачытаныя ім у 1705 г. у Кіева-Магілянскай акадэміі. Усяго ў друкарні былі выдадзены 50 кніг. Акрамя таго, тут выходзілі на польскай мове «Беларускія календары» і «Календары для беларускага намесніцтва».

У Нясвіжскай друкарні Радзівілаў у 1750–1791 гг. выйшлі з друку каля 64 кніг. Пераважала рэлігійная літаратура, сярод іншых выданняў вядомы панегірычныя вершы і прамовы, творы антычных аўтараў, падручнікі.

Працы па трыганаметрыі і гігіене выходзілі ў канцы XVIII ст. у Шклоўскай прыватнай друкарні асветніка і мецэната І. Цэйтліна.

Універсальны характар кніжнай прадукцыі прыватных друкарняў садзейнічаў пашырэнню сферы распаўсюджання кнігі, стымуляваў дзейнасць творчай інтэлігенцыі.

Не абмяжоўваліся выключна рэлігійнай літаратурай у другой палове XVIII ст. царкоўныя друкарні. Пераважна свецкую накіраванасць мела Магілёўская друкарня Рымска-каталіцкай кансісторыі. Патрэбам каталіцкай царквы былі падпарадкаваны толькі асобныя выданні – штогадовыя календары, або дырэкторыумы, каталогі асоб каталіцкай іерархіі. На рускай мове тут выйшла першая на тэрыторыі Беларусі кніга грамадзянскага друку «Кацярыны II пастановы для кіравання губерняй» (1777).

Далучэнне ў другой палове XVIII ст. беларускіх зямель да Расійскай імперыі прывяло да значных пераўтварэнняў у кнігадрукаванні: зацвярджаецца грамадзянскі шрыфт, кірылічныя выданні грамадзянскага друку выдаваліся ў мясцовых друкарнях на аснове расійскіх законаў і адпаведных прывілеяў аб кнігадрукаванні. На рускай мове былі выдадзены 11 кніг, у тым ліку «Словарь юридический» Ф. Ланганса (Полацкая езуіцкая друкарня, 1791), «Похвальная песнь при возшествии на престол Павла I» (Віцебск, 1799) і інш.

У 1799 г. у Менскай губернскай друкарні выйшаў навучальны дапаможнік «Лёгкі спосаб навучыцца чытаць па-руску і

па-польску». Гэта было першае беларускае выданне падручніка грамадзянскага друку, які змяшчаў тэксты на рускай мове.

Пра тое, што разам з легальнымі выданнямі з'яўляліся і патаемныя, сведчыла асобая пільнасць з боку ўлад. «Універсал паліцэйскай камісіі ВКЛ» ад 13 сакавіка 1794 г. прадугледжваў утварэнне асобай цэнзурнай камісіі для разгляду ўсіх кніг, якія выходзілі ў гарадах Заходне-Рускага краю. Універсал прадпісваў лічыць забароненымі «все вообще книги, не согласные с учётом католической церкви и местными народными обычаями». Асобы, якія займаліся распаўсюджваннем забароненых кніг, плацілі штраф у памеры 100 злотых на першы раз і пазбаўляліся волі – у другі.

З развіццём кнігадрукавання самым непасрэдным чынам звязана і мастацтва кніжнай графікі. Скураныя цісненыя пераплёты, асобныя лісты з багата гравіраваным арнаментам, застаўкі, канцоўкі, заглаўныя буквіцы, шрыфты – усё гэта з'яўлялася выразным паказчыкам развіцця культуры кнігі і выдавецкай справы ўвогуле.

У 1747 і 1751 гг. у Нясвіжы быў выдадзены Марцінам-Францішкам Вабе радаслоўны альбом княжацкага роду Радзівілаў за 400 гадоў. На прыкладзе гэтага выдання, мастаком-афарміцелем якога з'яўляўся Гірш Лейбовіч, ураджэнец Нясвіжа, можна сцвярджаць, што тэхніка гравіравальнага мастацтва ў Беларусі дасягнула ў сярэдзіне і другой палове XVIII ст. высокага ўзроўню.

1. Назавіце асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў другой палове XVIII ст.
2. Карыстаючыся картай «Культура Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.», вызначце гарады-асяродкі развіцця музычнай культуры, цэнтры школы іканапісу. Паспрабуйце назваць прозвішчы магнатаў, якія садзейнічалі развіццю беларускай культуры.
3. Назавіце грамадскія і культавыя збудаванні на беларускіх землях таго часу, якія пабудаваны ў стылі: а) барока і пераходнага тыпу ад барока да класіцызму; б) класіцызму. Вызначце іх характэрныя асаблівасці. Назавіце палацава-паркавыя комплексы таго часу, пабудаваныя на беларускіх землях у канцы XVIII ст.
4. Узгадайце найбольш яскравых мастакоў таго перыяду і іх творы.

Тэма: Магнаты і Асветніцтва

План вывучэння тэмы:

1. Магнацкія сядзібы як асяродкі культуры.
2. Прыгонны тэатр.
3. Прыгонныя капэлы і аркестры.

Мэта:

• вызначыць ролю, якую адыгрывалі магнаты ў станаўленні культуры Беларусі.

Асноўныя паняцці: капэлы, прыгонны тэатр.

Магнацкія сядзібы як асяродкі культуры. У шэрагу магнацкіх культурных цэнтраў другой паловы XVIII ст. асаблівае месца займаў Нясвіж – цэнтр уладанняў адной з багацейшых ліній самага магутнага ў Рэчы Паспалітай магнацкага роду Радзівілаў. Веліч і багацці ўладальнікаў Нясвіжа ўражвалі сучаснікаў, якія складалі пра іх легенды, бо «багацці тут былі незлічоныя: без перабольшванняў можна сказаць, што большая палова Літвы, значная частка Украіны, Русі і амаль уся Польшча зносілі сюды даніны за сваё збожжа, за свае лясы, за рыбу, што ў вадзе, за птушак і пчол, што ў паветры, і, хто ведае, можа за само паветра».

Таксама аднаўляўся і пашыраўся велічны нясвіжскі палацава-замкавы комплекс. Перабудова і аздабленне інтэр'ераў вяліся пад кіраўніцтвам таленавітых архітэктараў К. Ждановіча, М. Фларыяновіча і італьянскіх дойлідаў М. Педэцы і К. Спампані. У нясвіжскім замку захоўваліся багацейшыя калекцыі каштоўнасцей, жывапісу і графікі, вырабаў прыкладнога мастацтва. Там жа знаходзіліся ўнікальны архіў ВКЛ (з 1551 г.) і самая багатая ў Рэчы Паспалітай бібліятэка, якая значна папоўнілася менавіта ў другой палове XVIII ст.

Урачыстыя магнацкія ўезды ў горад і выезды з яго, балі, святы, ваенныя парады суправаджаліся выступленнямі заснаванай пры князю М. К. Радзівілу прыдворнай музычнай капэлы. З 1746 г. у нясвіжскім замку пачаў працаваць прыдворны тэатр, для якога ў хуткім часе ў горадзе быў пабудаваны па праекце К. Ждановіча спецыяльны будынак – «камедыенхаўз» – першы ў Беларусі спецыяльны тэатральны стацыянарны будынак. З 1751 г. у Нясвіжы распачала дзейнасць музычная школа, а з 1758 г. – балетная школа.

У Альбе па загадзе Караля Радзівіла была пабудавана цэлая ідылічная вёска з некалькімі дзясяткамі псеўдасялянскіх хатак, размешчаных па берагах пракапаных суднаходных каналаў. Там жылі «пейзане», «пейзанкі», «янычары» і іншыя не менш дзіўныя асобы, апранутыя адпаведна прызначаным «амплуа», – удзельнікі сапраўды экзатычнага тэатралізаванага відовішча.

Прыдворны тэатр, музычная капэла, музычная і балетная школы існавалі і ў Слуцку – рэзідэнцыі малодшага брата нясвіжскага ардыната М. К. Радзівіла князя Гераніма Фларыяна Радзівіла. Пры ім у горадзе працаваў княжацкі кадэцкі корпус, дзейнічала знакамітая майстэрня па вырабе шаўковых слуцкіх паясоў, так званая персіярня.

Рэзідэнцыю гетмана М. К. Агінскага – Слонім, слава якога была не меншая, чым слава Нясвіжа, сучаснікі называлі «паўночнымі Афінамі», а таксама «калыскай і цэнтрам навукі і прыгожых мастацтваў, духоўным прытулкам прыгнечанага чалавецтва». Агінскі пасяліўся ў Слоніме ў 1765 г., і з таго часу распачаўся росквіт гэтага горада. Тут пачалі працаваць ткацкія мануфактуры, дзе выраблялiся высокамастацкія шпалеры і ворсавыя дываны. Пачаў перабудоўвацца слонімскі (раней сапегаўскі) палац, пашыраўся і ўпрыгожваўся парк. У замку была заснавана друкарня, сярод прадукцыі якой былі і сачыненні самога ўладальніка Слоніма – тэксты лібрэта яго опер.

Згодна з праектам італьянскага архітэктара І. Мараіна ў 1770-ыя гг. паблізу замка быў узведзены «Новы дом оперы» – будынак для гетманскага прыдворнага тэатра. Там штодзённа наладжваліся прадстаўленні і канцэрты пры ўдзеле высокапрафесійнай музычнай капэлы. Партыю першай скрыпкі ў ёй выконваў сам Агінскі, таленавіты музыкант-віртуоз, вучань знакамітага скрыпача Дж. Віоці. У слонімскай сядзібе меліся багацейшая калекцыя музычных інструментаў і нотны збор, у якім налічвалася каля 800 партытур опер, балетаў, араторый і дывертысментаў.

У Слоніме былі заснаваны музычная і балетная школы. Для артыстаў шыкоўнага прыдворнага тэатра былі пабудаваны «кафенхаўсы» – кавярні. У гэтых кавярнях наладжваліся знакамітыя слонімскія балі-маскарады, ці, як іх тады называлі ў Рэчы Паспалітай, рэдуты, для гасцей якіх меўся цэлы склад карнавальных касцюмаў. Маскарады, дзействы, у аснове сваёй дэмакратычныя, арганізоўваліся таксама і ў Слуцку, і ў Гародні. Пры гэтым, калі на маскарадныя балі пры слуцкім двары Г. Ф. Радзівіла збіралася толькі запрошаная князем публіка, то

на рэдуты ў Гародні і Слоніме мог прыйсці кожны жадаючы, акрамя прыгонных.

На другую палову XVIII ст. прыпадае росквіт Ружанаў і Дзярэчына – галоўных рэзідэнцый канцлера ВКЛ Аляксандра Міхала Сапегі. У новым, класічным, стылі абсталёўваўся шыкоўны сапегаўскі палац у Ружанах. Там захоўваліся археалагічныя калекцыі (археалагічны кабінет), багаты архіў сямейства Сапегаў і самая багатая ў краіне (пасля радзівілаўскай) бібліятэка, якую пачаў збіраць яшчэ канцлер ВКЛ Леў Сапега. У флігелі палаца было абсталявана памяшканне для прыдворнага тэатра. На яго сцэне ставіліся камедыі і драмы, оперы і балеты, у тым ліку опера Ж. Ж. Русо «Вясковы чараўнік». З 1781 г. трупа ружанскага тэатра пачала працаваць у новай рэзідэнцыі Сапегі – Дзярэчыне. Тут, у збудаваным па праекце архітэктараў І. Бекера і Л. Гуцэвіча палацы, знаходзілася і тэатральная зала, сцэну якой упрыгожваў занавес «Купанне Дзіяны», створаны знакамітым мастаком К. Атасельскім.

Уласныя прыдворны тэатр, музычную капэлу, а таксама тэатральна-музычную школу, арганізаваную ў 1774 г. з мэтай падрыхтоўкі музыкантаў, спевакоў і танцоўшчыкаў, утрымліваў і А. Тызенгаўз у Гародні. Сам гародзенскі староста, здольны і энергічны адміністратар, які спрыяў узвядзенню ў горадзе архітэктурнага комплексу Гарадніца, усталяванню каралеўскіх гародзенскіх мануфактур, прафесійных навучальных і навуковых устаноў, быў арганізатарам выпуску першай у Беларусі газеты – «Газеты Гродзенскай» (1776–1783), не цураўся прыгожых мастацтваў. Ён добра іграў на скрыпцы і клавікордзе, стварaў музыку і імкнуўся так планаваць рабочыя дні, каб мець час на заняткі мастацтвамі. Свой прыдворны тэатр Тызенгаўз арганізаваў, арыентуючыся на лепшы мясцовы і еўрапейскі вопыт. Трэба зазначыць, што гародзенскі тэатр быў адным з лепшых у той час не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Рэчы Паспалітай.

Магнацкі тэатр. Адметнай з'явай у культурнай дзейнасці магнатаў Беларусі ў другой палове XVIII ст. было стварэнне ў адносна кароткі гістарычны прамежак часу прыватнаўласніцкага маёнткавага тэатра, суцэльна свецкага і ў аснове сваёй прафесійнага.

Гісторыя магнацкага тэатра распачыналася ў Нясвіжы, дзе ў 1746 г. быў заснаваны першы прыдворны маёнткавы тэатр. Яго стваральніцай была жонка князя Міхала Казіміра Радзівіла княгіня Францішка Урсула з роду Вішнявецкіх. Гэта была жанчына высокаадукаваная і, несумненна, таленавітая. Яна прывяла да парадку багацейшую, але да таго часу даволі

занядбаную замкавую бібліятэку, прывучала прыдворных чытаць кнігі, займалася літаратурнай дзейнасцю – пісала вершы, а таксама п'есы для свайго прыдворнага княжацкага тэатра.

Францішцы Урсуле Радзівіл належаць 16 драм і камедый. Сярод іх ёсць і перапрацоўкі п'ес Ж. Б. Мальера, з творчасцю якога менавіта нясвіжская ўладальніца ўпершыню пазнаёміла мясцовую публіку. Драматургія княгіні Радзівіл – выразнае люстэрка творчай самабытнасці пісьменніцы і цікавейшы помнік культуры Беларусі сярэдзіны XVIII ст. Францішка Урсула ніколі не пакідала Нясвіж, але, начытаная і надзеленая ад прыроды палкай і жывой фантазіяй, яна смела «падарожнічала» ў сваіх п'есах у прасторы і часе. Кіпр, Егіпет, Рымская імперыя, старажытная Грэцыя – далёка не поўная «геаграфія» яе драматургіі. Сюжэты для сваіх трагедый і камедый княгіня брала з гісторыі, міфалогіі, сярэднявечных містэрый, заходнееўрапейскай навелістыкі эпохі Адраджэння. Яна выкарыстоўвала і багаты вопыт мясцовага школьнага тэатра. Цікава, што герояў сваіх п'ес пісьменніца надзяляла рысамі добра ёй знаёмай беларускай шляхты, што надавала яе творам выразны мясцовы каларыт.

Спектаклі ў тэатры Францішкі Урсулы Радзівіл ставіліся амаль штомесячна і прымяркоўваліся да свят і ўрачыстых падзей у жыцці княжацкага двара. У іх стварэнні актыўны ўдзел прымалі члены княжацкай сям'і, прыдворныя і чэлядзь, вучні нясвіжскага кадэцкага корпуса. Па-барочнаму квяцісты тэатр княгіні Радзівіл быў аматарскім, меў абмежаванае кола гледачоў з ліку блізкіх да радзівілаўскага двара асоб. Аднак яго значэнне перарасло рамкі прыгожай княжацкай забавы. Пасля смерці ў 1753 г. княгіні Францішкі Урсулы яе п'есы яшчэ нейкі час ставіліся на сцэне створанага ёю нясвіжскага тэатра. Але наступалі новыя часы. Сын Францішкі Урсулы князь Караль Радзівіл паспрыяў пераўтварэнню аматарскага нясвіжскага тэатра ў тэатр прафесійны. Тут сталі працаваць еўрапейскія і мясцовыя кампазітары, дырыжоры, балетмайстры, спевакі, танцоўшчыкі і мастакі, а аснову рэпертуара тэатра пачалі складаць оперы і балеты.

На прафесійнай аснове працавалі і ўсе іншыя магнацкія тэатры Беларусі другой паловы XVIII ст.: слуцкі, слонімскі, гародзенскі, ружанскі і дзярэчынскі. Яны былі таксама оперна-балетнымі тэатрамі. Аднак вядома, што музычны тэатр патрабуе значных капіталаўкладанняў. Зразумела, што з'яўленне яго ў Беларусі ў другой палове XVIII ст. стала магчымым толькі дзякуючы апецы з боку магнацкай алігархіі.

Спецыяльныя тэатральныя будынкі абсталёўваліся па апошнім на той час слове тэхнікі. У слонімскім тэатры М. К. Агінскага, напрыклад, маглі ставіцца спектаклі з вялікімі батальнымі сцэнамі, воднымі феерыямі і імгненнай зменай дэкарацый. Па тэхнічных магчымасцях гэты тэатр не меў сабе роўных сярод маёнткавых тэатраў краіны і пераўзыходзіў варшаўскі Тэатр Нарадовы, а таксама знакаміты Мангеймскі тэатр у Германіі.

Магнаты запрашалі ў свае тэатры вопытных прафесіяналаў, у тым ліку музыкантаў з Чэхіі, Германіі, Італіі, танцоўшчыкаў з Італіі і Францыі. У пошуках кваліфікаваных музыкантаў і артыстаў для гародзенскага тэатра па даручэнні А. Тызенгаўза вандраваў па Еўропе кіраўнік гародзенскай капэлы Л. Сітанскі. Вынікам гэтых вандровак было запрашэнне на працу ў Гародню групы спевакоў з Фларэнцыі і Рыма і неапалітанскага харэографа Г. Петынеці. У магнацкіх тэатрах Беларусі працавалі знакамітыя дырыжоры і кампазітары Дж. Альберціні, Я. Голанд, К. Чыпрыяна, вакаліст Дж. Кампанучы, балетмайстры Л. М. Дзюпрэ, Ф. Г. Ле Ду, А. Пуціні, мастак К. Атасельскі і іншыя.

Прафесіяналы ўзначальвалі магнацкія музычныя і балетныя школы, дзе з мяшчанскіх і прыгонных хлопчыкаў і дзяўчынак рыхтаваліся высокакваліфікаваныя кадры для прыдворных тэатраў. Аб узроўні прафесійнай адукацыі вучняў гэтых школ, прынамсі гародзенскай, сведчыць той факт, што прыгонныя артысты Тызенгаўза пасля смерці ўладальніка былі прыняты ў склад трупы варшаўскага Тэатра Нарадовага. Выхаванцы слонімскай музычнай школы папаўнялі склад музычнай капэлы Агінскага, якая ўяўляла сабой аркестр высокага класа з адметным уласным выканальніцкім стылем.

На сцэнах магнацкіх тэатраў Беларусі ставіліся ў асноўным французскія і італьянскія оперы і балеты – творы Б. Блёза, А. Э. Грэтры, Э. Р. Руні, Дж. Паізэла, Дж. Сарці, Д. Чымароза, а таксама оперы прыдворных кампазітараў і мясцовых кампазітараў-аматараў – М. К. Агінскага, Я. Голанда, М. Радзівіла. Здзяйсняліся і драматычныя пастаноўкі, якія наладжвалі, як правіла, прафесійныя вандроўныя трупы. У ліку драматычных прадстаўленняў варта згадаць пастаноўку ў гародзенскім тэатры ўжо тады знакамітай камедыі П. Бамаршэ «Севільскі цырульнік».

Аснову рэпертуару маёнткавых тэатраў складалі пераважна камічныя балеты і оперы – опера-буфа і зінгшпіль – у асноўным дэмакратычныя і антыфеадальныя, якія выводзілі на сцэну герояў з простанаро́ддзя. Менавіта яны спрыялі змякчэн-

ню суровых сармацкіх нораваў гледачоў, прывучалі іх да ўспрыняцця новых асветніцкіх ідэй. Да гэтага жанру ахвотна звярталіся мясцовыя аўтары, у тым ліку і стваральнікі пастаўленай у 1784 г. у Нясвіжы оперы «Агатка» (кампазітар Я. Голанд, аўтар лібрэта М. Радзівіл). У іх творчасці відавочна выявілася новае стаўленне да тэатра як да сродку ўплыву на публіку і яе выхаванне.

Важна зазначыць, што маёнткавыя тэатры не былі абсалютна самаізаляванымі адзінкамі. Творчыя кантакты і сувязі існавалі паміж нясвіжскім і слуцкім, нясвіжскім і слонімскім тэатрамі. Слонімскі аркестр Агінскага нярэдка выязджаў на гастролі, а ў 1780 г. наведаў ужо замежны на той час Шклоў, дзе ў вялікай раскошы жыў царскі фаварыт у адстаўцы С. Зорыч. Ён утрымліваў роўны магнацкаму двор з тэатрам, музычнай і балетнай школамі, кадэцкім корпусам.

Да таго ж свецкі тэатр як культурнае новаўвядзенне магнатаў спрыяў распаўсюджванню цікавасці да прыгожых мастацтваў у асяроддзі шляхты, якая заўжды ахвотна пераймала магнацкія культурныя звычкі. Безумоўна, у вялікай ступені менавіта магнацкім уплывам тлумачылася мода на аматарскае хатняе музіцыраванне, якая вельмі хутка пашыралася ў тыя часы сярод шляхціцаў і асабліва шляхцянак.

Між тым маёнткавы тэатр не быў агульнадаступным, што яўна супярэчыла ідэалам асветніцкай культуры. Але гэтым не абмяжоўвалася кола супярэчнасцей, уласцівых магнацкім тэатрам, як і магнацкім культурным цэнтрам Беларусі другой паловы XVIII ст. наогул. Само існаванне прыдворных тэатраў, дзе ставіліся не толькі простанародныя аперэткі, але і п'есы Вальтэра, Мальера, Бамаршэ, забяспечвалася выкарыстаннем працы прыгонных артыстаў. Улада магнатаў над тымі, хто працаваў у іх тэатрах, была па сутнасці ўсемагутнай і нярэдка выкарыстоўвалася неадпаведным чынам. Слуцкі ўладальнік Г. Ф. Радзівіл меў звычку жорстка здзекавацца з акцёраў свайго тэатра, а нясвіжскі ардынат К. С. Радзівіл – не плаціць запрошаным на працу прафесіяналам.

Бліскучы і супярэчлівы магнацкі тэатр скончыў сваё існаванне ў канцы XVIII ст. разам з магнацкімі культурнымі асяродкамі, якія пасля смерці, разарэння ці вымушанай у той складаны час эміграцыі іх уладальнікаў прыходзілі ў заняпад. Яны адыходзілі ў гісторыю, пакідаючы падмурак для стварэння новага свецкага агульнадаступнага тэатра, а таксама памяць пра апошнія водблескі магнацкай велічы, «якія тым ярчэй палалі, чым хутчэй ім трэба было назаўсёды пагаснуць».



1. Чаму магнацкія сядзібы можна назваць асяродкамі культуры? Карыстаючыся картай «Культура Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.», вызначце такія магнацкія сядзібы.
2. Назавіце магнатаў, якія былі ўладальнікамі прыгонных тэатраў.
3. Назавіце прычыны, што прывялі да росквіту прыгоннага тэатра.

Тэма: Народная культура

План вывучэння тэмы:

1. Асаблівасці развіцця народнай культуры.
2. Побыт сялян і мяшчан.
3. Светапогляд і абраднасць жыхароў вёскі і горада.
4. Фальклор.

Мэты:

• даць абагульняючую характарыстыку гістарычнага перыяду развіцця беларускай народнасці;

• вызначыць рысы характару, духоўны свет, святы беларусаў.

Асноўныя паняцці: Каляды, куцці, Масленіца, зажынкі, дажынкі, Купалле.

Рост у грамадстве цікавасці да народнай культуры. Важнейшай часткай беларускай культуры з'яўлялася народная культура, багатая і самабытная па змесце, разнастайная і выразная па форме. Яна адлюстроўвала светапогляд мяшчанскага саслоўя і сялянства, іх сацыяльную і жыццёвую псіхалогію, мастацкія густы і інтарэсы. Развіваючыся пад уплывам змен сацыяльна-эканамічнага і палітычнага характару, што адбыліся ў Беларусі, народная культура ў другой палове XVIII ст. уздзейнічала на духоўнае жыццё ўсяго грамадства, зацвярджала ў ім прагрэсіўныя дэмакратычныя тэндэнцыі. Яна хавала ў сабе вялікія патэнцыяльныя сілы і здольнасці, раскрыцца якім у поўнай меры ва ўмовах феадальна-прыгонніцкага ладу не было магчымасці. Абмежаваная ў мажлівасці карыстацца набыткамі прафесійнай культуры, мяшчанская і сялянская культура шчодра жывіла яе сама. Гэты працэс – уплыў народнай культуры на элітарную – узмацняўся на працягу другой паловы XVIII ст.

У канцы гэтага ж стагоддзя ў нетрах культуры Беларусі зарадзілася цікавасць да народнага жыцця, фальклору, з'явіўся новы дэмакратычны струмень, які сцвярджаў чалавечую годнасць простага люду. Мода на сентыменталізм вывела прадстаўнікоў ніжэйшых саслоўяў на падмосткі магнацкіх тэатраў, зрабіла іх героямі прафесійнай літаратуры.

У неспрыяльных умовах другой паловы XVIII ст., калі паланізацыя адцягвала ад беларускай культуры значныя разумовыя сілы, беларускамоўнай засталася пераважна народная культура. Сацыяльны статус беларускай мовы знізіўся. Яна адышла ў сферу бытавых зносін, захоўвалася і развівалася ў народных казках, паданнях, абрадавых песнях. Вёска менш за ўсё паддалася культурна-моўнай асіміляцыі. Менавіта сацыяльныя нізы, і перш за ўсё запрыгоненае і бяспраўнае сялянства, выконвалі ў тыя часы вялікую культурна-гістарычную місію, зберагаючы родную мову. «Калі ў 1795 г. гістарычны лёс зліў гэты край з Расіяй, – выкладаў у 1866 г. свае назіранні III аддзяленню імператарскай канцылярыі адзін чыноўнік з Беларусі, – у ім усё, што насіла адбітак цывілізацыі, было ўжо чыста польскае. Урадавай, малітоўнай, літаратурнай мовай была польская. Народ захаваў сваю беларускую гаворку з дамешкамі многіх польскіх слоў. У гарадах жа, у мястэчках і панскіх дварах усе ніжэйшыя станы ўжывалі ўжо польскую мову». Але моўны ўплыў быў узаемным: так, беларуская мова аказала такі ўплыў на мясцовую пальшчызну, што выкладчык паэтыкі менскай школы М. Дудзінскі вымушаны быў у свой падручнік польскай мовы, выдадзены ў Вільні ў 1776 г., уключыць спецыяльны раздзел аб «варварызмах» (так названы шматлікія беларусізмы тыпу: хітры, гібкі, грубы, парогі, сысун, бервяно, дзяркач, ляда, ручай, шыпшына і інш.).

У той час як каталіцкая і праваслаўная цэрквы рашуча адмовіліся ад беларушчыны, носьбітам яе ў сакральнай сферы засталося ўніяцкае духавенства. У патрыятычных базыльянска-ўніяцкіх колах ішло супраціўленне польскамоўнаму засіллю. Уніяты распаўсюджвалі беларускія кантычкі і катэхізісы. Ва ўніяцкім асяроддзі нараджаліся беларускія інтэрмедыі і арацыі, рэлігійныя і свецкія песні і вершы. У 1771–1792 гг. яны выдалі на асобных аркушах беларускамоўныя гімны «Радуйся, божы народзе, радасць з неба нам прыходзе», «Нова радасць стала, яка не бывала», «Цару Хрысце мілы, баранку доўгацярплівы», «Кажуць людзі, што я ўмру, а я хочу жыці».

На хвалі Асветніцтва адбываліся заняпад аўтарытэту царквы, секулярызацыя грамадскай свядомасці, развіццё свецкага светапогляду і далейшае абміршчэнне грамадства, у якім

пашырыліся рэлігійны скептыцызм і антыклерыкалізм. Рэаліі, народжаныя контррэфармацыяй, паступова змяняліся культам розуму, рацыяналізмам, грамадзянскасцю, актыўнасцю, патрыятызмам, крытыцызмам. Пад уплывам агульнапалітычнага ўздыму, які ахапіў Беларусь у апошняй трэці XVIII ст., сярод мясцовай шляхты і гараджан распаўсюджваліся перадавыя для свайго часу дэмакратычныя ідэалы.

Аднак, паводле ўяўленняў большасці, селянін быў патрэбны толькі для сахі і касы і ўспрымаўся як ніжэйшая істота. Са шляхецкіх мемуараў XVIII ст. паўстае наступны вобраз мужыка: дурны, лянівы, схільны да гарэлкі, амаральны. Зразумела, гэты вобраз далёка не адпавядаў рэчаіснасці. Сацыяльны і нацыянальны прыгнёт не змог ператварыць мужыка ў дзікуна. Наадварот, менавіта народ быў пазбаўлены маральных заган, уласцівых шляхце, – беспрабуднага п'янства, марнатраўства, ляноты, пакланення перад чужаземшчынай. Народ захоўваў спрадвечныя пачаткі дабра і справядлівасці. Вучоны-аграном А. Меер канстатаваў, што беларускія сяляне «адораны шматлікімі добрымі якасцямі», ціхія, цярплівыя, гасцінныя, сарамлівыя, але вельмі бедныя і неадукаваныя.

Якімі б дрэннымі ні былі ў той час умовы жыцця народа, скрозь шматлікія перашкоды прабіваліся здольныя, таленавітыя, кемлівыя самародкі, якія пры больш спрыяльных акалічнасцях, безумоўна, праславілі б сваю айчыну.

Побыт сялян і мяшчанства. Змены другой паловы XVIII ст. закранулі галоўным чынам культуру і быт пануючых саслоўяў: вышэйшыя і сярэднія пласты шляхты, багатых гараджан. Вёска ж захавала традыцыйныя тыпы планіроўкі, дваровай забудовы, будаўнічую тэхніку і канструкцыйныя асаблівасці пабудоў, інтэр'ер жылля, адзенне, стравы і інш.

Знешні выгляд вёскі і сялянскае жыллё былі вельмі «кансерватыўнымі», непадуладнымі розным павевам моды. У другой палове XVIII ст. выглядала беларуская вёска ўбога. Звычайна яна складалася з двух радоў драўляных, крытых саломай хат, роўна адна пры адной пабудаваных паабапал шырокай вуліцы. Дзеля «эканоміі» месца яны стаялі да вуліцы бокам. Чыншавыя вёскі, пастаўленыя на рыначную аснову, былі больш заможнымі, чым паншчынныя, і адрозніваліся ад апошніх большымі памерамі і грунтоўнасцю сялянскіх пабудоў.

Сялянская сядзіба складалася з хаты, хлява (аборы) і гумна (стадолы). Бяднейшыя вяскоўцы злучалі жылую пабудову з гаспадарчай пад адным дахам, заможнейшыя гаспадары ставілі іх асобна, а таксама будавалі свіран на збожжа, павець для сельскагаспадарчага інвентару і дроў. Як правіла, гэтыя

пабудовы ставіліся ў адзін рад, радзей квадратам, у цэнтры якога тады ўтвараўся падворак.

Хата складалася з жылой «ізбы», сенцаў і каморы. У бяднейшых сялян магло не быць каморы, сенцаў, ганку – яго замяняў пляскаты камень ля дзвярэй. Жылое памяшканне было дастаткова цёмным – маленькія акенцы ў сцяне, што выходзілі на вясковую вуліцу, давалі мала святла. Вокны не зашкляліся – у холад бяднейшыя сяляне затыкалі іх анучамі, саломай або драўлянай засаўкай. З сярэдзіны XVIII ст. у вокнах сялянскіх хат усё часцей з'яўляецца шкло – тоўстае і цьмянае. Асвятлялася хата лучынай, засунутай у сцяну ў жалезны лучнік. У студзёны зімовы час у адным памяшканні з людзьмі знаходзіліся маладняк хатняй жывёлы і птушка. Коміна звычайна не было – дым выходзіў праз адтуліну ў столі. Два разы ў год (да Каляд і Вялікадня) сцены ў хаце бялілі вапнай, але яны хутка зноў чарнелі ад дыму. Падлога была земляная або гліняная.

У сялянскай хаце мелася нешматлікая і прымітыўная самаробная мэбля: драўляныя лавы ўздоўж сцяны, стол, скрыня (куфар) для адзення і ўпрыгажэнняў, паліца для кухоннага начыння. Гэтыя рэчы часам аздаблялі адмысловай разьбой або арнаментальным роспісам. Ля ўваходу стаяла печ. На покуці віселі абразы. Ложкаў сяляне тады яшчэ не ведалі – спалі на кулі саломы на падлозе, на печы, летам – на сене ў гумне. Ад сялянскага жылля мала чым адрозніваліся сядзібы дробнай шляхты.

Не зведала павеваў моды і сялянскае адзенне. Жыхары вёскі пераважна апраналіся ў вопратку дамашняга вырабу. Здаўна сыравінай для вырабу адзення служылі скура, футра і воўна хатніх і дзікіх жывёл, ільняное, канаплянае валакно. Кожная вясковая жанчына ўмела прасці і ткаць. Ткалі палатно, паясы, ручнікі, абрусы, гункі, коўдры, дываны, сукно, корт і інш. Тканіны аздабляліся арнаментам, які перадаваўся ад бабуль і маці дочкам. Ткацтва поўнасцю задавольвала патрэбы вёскі. Штодзённы мужчынскі ўбор складаўся з палатняных портак (штаноў), выпушчанай наверх кашулі, перавязанай рэмнем ці поясам, і світы. На галаве насілі магерку ці капялюш. Абуваліся ў скураныя пасталы або лапці з лыка, падвязаныя аборамі да ног. Жаночы строй складаўся з кашулі, спадніцы, фартуха, світы паверх, хусткі на галаве. У штодзённым адзенні пераважалі шэры, чорны і белы колеры. У царкву і на свята апраналі больш дарагое і яркае адзенне, вышытае народным арнаментам, дапоўненае купленымі ўпрыгажэннямі – поясам, каралямі, меднымі кольцамі. У святы мужчыны з больш заможных сем'яў насілі боты, а жанчыны – чаравікі.

Асабістая гігіена вясковага насельніцтва складалася з мыцця рук і твару вадой, пераважна без выкарыстання мыла, якое ў сялянскай хаце было рэдкасцю. Штодзённае адзенне насілася без змены і хутка пакрывалася брудам. У выніку нізкага стану гігіены, дрэннага харчавання, шматлікіх хвароб і эпідэмій сярэдняя працягласць жыцця была кароткая і не перавышала 30 гадоў.

Сярэдні тагачасны селянін жыў сціпла, нярэдка на мяжы галечы. Прыгонная вёска хранічна недаядала, а ў неўрадлівыя гады – галадала. Асноўнымі ў харчовым рацыёне былі прадукты раслiннага паходжання: хлеб, капуста, гарох, бабы, рэпа, буракі, з сярэдзіны XVIII ст. – бульба. Варылі кашы, боршч, зацірку, крупнік, жур. Стравы прыпраўлялі алеем, саладзілі мёдам, які, аднак, не быў агульнадаступным прадуктам.

Найпершай сялянскай ежай быў у асноўным хлеб. У бяднейшых сем'ях яго выпякалі, дадаючы да мукі мякіну, рабілі аўсяныя праснакі са шчаўем. Даставаўся хлеб цяжка, часта яго не хапала, таму ён вельмі шанаваўся. Малака сяляне спажывалі мала, мяса елі рэдка – толькі ў святочныя дні. Пілі ваду, хлебны квас, бярозавы сок. Прадуктаў куплялі няшмат: галоўным чынам соль, селядцы, піва, гарэлку.

Ежа была аднастайнай, маласпажыўнай, нясмачнай. Найперш дбалі пра яе колькасць, а не пра якасць. Харчаваліся тры разы на дзень. Вясной, калі канчалася збожжа, сяляне елі шчаўе, крапіву, лебяду, асот. Ад такой стравы, як пісаў у 1800 г. Г. Р. Дзяржавін пра земляробаў Віцебскай губерні, усе яны былі «вялыя, худыя і бледныя, нібы мерцвякі». Пра нядужасць крычаўскіх жыхароў і бледнасць іх твараў сведчыў і А. Меер. Летам сяляне збіралі ў лясах ягады і грыбы. Больш багатым і разнастайным харчаванне было ў час свят: на Каляды, Вялікдзень, вяселлі, на якія пакідалі апошнія запасы. Посуд сяляне выраблялі з дрэва і гліны. Калі ў хаце з'яўляўся госць, стол засцілалі ручніком. Запасы прадуктаў захоўвалі ў драўляных бочках і саламяных лубках.

Сялянскія дзеці раслі ў голадзе, холадзе і брудзе. Дзяцінства ў прыгоннай вёсцы было бязрадаснае і кароткае. У пяць гадоў дзеці пасвілі хатнюю птушку, даглядалі малодшых, у сем – працавалі пастухамі, падпаскамі, у дзесяць – баранавалі, ішлі «на згон». Хадзілі дзеці ў адной палатнянай кашулі, босыя. Цацак не ведалі. Раслі непісьменнымі, у лепшым выпадку ўмелі крыху чытаць і лічыць.

У сямейным жыцці жонка цалкам залежала ад мужа, прыніжалася ім, не дапускалася ў мужчынскую кампанію. Яе

абавязкам было даглядаць дзяцей і весці хатнюю гаспадарку. Развесціся ў сялянскім і мяшчанскім асяроддзі было немагчыма.

Селянін быў вольны ад працы толькі ў нядзелю і святочныя дні. Асабістае жыццё прыгонных праходзіла ў такія дні ў дзвюх установах: царкве ці касцёле і карчме. Да паўдня селянін знаходзіўся ў царкве (у гэты час забаранялася гандляваць спіртнымі напіткамі), пасля набажэнства накіроўваўся ў карчму.

Для вёскі, замкнутай, адарванай ад кантактаў з усім светам, пазбаўленай магчымасці карыстацца дабротамі ўсеагульнай асветы, прыток культурнага зместу быў надзвычай ускладнены і абмежаваны. Ролю пункта перадачы ўсялякіх навін адыгрывала карчма.

У сярэдзіне XVIII ст. корчмы меліся амаль у кожнай беларускай вёсцы. Карчмар быў патрэбным чалавекам для шляхты і сялян. Ён пастаўляў інфармацыю, выконваў канфідэнцыяльныя даручэнні, пасрэднічаў у куплі-продажы, ведаў амаль усё і пра ўсіх. На начлег і харчаванне спыняліся ў карчме праязджыя купцы, падарожнікі, салдаты, бадзягі, уцекачы, вандроўныя музыкі. Яны прыносілі сюды весткі з розных мясцін, расказвалі пра далёкія гарады і дзяржавы, існуючыя там звычаі і культуру, важныя здарэнні. Зразумела, было ў іх апавяданнях нямала фантастыкі і перабольшванняў. Але ўсё гэта ўважліва слухалі карчмар з сям'ёй і вяскоўцы, якія наведваліся сюды ў святочныя і звязаныя з сямейнымі ўрачыстасцямі (хрэсьбіны, вяселле) дні. Да таго ж сяляне нярэдка шукалі ў гарэлцы забыцця ад гора і крыўды. Яны танцавалі тут пад гукі скрыпкі, цымбал ці дуды. У корчмах не раз выспяваў сацыяльны элемент, абмяркоўваліся антыпрыгонныя выступленні і бунты. Стагоддзямі карчма ў нейкім плане замяняла прыгонным вясковую школу. З цягам часу яна аказвала ўсё большы ўплыў на вёску, пашырала духоўныя гарызонты сялян і задавальняла ўласцівую ім цікаўнасць да ўсяго таго, што адбывалася ў свеце.



Карчма ў в. Міншчына пад Смаргонню

У той жа час карчма была вялікім злом для вёскі, бо дэмаралізавала сялян, прывучала іх да п'янства і знявагі добрых і здаровых звычаяў. Праз арандатара пан збываў тут сялянам прадукцыю свайго гарэлачнага бровара. Прыгонны абавязаны быў выпіць за год у сваёй карчме пэўную колькасць «сівухі». Даходы ад арэнды корчмаў дасягалі часам паловы ўсіх панскіх прыбыткаў.

Цэнтрам культурнага жыцця заўсёды быў горад. З сярэдзіны XVIII ст. беларускія гарады ахапіла агульнае ажыўленне. На карце Беларусі з'явіліся новыя культурныя цэнтры (Шклоў, Слуцк і інш.), павысілася роля традыцыйных (Нясвіжа, Міра, Наваградка і інш.). Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё гарадоў асабліва актывізавалася ў апошняй трэці XVIII ст. Сярод мяшчан часткова парушаўся патрыярхальны ўклад жыцця. Сярод прагрэсіўнай шляхты і гараджан раслі, з аднаго боку, сепаратысцкія тэндэнцыі ў адносінах да Польшчы, а з другога – патрыятычныя настроі, абуджаныя падзеламі Рэчы Паспалітай. «Краёвы» ліцвінскі патрыятызм перастаў быць набыткам абмежаванага кола асоб. У той жа час у культурным жыцці пачаў адчувацца ўсё больш моцны рускі ўплыў.

Як і ва ўсе часы, гарады з'яўляліся культурнымі цэнтрамі, але ў другой палове XVIII ст. адбывалася некаторае пераразмеркаванне паміж імі гэтай ролі. Страціў сваё былое значэнне Полацк. У 1780 г. тут заставалася каля тысячы жыхароў. Затое ў астравок еўрапейскай цывілізацыі ў 70–80-ыя гг. пераўтварылася Гародня, якая з пункту гледжання прамысловасці і культуры стала адным з першых гарадоў Беларусі. У канцы стагоддзя сюды былі пераведзены Галоўны Трыбунал і Грашовая камісія Вялікага Княства Літоўскага.

У цэлым тагачасныя беларускія гарады, асабліва невялікія, мелі даволі непрывабны выгляд. Жылыя дамы былі тут пераважна драўляныя. Двух-, трохпавярховыя будынкі былі

вялікай рэдкасцю. Магнацкія палацы і асабнякі багатых купцоў перамяжоўваліся з убогімі хацінамі гарадской беднаты. Крытае саломай жыллё рамеснікаў і чэлядзі мала чым адрознівалася ад сялянскіх хат. Побач з жылымі дамамі стаялі хлявы і гумны – многія гараджане займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй.

У другой палове XVIII ст. пачалася рэгулярная забудова гарадоў. Тады ж па загадзе Тызенгаўза ў Гародні і Паставах былі ўзведзены для рамеснага люду першыя тыповыя камянічкі, спраектаваныя архітэктарамі-прафесіяналамі.



Фасады і планы корчмаў «Раскоша» і «Нёнза» ў Гародні. Другая палова XVIII ст.

У канцы гэтага ж стагоддзя для многіх беларускіх гарадоў былі распрацаваны новыя планы ў адпаведнасці з прынцыпамі рускага горадабудаўніцтва.

Гарадскія вуліцы брукаваліся толькі ў цэнтры – каля ратушы і гандлёвых радоў і афіцыйных назваў не мелі. На сваіх майстэрнях рамеснікі вывешвалі замест шыльдаў розныя знакі: каваль – падкову, шавец – бот, кравец – нажніцы, цырульнік – таз. Ноччу горад не асвятляўся, таму прахожыя ўзбройваліся ліхтарамі і паходнямі. Затое ўсюды адкрываліся корчмы і шынкі.

Светапогляд і абраднасць жыхароў вёскі і горада. Духоўная культура простага чалавека, далёкага ад навукі і прафесійнай культуры, трымалася найперш традыцыяй. З пакалення ў пакаленне пераходзілі арыгінальныя, прыгожыя і паэтычныя звычаі і абрады, якімі было абстаўлена ўсё жыццё беларуса. Вясну ён сустракаў песнямі-заклінаннямі, маладую

рунь – велікоднымі песнямі, веснавы росквіт прыроды – сёмушнымі звычаямі. Адметнай з'явай народнага жыцця ў рэчышчы ўсёй культуры Беларусі было святкаванне Купалля, якое зарадзілася яшчэ ў язычніцкія часы і праходзіла ў другой палове XVIII ст. па добра адпрацаваным многімі пакаленнямі сцэнарыі. У сярэдзіне лета на заходзе сонца кожная вёска ў ваколіцы раскладвала вогнішча, вакол якога збіралася моладзь і спявала. Старыя шчыра падтрымлівалі ўрачыстасць. Асаблівай прыкметай гэтага свята з'яўляліся кветкі. Іх збіралі з вечара, затыкалі ва ўсе шчыліны ў доме, каб злы дух не прабраўся, плялі вянкі, а ў купальскую ноч варажылі, пускалі іх па вадзе, наладжвалі скокі праз агонь, шукалі папараць-кветку.

На дажынках радаваліся сабранаму ўраджаю. Зжаты сноп калосся, з якім звязвалі дабрабыт, парадак, згоду, ставілі ў куце хаты, дзе ён стаяў да таго часу, пакуль не было асвечана абмалочанае зерне. На Каляды (свята сялянскай заможнасці) хадзілі з песнямі і з «казой» ад хаты да хаты, наладжвалі цэлыя прадстаўленні.

Уся вёска збіралася разам, калі прыходзілі скамарохі, мядзведнікі, сляпыя лірнікі. У зімовыя вечары вясковыя жанчыны і дзяўчаты збіраліся на попрадкі – гучалі песні і казкі, што дайшлі ад продкаў.

Светлымі днямі ў жыцці прыгоннага селяніна былі сямейныя святы: хрэсьбіны і вяселлі, якія таксама адзначаліся ўсёй вёскай. Абапіраліся яны пераважна на язычніцкія традыцыі.

Нованароджанага адразу ж «далучалі» да зямлі, сям'і, грамадства: клалі на падлогу, падносілі да печкі ці парога, узнімалі на руках, сімвалічна білі розгай. У адведкі прыходзілі суседкі, прыносілі падарункі і ежу. Сялянскія хрэсьбіны праводзілі па-свойму пышна: земляроб стараўся забіць парсючка, купіць бочку піва.

Імя дзіцяці даваў па сваёй волі поп або ксёндз, выбіраючы іх пераважна з календара, радзей называлі імем бацькі ці дзеда. Калі дзіця паміралa, асаблівай трагедыі не рабілі. Казалі: «Бог даў – бог узяў». Немаўлятка калыхалі ў калысцы, падвешанай вяроўкамі да столі, спявалі калыханкі. У час працы ў полі маці клала дзіця ў баразну.

Хату, дзе дзяўчына была на выданні, бялілі светлай глінай, вакол яе садзілі кветкі. У чаканні свата дзяўчына старанна шаравала мэблю, кухоннае начынне, па некалькі разоў падмятала хату. Яна апранала лепшае ўбранне, якое разам з тым павінна было быць будзённым, неадметным.

Вестуном вяселля быў сват – звычайна чалавек вопытны, вясёлы, гутарлівы, паважаны ў наваколлі. Ва ўмоўлены час ён прыбываў з бутэлькай гарэлкі і пачынаў з бацькамі дзяўчыны

складаную славесную гульню: таргаваў «ялаўку», шукаў «гуску» або «лябёдку», усхваляў вартасці і пералічваў маёмасць хлопца. Рашэнне звычайна прымалі бацькі, згоды дзяўчыны асабліва не пыталіся. Тады ж агаворвалі пасаг, ішла размова пра гаспадарку маладога – абмяркоўваліся матэрыяльныя асновы будучай сям'і.

Першая традыцыйная сустрэча двух бакоў называлася запоінамі. Пасля яе да дзяўчыны запрашалі сяброўак, якія не адыходзілі ад яе ад гэтага часу аж да шлюбу. Праз тыдзень спраўляліся «вялікія запоіны» – сціплы банкет з удзелам радні маладой і маладога. Потым адбываліся «змовіны», на якія запрашалі таксама і жыхароў вёскі. Пасля застолля пачыналіся танцы – скрыпка і дуда не сціхалі ні на момант. Тут можна было наслухацца шмат шчырых, часам вельмі дасціпных жартаў, вершаваных двух- ці чатырохрадкоўяў.

Вяселле звычайна сяляне святкавалі паміж Пакровам і Калядамі, калі было ўсё сабрана ў полі і можна больш багата і шчодра накрыць стол, спадзеючыся, што такое ж багацце будзе і ў доме маладых. Людзі верылі, што як робіцца на ўрачыстасці, так будзе і далей у жыцці.

Сялянскае вяселле цягнулася два–тры дні. У ім удзельнічала ўся вёска – адны ў ролі акцёраў-спевакоў, другія – у ролі гледачоў. На «дзявочым вечары» нявеста развітвалася з сяброўкамі, а тыя плялі вянкі і спявалі песні пра смутак дзяўчыны, што не той будзе яе мужам, каго кахала, што яна мусіць ужо развітвацца з дзявочымі забавамі і ўцехамі; песні пра бацьку, які так любіць выпіць, што дачку на гарэлку прамяняў, і да т.п. Назаўтра з'яўляўся з сябрамі жаніх. Атрымаўшы благаславенне бацькоў, маладыя ехалі ў царкву або касцёл браць шлюб. Там яны мяняліся пярсцёнкамі, якія ў тыя часы толькі што ўваходзілі ў моду. Вярнуўшыся ў дом нявесты, госці дзялілі каравай, уручалі падарункі. Моладзь ішла танцаваць у карчму, а старэйшыя працягвалі святочную вячэру. Назаўтра замужнія жанчыны прымалі маладую ў сваё асяроддзе: саджалі на дзяжу, абразалі косы, пакрывалі галаву чапцом або наміткай. Затым наступала развітанне, пасля чаго малады вёз жонку да сваіх бацькоў, якія сустракалі іх на парозе свайго дома.

Пэўныя абрады былі звязаны і з пахаваннем селяніна. Нябожчыка клалі на лаву, пыталіся ў яго, навошта ж ён памёр. Цела хавалі на могілках – у лесе ці ў полі. Потым праводзілі сціплыя памінкі. Смуткуючы па нябожчыку, аплаквалі і сваё гаротнае жыццё.

Вялікае значэнне беларусы надавалі ўшанаванню продкаў, у якім праяўлялася павага да даўніны. Дзяды былі восеньскія (больш распаўсюджаныя) і веснавыя, або Радаўніца.

[Перадрук з:

Заключэнне

Храналагічныя ўраўненні.

Падлічыце год і назавіце адпаведную яму падзею з гісторыі Беларусі:

1. (Дата атрымання горадам Полацкам Магдэбургскага права + дата бітвы пад Оршай): 2 = ? (дата і падзея).

2. Дата ўтварэння Рэчы Паспалітай − дата разгрому войскамі Вялікага Княства Літоўскага пад камандаваннем Міхаіла Глінскага крымскіх татар пад Клецкам + дата пачатку Лівонскай вайны = ? (дата і падзея).

3. Дата мяцяжу Міхаіла Глінскага + (дата Першага падзелу Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй − дата пачатку жыцця М. Сматрыцкага) = ? (дата і падзея).

4. (Дата аграрнай рэформы Жыгімонта II Аўгуста + дата пачатку дзейнасці ў Рэчы Паспалітай Адукацыйнай камісіі) − (дата выдання С. Будным у Нясвіжскай друкарні «Катэхізіса» + дата разгрому рускімі войскамі шведскага корпуса генерала Левянгаўпта каля вёскі Лясная) + дата бою паміж шведскімі і рускімі войскамі каля мястэчка Галоўчын = ? (дата і падзея).

5. Дата заканчэння казацка-сялянскай вайны ў Беларусі − дата атрымання горадам Менскам Магдэбургскага права + дата Люблінскай уніі = ? (дата і падзея).

6. Дата прыняцця соймам Рэчы Паспалітай Канстытуцыі − дата выдання Ф. Скарынай кнігі «Псалтыр» у Празе + дата атрымання горадам Полацкам Магдэбургскага права = ? (дата і падзея).

7. (Дата ўтварэння Таргавіцкай канфедэрацыі + дата паўстання Тадэвуша Касцюшкі) : 2 = ? (дата і падзея).

8. Дата ўтварэння Слуцкай канфедэрацыі праваслаўнай шляхты + дата Трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай − [(дата заканчэння − дата пачатку трэцяй вайны Вялікага Княства Маскоўскага з Вялікім Княствам Літоўскім) + (дата зацвярджэння II Статута Вялікага Княства Літоўскага − дата выдання Берасцейскай (Радзівілаўскай) Бібліі)] = ? (дата і падзея).

Вызначце прынцып утварэння храналагічнага раду, дайце яму загаловак.

1. 1529 г., 1566 г., 1588 г. – ...
2. 14 ліпеня 1500 г., 8 верасня 1514 г. – ...
3. 1502 г., 1503 г., 6 жніўня 1506 г. – ...
4. 1581 г., 1588 г., 1673 г., 1696 г. – ...
5. 1447 г., 1468 г., 1529 г., 1557 г., 1566 г., 1588 г. – ...
6. 1390 г., 1441 г., 1494 г., 1496 г., 1498 г., 1499 г. – ...
7. 1490 г., 1506 г., 1512 г., 6 жніўня 1517 г., 1522 г., 1525 г., 1551 г. – ...

Абазначце лічбамі, што з ніжэйпералічанага:

I. Адбывалася ў перыяд княжання ВКЛ:

1 – Аляксандра (1461–1506);
2 – Жыгімонта I Старога (1467–1548);
3 – Жыгімонта II Аўгуста (1520–1572);
4 – Жыгімонта III Вазы (1566–1632).

а) Будаўніцтва замка ў мястэчку Мір – ..., прынята «Устава на валокі» – ..., мяцеж Міхаіла Глінскага – ..., зацвярджэнне II Статута ВКЛ – ..., бітва пад Оршаю – ... .

б) Лівонская вайна – ..., выданне Сымонам Будным у Нясвіжскай друкарні «Катэхізіса» – ..., пачатак выдавецкай дзейнасці Ф. Скарыны ў Празе – ... .

в) Мяцеж Міхаіла Глінскага – ..., зацвярджэнне I Статута ВКЛ – ..., жыццё і дзейнасць Сымона Буднага – ..., выданне Берасцейскай (Радзівілаўскай) Бібліі – ... .

г) Бітва пад Оршаю – ..., зацвярджэнне I Статута ВКЛ – ..., правядзенне аграрнай рэформы («Устава на валокі») – ..., жыццё і дзейнасць Льва Сапегі – ..., Лівонская вайна – ... .

д) Зацвярджэнне II Статута ВКЛ – ..., жыццё і дзейнасць Васіля Цяпінскага – ..., мяцеж Міхаіла Глінскага – ..., бітва пад Оршаю – ..., жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны –... .

II. Адбывалася ў перыяд праўлення ў Рэчы Паспалітай:

1 – Баторыя Стэфана (1533–1586);
2 – Жыгімонта III Вазы (1566–1632);
3 – Аўгуста II (1670–1733);
4 – Ляшчынскага Станіслава (1677–1766);
5 – Панятоўскага Станіслава Аўгуста (1732–1798).

а) Дзейнасць у Слуцку мануфактуры шаўковых паясоў – ..., жыццё і дзейнасць Сімяона Полацкага – ..., паўстанне на Каменшчыне – ..., прыняцце соймам Рэчы Паспалітай Канстытуцыі – ..., Трэці падзел Рэчы Паспалітай, далучэнне заходняй часткі Беларусі да Расійскай імперыі – ... .

б) Паўночная вайна Расіі са Швецыяй – ..., утварэнне Таргавіцкай канфедэрацыі – ..., паўстанне Тадэвуша Касцюшкі – ..., Другі падзел Рэчы Паспалітай, далучэнне цэнтральнай часткі Беларусі да Расійскай імперыі – ..., паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы ў Крычаўскім старостве – ... .

в) Разгром рускімі войскамі шведскага корпуса генерала Левянгаўпта каля вёскі Лясная – ..., Берасцейская царкоўная ўнія – ..., казацка-сялянская вайна ў Беларусі – ..., Другі падзел Рэчы Паспалітай, далучэнне цэнтральнай часткі Беларусі да Расійскай імперыі – ..., зацвярджэнне III Статута ВКЛ – ... .

III. Адносіцца да дасягненняў:

1 – культуры XVI ст.;
2 – культуры XVII ст.;
3 – культуры XVIII ст.

Дзейнасць прыгоннага тэатра Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку – ..., стварэнне Адукацыйнай камісіі – ..., адкрыццё Акадэміі ў Вільні – ..., выданне «Катэхізіса» Сымона Буднага – ..., «Буквар» Спірыдона Собаля – ..., «Газета Гродзенска» – ..., «Буквар языка славенскага» Сімяона Полацкага – ..., граматыка Мялеція Сматрыцкага – ..., Нясвіжскі замак – ..., «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага – ..., выданне Берасцейскай (Радзівілаўскай) Бібліі – ... .

ЛІТАРАТУРА

1. 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. – Мінск, 2008.

2. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1993.

3. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск, 1985.

4. Асветнікі зямлі беларускай. X – пачатак XX ст.: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001.

5. Атлас гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён. – Мінск, 2006.

6. Беларусазнаўства / пад рэд. П. Брыгадзіна. – Мінск, 1998.

7. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск, 2000.

8. Беларускія летапісы і хронікі / уклад. У.Арлова. – Мінск, 1997.

9. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. – Минск, 1990. – Т.1.

10. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. документов и материалов: в 4 кн. – Минск, 1959–1979.

11. *Борзова, Л.П.* Игры на уроке истории / Л.П. Борзова. – М.: Владос, 2001.

12. *Бохан, Ю.М.* Вайсковая справа ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст. / Ю.М. Бохан. – Мінск, 2008.

13. *Верашчагіна, А.* Гісторыя канфесій у Беларусі / А. Верашчагіна, А. Гурко. – Мінск, 2000.

14. *Вішнеўскі, А.Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск, 2003.

15. *Вішнеўскі, А.Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск, 2003.

16. *Вяземский, Е.Е.* Методические рекомендации учителя истории. Основы профессионального мастерства / Е. Е. Вяземский, О.Ю. Стрелова. – М., 1998; 2001.

17. *Вяземский, Е.Е.* Изучение истории на профильном уровне в современной школе: сб. учеб.-метод. материалов / Е. Е. Вяземский. – М., 2006.

18. Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск, 2005–2006.

19. Вялікі гістарычны атлас Беларусі / гал. рэд. В. Л. Насевіч. – Мінск, 2008. – Т. 1.

20. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы / М. Біч, Р. Гарэцкі, У. Конан [і інш.]; рэдкал: У. Арлоў [і інш.]. – Мінск, 2006.

21. Гісторыя Беларусі (канец XVIII в. – 2002 г.): хрэстаматыя: 11 клас / пад рэд. Я.К. Новіка. – Мінск, 2003.

22. Гісторыя Беларусі. З 1795 г. да вясны 1917 г.: вучэб. дапам. / рэд. кал.: І. П. Крэнь, І. І. Коўкель. – Мінск, 2001.

23. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Курс лекцый / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі [і інш.]. – Мінск, 1998, 2002.

24. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск, 2007.

25. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2000–2005.

26. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Мінск, 1971–1975.

27. *Голенченко, Г.Я.* Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI – середине XVII в. / Г.Я. Голенченко. – Минск, 1989.

28. *Дзмітрачкоў, П.Ф.* Беларусь у сярэдневяковы перыяд (V – першая палова XIII ст.) / П.Ф. Дзмітрачкоў. – Магілёў, 2007.

29. *Довнар-Запольский, М.В.* История Белоруссии / М.В. Довнар-Запольский. – Минск, 2003.

30. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Минск, 1994.

31. Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў / склад.: Н.Ф. Высоцкая, Т.А. Карповіч. – Мінск, 1980.

32. *Загорульский, Э.М.* Древняя история Беларуси: очерки этнической истории и материальной культуры (до IX в.) / Э.М. Загорульский. – Минск, 1977.

33. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск, 2000.

34. *Ігнатоўскі, У.М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У.М. Ігнатоўскі. – Мінск, 1991.

35. Ілюстраваная гісторыя. Краіна Беларусь. – 2003.

36. Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі / аўт.-склад. І.П. Хаўратовіч. – Мінск, 1995.

37. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.). / навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск, 1998.

38. Кніга для чытання па гісторыі Беларусі (канец XVIII – 1917 г.): 8 кл. / аўт.-склад. Н.Я. Новік. – Мінск, 2007.

39. *Ковкель, И.И.* История Беларуси с древнейших времён до нашего времени / И.И. Ковкель, Э.С. Ярмусик. – Минск, 2003.

40. *Лазука, Б.А.* Гісторыя мастацтваў / Б.А. Лазука. – Мінск, 2003.

41. *Ластоўскі, В.Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі / В.Ю. Ластоўскі. – Мінск, 1992.

42. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995.

43. *Мяснікоў, А.Ф.* Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / А.Ф. Мяснікоў. – Мінск, 2008.

44. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / пад рэд. М.П. Касцюка. – Мінск, 1994. – Ч.1.

45. *Новік, Я.К.* Гісторыя Беларусі: ад старажытных часоў па 2008 г.: вучэб. дапам. / Я.К. Новік, Л. Качалалаў, Н.Я. Новік; пад рэд. Я.К. Новіка. – Мінск: Вышэйшая школа, 2009.

46. *Падокшын, С.А.* Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын. – Мінск, 2003.

47. *Падокшын, С.А.* Унія. Дзяржаўнасць. Культура: філасофска-гістарычны аналіз / С.А. Падокшын. – Мінск, 1998.

48. *Парашкоў, С.А.* Гісторыя культуры Беларусі / С.А. Парашкоў. – Мінск, 2003.

49. *Пичета, В.И.* История белорусского народа / В.И. Пичета. – Минск, 2003.

50. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1991.

51. Славутыя імёны Бацькаўшчыны: вып. 1–2. – Мінск, 2000, 2003.

52. *Студеникин, М.Т.* Методика преподавания истории в школе / М.Т. Студеникин. – М.: Владос, 2004.

53. *Ткачоў, М.А.* Замкі і людзі / М.А. Ткачоў. – Мінск, 1991.

54. *Трещенок, Я.И.* История Беларуси: учеб. пособие в 2 ч. – Могилёв, 2004. – Ч. 1: Досоветский период.

55. Уния в документах: сб. документов и материалов / сост.: В.А. Теплова, З.И. Зуева. – Минск, 1997.

56. Хрестоматия по истории Беларуси. С древнейших времён до 1917 г. / сост. Я.И. Трещенок; под науч. ред. К. М. Бондаренко. – Минск, 2008.

57. *Цітоў, А.К.* Гарадская геральдыка Беларусі / А. К. Цітоў. – Мінск, 1989.

58. *Чигринов, П.Г.* Очерки истории Беларуси: учеб. пособие / П.Г. Чигринов. – Минск, 2006.

59. *Шалькевіч, В.Ф.* Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мінск, 2002.

60. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэб. дапам. / пад агул. рэд. В.І. Галубовіча. – Мінск, 2005.

61. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1993–2003.

62. Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1989.

63. *Юхо, Я.А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. / Я.А. Юхо. – Мінск, 2000, 2003.

64. *Ярмусик, Э.С.* Католический костёл в Беларуси в 1945–1990 годах / Э.С. Ярмусик. – Гродно, 2006.

Змест

Вучэбная праграма

Тлумачальная запіска 3

Змест вучэбнага матэрыялу 4

Чаканыя вынікі 8

Метадычныя рэкамендацыі

Уводзіны 9

Умоўнае тэматычнае планаванне факультатыўных заняткаў «Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай» 18

Метадычныя парады да правядзення факультатыўных заняткаў «Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай» 28

Раздзел I. Беларусь у другой палове XVI – першай палове XVII ст. 28

Раздзел II. Беларусь у другой палове XVII – першай палове XVIII ст. 44

Раздзел III. Беларусь у другой палове XVIII ст. 58

Заключэнне 92

Літаратура 95

Вучэбнае выданне

Гісторыя Беларусі. Факультатыўныя заняткі

Кудраўцава Святлана Анатольеўна

БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

8 клас

Дапаможнік для настаўнікаў
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай і рускай мовамі навучання

Адказны за выпуск	*І. В. Зайцаў*
Рэдактар	*В. В. Какшынская*
Камп'ютарны набор	*Т. Г. Сергіенка*
Камп'ютарная вёрстка	*Т. Г. Сергіенка*
Карэктар	*Л. М. Сцяпанава*

Падпісана ў друк 12.08.2010. Фармат $60\times90^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 6,25. Ул.-выд. арк. 4,42.
Тыраж 2200 экз. Заказ 765.

Таварыства з абмежаванай адказнасцю "АСАР".
ЛИ № 02330/0549450 ад 08.04.2009.
Вул. Кіжаватава, 62, оф. 273а, 220088, г. Мінск.

Таварыства з абмежаванай адказнасцю
«Друкарня Макарава і К»
ЛП № 02330/0150429 ад 19.11.2008.
Вул. Скарыны, д. 40, г. Мінск.

ISBN 978-985-671178-0